# ВОСЕНЬСКІЯ СВЯТЫ



Беларускі навукова-метадычны цэнтр гульні і цацкі

# Восеньскія святы

*Дапаможнік*
*для настаўнікаў і выхавальнікаў*

Рэкамендавана Навукова-метадычным цэнтрам
вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі і навукі
Рэспублікі Беларусь



МІНСК «БЕЛАРУСЬ» 1995

ББК 63.5я7
В 76
УДК 394.2(072)

Укладальнік
Алесь ЛОЗКА

Мастак
Аляксандра РУДАЯ

В $\frac{3940200000 - 028}{М 301 (03) - 95}$ 18 — 94

ISBN 985-01-0103-2

© Укладанне. А. Ю. Лозка, 1995
© Афармленне. А. У. Рудая, 1995



## Да зачаткаў беларускай народнай педагогікі

З самых старажытных часоў навучанне і выхаванне чалавека адбывалася ў натуральных умовах. Праз узаемаадносіны з прыродай чалавек злучаўся ў адно цэлае з Сусветам, пазнаваў шляхі чыннага быцця і існавання ў ім. Важнае значэнне ў непарыўным і комплексным навучанні належала старажытным язычніцкім культурам і хрысціянскай маралі.

З цягам часу чалавецтва сабрала столькі каштоўных эмпірычных ведаў і вопыту, што стварыўся спецыяльны інстытут захавання і перадачы набытага. Гэты інстытут рускі педагог і пісьменнік Канстанцін Ушынскі назваў «народнай педагогікай», якая з'яўляецца вынікам творчай калектыўнай працы. Яна выяўляе самыя чалавечныя і дэмакратычныя ідэалы.

Беларуская народная педагогіка вучыць паважаць сваіх продкаў, ашчадна адносіцца да матулі-зямлі, бацькаўшчыны, выхоўвае сціпласць, кемлівасць, гуманнасць, развівае фізічныя здольнасці. Але, бадай, стрыжнявой задачай з'яўляецца працоўнае выхаванне, перадача вытворчага вопыту, родавых і сямейных традыцый у розных відах старажытных рамёстваў і заняткаў.

Асноўнымі крыніцамі народнай педагогікі з'яўляюцца калыханкі і забаўлянкі, лічылкі і дражнілкі, песні і гульні, казкі і прыказкі, а таксама цацкі, рэчы побыту і народных рамёстваў, святы і прысвяткі, традыцыі сямейнай «школы» і інш. Важнай акалічнасцю ў народным выхаванні з'яўляўся каляндар, які якраз і канцэнтраваў у пэўнай сістэме ўсе традыцыі і веды.

Элементы беларускага земляробчага календара пачалі збірацца даследчыкамі этнаграфіі і фальклору з сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзя. Захаваліся карысныя матэрыялы з календароў асобных рэгіёнаў у работах Івана Бермана, Дзмітрыя Булгакоўскага, Уладзіміра Дабравольскага, Юльяна Крачкоўскага, Казіміра Машынскага, Мікалая Нікіфароўскага, Еўдакіма Раманава, Сяргея Сахарава, Аляксандра Сержпутоўскага, Пятра Шэйна і іншых. Аднак дагэтуль не існавала поўнага збору беларускага народнага календара, які ўключыў бы элементы ўсіх назапашаных рэгіянальных матэрыялаў сучаснага і мінулага. У значнай ступені вялікай перашкодай на шляху належнага збору і вывучэння календара паслужыла ленінская палітыка ваяўнічага атэізму. Паслядоўнікі Леніна яшчэ больш жорстка праводзілі лінію партыі ў жыццё. Сталінскае асяроддзе загубіла ў канцэнтрацыйных лагерах тысячы служыцеляў царквы, партыйных, савецкіх і навуковых работнікаў, звязаных з нацыянальнай культурай. Доўгі час на традыцыйных земляробчых святах, наогул на фальклоры, стаяла кляймо «рэлігійнага», «царкоўнага», «нацдэмаўскага», «антысавецкага». Толькі зусім нядаўна мы

пачалі пісаць назвы народных святаў і прысвяткаў з вялікай літары, разумеючы пад гэтым факт іх рэабілітацыі.

Вялікую шкоду развіццю народнай педагогікі прыносілі розныя гвалтоўныя меры, якіх нямала было ў гісторыі беларускага народа. Гэта, у першую чаргу, забарона выкарыстання ці абмежаванне ўжывання роднай мовы ў афіцыйнай школе і грамадскіх установах. Не выключэннем стаў для Беларусі і перыяд сацыялістычнага будаўніцтва. У часы сталіншчыны вынішчалася ўсё нацыянальнае і адметнае, а пры Брэжневе панавала тэндэнцыя зліцця народнасцей і моў. Уплыў народнай педагогікі на выхаваўчы працэс быў зведзены да мінімуму, а таму ёй пагражала поўнае выміранне разам з беларускай мовай. Манапольная палітыка ў адносінах да форм уласнасці на зямлю прывяла да занядбання і самой вёскі, захавальніцы мудрасці і таленту беларусаў, адвучанай за гады савецкай улады ад спрадвечнай любові да земляробчай працы.

Адраджэнне беларускай нацыянальнай школы павінна грунтавацца на яе традыцыйным вопыце з улікам сучаснага развіцця. Як сведчыць гісторыя, на Беларусі існавалі дыферэнцыраваныя навучальныя ўстановы — гімназіі і калегіумы, якія рыхтавалі навучэнцаў для паступлення ў вышэйшыя ўстановы. У той жа час, асабліва ў сялянскім асяроддзі, дзейсна функцыяніравала народная педагогіка, навучанне і выхаванне членамі сям'і і хатнімі настаўнікамі. Аб гэтым пісаў і Якуб Колас у сваёй паэме «Новая зямля». Развіццё беларускай нацыянальнай школы сёння бачыцца ў разумным спалучэнні трох пачаткаў: класічнага накірунку, народнай педагогікі і выкарыстання дасягненняў сучаснай навуковай педагагічнай думкі.

Матэрыялы, якія змяшчаюцца ў дапаможніку, рэкамендуем выкарыстоўваць наступным чынам. Навучальны дзень школьнікаў і дзяцей дзіцячага садка варта пачынаць з кароткага паведамлення аб адпаведным свяце ці прысвятку, іх змесце і значэнні ў побыце беларусаў. Усё гэта ёсць у раздзеле «Восеньскі народны каляндар». Спатрэбіцца і наступны раздзел «Метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі», і дадатковы матэрыял, які можна выкарыстоўваць пры больш падрабязным вывучэнні восеньскіх святаў і прысвяткаў. Тут — асноўнае з восеньскага календара. Пачынаецца з дня Сымона, на які праводзіўся абрад «Жаніцьба коміна» (ці пасвета). Нашы дзяды ўшаноўвалі культ продкаў-духаў, агню-багача, хатніка, які, паводле ўяўленняў язычнікаў, жыў у сушні, на печы і пад ёй, у коміне. Сімвалічна тое, што абрад праводзіўся ў першы дзень вучобы дзяцей у школе. Таксама прадстаўлена свята ўраджаю, якое вядома ў многіх раёнах пад назвай Багач, святы кавалёў, млынароў. Ну і, безумоўна, Дзяды як дзень памінання продкаў і іншыя. У гэтым раздзеле можна знайсці ўсё неабходнае для складання самастойнага сцэнарыя, свят ці для напісання канспекта заняткаў.

Настаўнікі і выхавальнікі павінны творча адбіраць матэрыял для сваёй работы згодна з узростам дзяцей, іх здольнасцямі, а таксама выкарыстоўваць рэгіянальны фальклор, што бытуе ці бытаваў у той мясцовасці, для жыхароў якой рыхтуецца свята ці ўрок. У дапаможніку змешчаны песні з нотнымі прыкладамі, апісанні гульняў, танцаў, абрадаў, святаў, неабходных для практычнай работы.

Алесь ЛОЗКА,
*кандыдат філалагічных навук*



РЮЕНЪ ЛИСТОПАДЪ ГРОУДЕНЪ

## ВОСЕНЬСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

У восеньскі народны каляндар уключаны як паганскія (язычніцкія), так і фальклярызаваныя хрысціянскія святы і прысвяткі, у час якіх традыцыйна выконваліся народныя песні, праводзіліся абрады, гульні, з якімі звязаны прыкметы, павер'і і прыказкі, а таксама — назвы тыдняў і большых прамежкаў часу, што традыцыйна склаліся ў побыце беларусаў.

Першая лічба ў календары азначае дату па новаму стылю, а другая — па старому (5/23 — 5 верасня па н.ст., 23 жніўня па с. ст.; 14/1 — 14 верасня па н. ст., 1 верасня па с. ст. і г. д.). За старым (юліянскім) календаром, які існаваў у нас да 1 лютага 1918 года, замацаваны святы і прысвяткі, якія бытуюць сярод праваслаўных беларусаў (выдзелена паўтлустым шрыфтам). Курсівам пазначаны назвы каляндарных дзён, якія бытуюць ці бытавалі сярод беларусаў-католікаў і замацаваны ў новым (грыгарыянскім) календары.

### *ВЕРАСЕНЬ (вресень, руин)*

**5/23. Лупа** («На Лупа будзе жыта купа», «У дзень памяці святога Лупы нельга сеяць жыта, таму што на ўсёй ніве будуць «лупы» — жыта ўзыдзе і вырасце плешынамі»).

**7/25. Баўтрамей (Варфаламей)** — час сяўбы («Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей»). У гэты час з'яўляецца шмат аваднёў і мух, таму і ўзнікла прыказка: «Святы Баўтрамей душыць аваднёў і труціць мух». А наступная прыказка гаворыць аб адлёце птушак і надыходзе вясельнай пары: «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей».

**8/26.** *Другая Прачыстая (Меншая Прачыстая. Малая Прачыстая. Другі святок).* У Заходняй Беларусі існавала прыказка: «Прыйшла Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

**10/28. Мацей (Майсей, Маісей Мурын)** — абаронца ад запойнага п'янства. Вельмі паважалі гэты прысвятак жанчыны, у каго мужы пілі гарэлку («Майсей Мурын — сцаліцель ад п'янства», «Пасля Мацея мужык на полі не пацее»).

**11/29. Калінавік (Іван Калінавік, Ян Галавасек, Іван Крываўнік, Іван Посны, Галаварэз, Сцянцель).** Назва замацавалася ад царкоўнага найменя дня ўсячэння галавы Івана Прадцечы, Івана Хрысціцеля. У народзе ўсталяваліся за ім бытавыя прыкметы і павер'і. Лічылася, што ў гэты дзень нельга рэзаць, сячы і нават есці круглае (капусту, бульбу і г. д.). На Тураўшчыне, закончыўшы некаторыя палявыя работы, адсякалі галаву старому пеўню і рыхтавалі вячэру. Певень лічыўся старажытным ахвяраваннем розным культам. У Рэчыцкім павеце не мылі галаву, каб не захварэць на каўтун.

Пчаляры «падглядалі» мёд. Вядома восеньская песня:

Чаго, пчолачка, чаго ярая,
К вулейку прылятаеш?
Ці ты, пчолачка, ці ты, ярая,
Ліху зіму чуеш?

Калі пасеяць у гэты дзень жыта, лічылі на Магілёўшчыне, то будзе ўмалотны ўраджай. На Усходнім Палессі стараліся пасеяць жыта ў адзін дзень, вечарам дзяўчаты выходзілі віць вянкі, спявалі песні. На Калінавіка збіралі ягады каліны, журавіны, якія выкарыстоўвалі потым ад галаўнога болю.

Наставала пара сельскагаспадарчых работ, і дождж быў ужо не патрэбен. У народзе гаварылі: «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу».

З Калінавіка да Цудаў, Багача ці Пакроваў (у розных рэгіёнах па-рознаму) гэтая пара называлася **Бабіна лета** — пачатак жаночых сельскагаспадарчых работ.

Восенню спявалі ярынныя, ільняныя, пастухоўскія і іншыя песні. У большасці з іх — тэма замужжа. Гэта выклікана тым, што пасля Івана Пакроўнага, Пакровы, да Піліпаўкі пачыналіся сялянскія вяселлі.

**13/31.** Пачатак севу ячменю на Смаленшчыне; шосты ці сёмы тыдзень ад Іллі. Сярод беларусаў, якія там жывуць, існавала шмат прыкмет, калі лепш сеяць ячмень: «Сей ячмень, як загудзець сляпень», «Сей ячмень, як каліна ў кругу», «Калі на елцы шышкі стануць чырвоныя, а на сасне зялёныя — сей ячмень», «Ячмень сей на сёмым тыдні ад Іллі, у той дзень, калі на Усяедным тыдні была вея», «Ячмень сей на шостым тыдні ад святога Іллі».

**14/1. Сымон (Сямён, Стоўб)**. У народзе гаварылі: «У Сямёнаў дзень да абеда пашы, а пасля абеду пахара з поля гані», «Святы Сымон — а й сявец дамоў». На Віцебшчыне існавалі розныя прыкметы наконт ураджаю, прымеркаваныя да Сымона: «Калі першы засевак жыта рабіць напярэдадні Івана (18 жніўня), то жыта ўродзіцца з буйным коласам, калі ж напярэдадні Сямёна, Стаўба (1 верасня), то яно дасць добрую салому, але не будзе каласістым» (1897).

Пра зменлівы характар гэтага прысвятка сведчыць прыказка: «Сымон да варот, на дварэ сем пагод: сее, вее, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце» (1937). Першы дзень восені лічылі днём адлёту птушак: «На Сымона ластаўкі хаваюцца ў ваду», «На Сымона птушкі лятуць у вырай» (1934).

На Смаленшчыне праводзілі «жатву» — абрад выгнання мух у час дажынак. Адзявалі сноп, які называлі лялькай Салохай, упрыгожвалі, ставілі на стол, затым — у кут. Гэты абрад апісвае Уладзімір Дабравольскі так: «Адклаўшы сярпы ўбок, жнеі бяруць чапялу або скаварадзень, садзяцца на яе верхам і скачуць па хаце, гаворачы: «Чарнушнікі, вон, а бялушкі ў хату!» Альховымі галінкамі пачыналі выганяць з хаты мух са словамі: «Святы Сямён, гані мух вон!» Учынкі жней напаміналі, што з поля яны ўжо пайшлі, чорныя мухі хутка знікнуць, замест іх з'явяцца «бялушкі» (снег).

У XVIII — пачатку XIX стагоддзя праводзілі на дзень Сямёна абрад «Жаніцьба коміна» (пасвета, лучніка). У ім праяўляецца культ агню-багача, хатніх духаў-продкаў. Вядома болей дзесятка запісаў гэтага абраду, зробленых у асноўным на Палессі. Абрад праводзіўся тады, калі скарачаўся светлавы дзень, пачынала рана цямнець і неабходна было пераходзіць працаваць у хату «пры лучыне». На Сямёна камін упрыгожвалі ручнікамі, кветкамі, стужкамі. «Частавалі» агонь на пасвеце гарэлкаю, кідалі кавалкі сала, зерне, арэхі. Жадалі сямейнага дабрабыту, спорнай працы.

*Узвіжанне* — дзень «закрывання» зямлі на зіму ў католікаў: «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы», «Узвіжанне з поля збірае», «На Узвіжання пару гадзюкі й вужакі хаваюцца ў нару» (1934).

**19/6. Цуды (Міхайла).** Прысвятак асацыіруецца з «цудам» і лічыцца днём «цудаў», якія могуць прынесці бяду. Існуе шмат паданняў пра незвычайныя здарэнні, якія адбываюцца з людзьмі на Міхайла. На Піншчыне гавораць: «Не так бойся Прачыстай, як Цуда яе», а на Лельчыччыне: «Прачыста гаворыць: «Мяне не святкуй, а святкуй маё Цуда». Святар Іван Берман з Ашмянскага павета сведчыў, нібы на Міхайла бывае такі моцны вецер, што «верне азероды з бобам і гарохам» (1874). У Свіслацкім раёне заканчваюць палявыя работы і гавораць: «Міхал з поля спіхаў».

**21/8. Багач (Багатнік, Багатуха, Гаспожка Багатая, Малая Прачыста, Прачыста, Другая Прачыста, Другая Багародзіца, Другая Спажа, Зельная)** — старажытнае свята ў гонар заканчэння ўборкі зерневых. Адам Багдановіч лічыў, што Багач — водгук язычніцкага свята земляробчага культу Дажбога, «бога сонца, бога дастатку і багацця» (1895). Святкаваўся і ў іншыя дні, якія стаяць блізка да асенняга раўнадзенства. У Рэчыцкім Палессі лічыўся першым днём восені. Цяпер Багач прымеркаваны да Раства Багародзіцы.

У Віленскай губерні з новага ўраджаю пяклі вялікі каравай, таму і называлі дзень Гаспожкай Багатай (1874).

Да свята стараліся закончыць касавіцу, бо гаварылі: «Прачыста — сывба чыста, а косьба нычыста» (Драгічынскі р-н). Лічылася, што лепш сеяць паміж Першай і Другой Прачыстай. У валачобнай песні з Дзісненскага павета гаворыцца:

Прачыста Большая
Жыта свенціць,
Засяваець,
А Меншая
Памагаець.
А Узвіжанне —
З поля дзвігні (1895).

Перад Прачыстай буслы збіраюцца ў вырай. «Калі паляціць бацян да Другой Багародзіцы, то ляжа ранняя зіма»,— лічаць у Шумілінскім раёне.

Восеньскае свята добра прадстаўлена прыказкамі: «У стагнача хопіць хлеба да Багача», «Багач заткнуў за страху рагач» (магчыма, саху або матычку), «На Барыса за рагач бярыся, а прыйдзе Багач — кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку», «Прыйшоў Багач — рыхтуй рагач, прыйшла Пакрова — рыкнула карова», «Да Багача баба рабача, па Багачы — хоць за плот валачы».

**Засідкі** — пачатак хатніх жаночых работ, прадзенне («Засідкі — бабы ўзяліся за верацяно»).

**22** або **23.** Дзень астранамічнага асенняга раўнадзенства.

**24/11.** Тадора. «На Тадору ўсякае лета канчаецца».

**27/14. Здзвіжанне (Уздзвіжанне, Звіжанне)** — свята «закрывання» зямлі на зіму. Лічылася, што сонца і прырода «грае, здзвігаецца, мігае і дрыжыць» усімі колерамі. На Тураўшчыне гаварылі: «До й Івана сяўба кохана, а послі Здзвіжэнья трэ добро рукою дзвігаць!» У Шумілінскім раёне гавораць, што ў гэты час усё ў хату «ўздзвігаецца, каб мароз не пабіў». Не хадзілі ў лес, бо нібы збіраліся ў клубкі гадзюкі і вужы, каб пайсці ў норы на зіму. Увесь тыдзень («свістун») не сеялі, каб не было пустога калосся.

У валачобных песнях: «Святая Прачыста папары мяшаець, Святое Узвіжанне з поля збіраець» (Віцебская губ.), «бульбу капаець» (Лепельскі р-н), «сцеліць лянок» (Дзісенскі п.).

**29/16.** *Міхал.* «На Міхала ясная ноч — будзе трывалая зіма. Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то ня май на пагоду надзеі».

## *КАСТРЫЧНІК (паздзернік, листопадъ)*

**4/21.** *Пранцішак (Францішак).* «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**7/24.** Пачатак **Бабіна лета** на Мядзельшчыне (да 14 кастрычніка). Гэты тыдзень прысвячаўся бабулям, якія прымалі роды.

**8/25. Сяргей**. «З Сяргея пачынаецца зіма». Але фалькларысты таксама лічаць, што гэтая прыказка магла адносіцца да другога Сяргея (20 кастрычніка).

**Жалезны тыдзень**. «На Сяргея пачынаецца зіма і Жалезны тыдзень. У гэты дзень жалезныя рэчы чысцяць, змазваюць — не будуць цэлы год іржавець і ламацца».

**9/26. Іван Шаптун (Іван Пакроўны, Багаслоў, Іван Журавіннік, Іван Кураед).** Захавалася прымаўка: Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а аб Пакрова дзеўка гатова. Называлі Шаптуном таму, што ў часы прыгону, як тлумачыць Еўдакім Раманаў, свахі сакрэтна шапталіся з жаніхамі пра нявест, каб 1 кастрычніка (па с. ст.) зрабіць вяселле. Асабліва гэта было распаўсюджана ў Віцебскай губерні.

Па гэтаму прысвятку арыентаваліся на заканчэнне сяўбы, іншых палявых работ і пачыналі вяселлі. На Століншчыне на гэты конт гавораць: «Пачыналі сеяць азімы пэрэд Прэчыстой і казалі, даўжно кончыць до Івана Богослова, бо хто не досіе до Івана Богослова, той не варт доброго слова», а ў Драгічынскім раёне: «Богослаў сваты розослаў, пачынають высілля робыты». Спявалі песні:

Ах, восень, восень!
Сватоў па восем,
А ка мне ніводнага!..
Ай, восень, восень, макрота,
Дзецюкам жаніцца ахвота...

У кастрычніку пры выкананні розных гаспадарчых работ, талок спявалі іншыя песні, не зусім замацаваныя за восеньскай парой.

У Шумілінскім раёне гэты дзень называюць Іванам Кураедам, бо папы на яго елі курэй. Куранят прыносілі ім сяляне.

**10/27. Саўкі (Савасцей).** На Савасцея пчаляры хавалі вуллі ў імшанніке.

**11/28. Пакроўны бацька (Пакроўцы)** — прысвятак за тры дні перад Пакровамі. Расказваючы пра восеньскія Дзяды ў Віленскім павеце, якія праводзіліся прыблізна каля 1 кастрычніка, Юзаф Крачкоўскі заўважае: «Сяляне адной вёскі кожны год робяць памінкі ў адзін і той жа тыдзень, а сяляне другой вёскі — у другі. Адны з іх звычайна ўдзельнічаюць у святых іншых» (1874).

**14/1. Пакрова (Пакроў, Пакравы, Трэцяя Прачыстая)** — народнае свята глыбокай восені, пасля якога пачынаецца зіма.

У XII ст. царква прыстасавала старажытнае земляробчае свята да свята цудадзейнага выратавання г. Канстанцінопаля ад сарацынаў.

Адбываюцца змены ў прыродзе «Прыйшла Пакрова — усохла дуброва», «Пакрова — зіма гатова». Усім вядома, што Пакрова пакрывае зямлю чымнебудзь: лістам, а то і снегам, ваду — лёдам: «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку вяночкам».

Сяляне заканчвалі ўбіраць бульбу, падвязвалі саламяным перавяслам садовыя дрэвы. Аб гэтым свяце існуе шмат прымавак: «Прыйшла Пакрова, пытае, ці ты да зімы гатова», «Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ дзве нядзелі», «На Пакроў мароз — сей пад кустом авёс» і інш.

Па надвор'і ў свята гадалі пра будучае («Як на Пакрова дождж ідзе, то бортнік скача, а пахар плача», «Як на Пакроў маладзік стане — лёгка будзе, як «у старом» — сільна зіма»). Становіцца менш корму жывёле на лугах («Пакровы — зарыкалі каровы», «На Пакрова дай сена карове»).

Усе чакалі Пакроў, бо тады было менш работ. «Як прыйдзе Пакрова, то жыва-здарова, як прыйшлі жніва, то ляжу нежыва». Пачынаецца пара восеньскіх вяселляў. «Праходзіць Пакрова — раве дзеўка бы карова», «Пакрова — дзеўка гатова», «Пакрова прыйшла — дзеўка замуж не пайшла».

Добра ахарактарызавана свята ў валачобнай песні:

Святы Пакроў
Пытаецца
Да ў вазвышанькі,
Ці ўпахала
У полі жыта.
А я й буду
Да й хадзіці,
Аглядаці,
Ці ўрунціла
У полі жыта,
Зямлю лістом
Засыпаці,
Снегам чыстым
Пакрываці,
Ваду лёдам,
Пчолку мёдам
Надзяляці.
Старых бабак
Кіёчкамі,
Сярэдніх жонак
Сыночкамі,
А дзяўчатак
Вяночкамі
Награждаці.

*(Міёрскі р-н)*

**Дзявоцкае лета** (па 21 кастрычніка) на Мядзельшчыне, тыдзень пасля Пакровы. У адрозненне ад Бабінага лета гэты прысвячаўся дзяўчатам, якіх прынялі «ў дзеўкі», і ім варажылі.

**24/11**. *Зміцер* — прысвятак. «Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў», «Да Змітра баба хітра».

**25/12. Марцін** — свята млынароў. Млынары Ашмянскага павета святкавалі яго на млынавым каменным крузе (1874). У Барысаўскім павеце елі гусей і гаварылі: «Марцін святы — губіцель гагаты» (1898).

**28/15.** *Сымон і Юда.* «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць».

*Параскева Пятніцкая.* «Ня можна прасці, араць, вынасіць попел і рабіць шчалок для мыцця бялізны».

**29/16**. **Логін** — прысвятак. Збавіцель ад хвароб вачэй.

**30/17. Паклоны** — дзень адбівання паклонаў Андрэю Крыцкаму, святому пакутніку.

**31/18. Лука (Лукаш)** — прысвятак, па якім палешукі арыентаваліся на неспрыяльную пару для сяўбы азімых. «Хто сіе до Лукы, то нэ будэ маты хлыба, ны мукы». Дзень вяселляў: «На Лукаша — дзеўка наша».

**Юліян** — прысвятак. Ахоўнік дзяцей.

## *ЛІСТАПАД (грудзень, листопадъ)*

**1/19.** *Усе Святыя* — памінальны дзень у беларусаў-католікаў. У жалобны памятны дзень — адпаведная прырода, аб гэтым сведчаць прыказкі: «Па ўсіх Святых холад уйме ўсіх», «Усе Святыя як засваволяць — дрэвы да рэшты аголяць».

Варылі кашу, клалі на стол хлеб і столькі лыжак, колькі з гэтай хаты было пахавана. Ставілі шклянку вады.

**2/20.** *Задушны дзень* — працяг памінальных дзён у католікаў.

**Асяніны** (Змітраўка, Змітравы Дзяды, Казанскія Дзяды) — памінальны дзень перад Змітрам (пятніца).

**Змітрава (Памінальная, Радзіцельская) субота** — працяг Асянін. У Змітраву суботу хадзілі на могілкі. Заўважалі: калі ёсць снег, то ён будзе і на Вялікдзень.

За памінальным сталом гаспадар клікаў дзядоў за стол і выпраўляў душы памерлых продкаў. У гэтыя дні таксама гаварылі: «Жылі дзяды — не бачылі бяды, а ўнукі набраліся мукі».

**4/22. Казанская.** «Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца». У праваслаўным царкоўным календары — сяткаванне Казанскага абраза Божай Маці (у памяць выратавання Масквы і Расіі ад войскаў Вялікага княства Літоўскага і Польшчы ў 1612 годзе).

**8/26**. **Зміцер (Дзмітры)** — «Хітры» дзень, канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе. У Гомельскім раёне гавораць: «Проціў Дзмітрыя ў вечэрам не прадуць, не матаюць — Дзмітры хітры. А назаўтра вышываюць». Паўсюдна вядома, што да Змітра — дзеўка хітра. Дзень гэты адлюстраваны і ў прымаўках: «Зміцер зямлю выцер, на груды пабіў, каб ніхто не хадзіў», «Да Змітра пасуць, а па Змітру пільнуюць». А таксама ў народных песнях:

Святы Зміцер — ён на ўсіх хіцер:
Салады салодзіць, піва робіць,
Сыноў жэніць, дачок выдаець...
*(Дзісенскі п.)*

Святы Змітра —
Ён багаты:
Сыноў жэніць,
Дачок аддаець,
Па сто рублёў
Пасаг даець,
А сынам па канёчку...
*(Міёрскі р-н)*

На Змітра не пралі, не ткалі і ў полі не працавалі.

**Дзяды.** Дарэвалюцыйныя этнографы адзначалі, што ў Ашмянскім павеце першыя Дзяды ў чацвер, другія — у суботу, трэція — у нядзелю, чацвёртыя — у суботу перад Загавінамі. У Гомельскім павеце спраўлялі Змітраўкі, Дзяды — 26, а Бабы — 27 лістапада.

**9/27.** *Тодар* — прысвятак напамінаў, што ўраджай сабраны. «На Тадора поўна камора».

**10/28. Параскі (Параскева Пяценка, Параскеўя Пятніца, Параскімка, Параскіммя, Параскоўя, Параскі Асеннія)** — дзень забароны прадзення і ткання. Існавалі павер'і: хто будзе прасці ў гэты дзень, то з-пад печкі вылезе Пятніца і пакарае (1914); святая Пятніца ў выглядзе старой бабулі ходзіць па вёсках і сочыць, каб ніхто не праў кудзелю ў пятніцу (1888). Царква да гэтага дня прымеркавала святкаванне святой Параскевы Пятніцы — вялікапакутніцы. А раней язычнікі ўшаноўвалі Макаш, багіню зямлі і пладароддзя. На Драгічыншчыне дзяўчаты яшчэ не гублялі надзеі на замужжа, таму гаварылі: «Пяцёнка, мая мацёнка, памажы хоч ты, каб мне замуж пайты».

**11/29. Настуся (Настасей, Анастасій)** — дзень авечак. Даглядалі і стрыглі авечак. «Настуся пачынае стрыгчы авечак». Іх нябачнага апекуна прасілі: «Святы Настасей прэкрасны, саблюдзі авец нашых».

*Марцін* — свята млынароў. Мусіць, заканчвалася работа на вадзяных млынах, бо замярзалі рэкі. «З Марцінавага дня пачынаецца зіма».

**12/30. Артошка** — дзень пачатку прадзення на Смаленшчыне. «Святы Артошка, напрадзі пачатык з лукошка, а клубок з карабок, а мальчык-з-пальчык напрадзі пачатык з пальчык» (1894).

**14/1. Кузьма-Дзям'ян (Кузьма-Земян, Касьма-Даміян)** — свята шаўцоў, кавалёў; апякун земляробства і вяселля.

Існуюць паданні пра кавалёў Кузьму, Дзям'яна і Змея. У Лельчыцкім раёне гавораць: «На Кузьму-Дзям'яна прынялі першага салдата на службу». У слоўніку Івана Насовіча чытаем: «Кузьма да Дамян — два ліцвіны, прынеслі гаршочак бацвінні» (1870).

У валачобнай песні пяецца:

Святы Пакроў ў гумно звозіць,
Кузьма з Дзям'янам на васець садзіць,
На васець садзіць да Бога просіць:
— Дай, Божа, ды слаўнаму мужу
На васець пасадзіці, на таку намалаціці.

А ў свірні ўсё насыпіста,
А ў млыне ўсё наміліста,
А ў дзяжы ўсё падходзіста,
А ў печы ўсё падросціста.
*(Барысаўскі п., 1887)*

**Піліпаўскія запусты** (па 27 снежня) — апошнія дні перад Піліпаўкай. У Калінкавіцкім раёне гавораць: «У Запускі не прэдуць, на Крэшчэнне, Міхайла, Кузьму-Земяна. Рукі позаверняе, або рот набок скрывіць, або — ходзім у палажэнні — дзіця паўрэдзіць».

**Міхайлаўскія (Міхальскія, Міхайліны, Асеннія) Дзяды** — пятніца перад Міхайлам. У Столінскім раёне сцвярджаюць, што хату беляць два разы: вясною і перад Міхайлам, Асеннімі Дзядамі.

**Бабы (Міхайлаўскія Бабы).** Працяг памінальных дзён у суботу перад Міхайлам.

Існуюць і Дзяды, якія вядомы ў асобных міні-рэгіёнах, напрыклад, у в. Залатуха Калінкавіцкага раёна восенню адзначаюць Сівакоўскія Дзяды (назва па прозвішчу, распаўсюджанаму сярод жыхароў вёскі). Удзельнічаюць у іх (родавых памінках) тыя, хто мае адпаведнае прозвішча.

**21/8. Міхайла (Міхаіл, Міхайла Архайла, Міхайлаў дзень)** — апошняе свята года, як лічылася ў народзе; абаронца ад грому.

«Міхайло — усім сятком запіхайло, посьлі Міхайла ўжэ нема сеткоў до Рожэства», — гавораць на Століншчыне. У Калінкавіцкім раёне: «Міхайла мы празднуем, коб гром не біў нас. Не рубаем ні топором, ні нажом, ні красён не ткём, штоб не абідзіўся Міхаіл». На Старадарожчыне заўважаюць: «Не трэба рабіць у гэты дзень, бо Міхайла злы — крышы рве». Лічылася, што на Міхайла Архайла мядзведзі ідуць у спячку (Свіславіцкі р.). Раней пастухі выганялі кароў толькі да Міхайла, пасля — самі гаспадары. У Шумілінскім раёне на Міхайла Рахайла наглядаюць за надвор'ем і гавораць: «Калі на сцёках лёд, то будзе ў пчалавода мёд».

«Святы Міхайла з халодным ветрам»,— спяваецца ў валачобцы, а ў асенняй, якую запісаў Міхась Федароўскі:

Дзевачкі, мае сястрыцы,
Папасеце да валоў маіх.
Я пайду, чабору нарву,
А з чабору да вянок саўю,
З вамі, дзевачкі, у танок пайду.

Унукі ў гэты дзень наведвалі сваіх бабуль. Лічыцца, што да Міхайла трэба выткаць адны кросны, другія — у Піліпаўку, трэція — у Мясаед, а чацвёртыя — у пост.

**22/9. Матрона (Матруны).** З прысвяткам звязаны прыказкі і прыкметы пра наступленне зімы: «З Матроны становіцца зіма», «Калі на Матруну шэрань на дрэвах — будуць маразы, туман — да адлігі».

**Піліпаўскія (Раздзвяныя) Дзяды** — памінальны дзень перад Піліпаўкай у пятніцу і суботу (Заходняе Палессе). На Глушчыне вядома прыказка: «Піліпаўскі дзед кажа — хоць трашчу, але не пушчу».

**23/10. Аўлампій.** «Калі на Аўлампія рогі месяца паказваюць на поўдзень — будзе позняя зіма, на поўнач — суровая».

**25/12.** *Кацярыны* — прысвятак у католікаў, які напамінае пра надыход снягоў і кароткіх зімовых дзён. «Прыйшла Кацярына — прыйдзе й пяры-

на», «Кацярына забрала лета». У некаторых мясцінах лічылася: калі 12 лістапада будзе дождж або снег, то аж да Грамніц будуць адлігі.

**Іван Міласцівы**. На Палессі былі адзін да аднаго ў гэты дзень уважлівыя, добрыя.

**24/11. Хвёдар Студзянец.** «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**27/14. Юсцініян** — апякун плоднасці жанчыны і дзяцінства. Мусіць, стаў ім таму, што святы Юсцініян паказаны на абразе з дзіцём на руках.

**Піліп (Піліпей).** Пачынаюцца халады, усе апранаюцца цяплей. Таму на Тураўшчыне вядома прымаўка: «Ек залезе Піліп, то і Петро не вужэне», у Лельчыцкім раёне: «Піліп дзяцей адзявае».

**Запусты (Загавіны на Піліпаўку)** — канец Мясаеда (ад Усплення). На наступны дзень Піліпаўка. Клікалі ў госці бабу, «што пупы вяжа». Жанчыны заканчвалі апрацоўку льну і канапель, рыхтаваліся да піліпаўскіх пасядзелак. У Вілейскім павеце гаварылі: «Пуста места Запусты, пусці, Божа, куцейку» (1893). Перад Піліпаўкай заканчваліся вяселлі, таму спявалі:

Лета сходзе, зіма будзе,
Злое ўрэмя настае,
Дзяўчына маладая
Да й сваю долю кляне.
*(На Дзісне, 1869)*

Была восень, цяпер зіма,
Былі хлопцы, цяпер няма.
*(Бярозаўскі р-н)*

**28/15. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост)** — шасцітыднёвы перадкалядны пост (да 6 студзеня). Гаварылі: «У Піліпаўку дзень да палудня». Не елі скаромнага. Не рабілі вяселляў. Дзяўчаты хадзілі на папрадкі, пачыналі ткаць «другія» кросны. Лічылася, што ў Піліпаўку збіралася «воўчае вяселле», хадзілі ваўкі зграямі («Ек Піліпаўка настала, то ваўкі ідуць гайною».) Заўважалі, што калі на Піліпаўку надвор'е хмарнае або снежнае, то травень будзе мокры. «Як у Піліпаўку навісь на дзерэве, то будзе ўраджай на хлеб». Піліпаўскі пост успамінаецца ў асенняй песні:

Пасціла ўдоўка сем панядзелкаў,
Васьмую нядзелечку.
Прынясі, Божа, нежанатага
На маю пасцелечку...
*(Вілейскі р-н).*

**30/17.** *Андрэй.* Дзяўчаты вечарам перад Андрэем варажылі, сыпалі пад падушку ячмень са словамі: «Святы Андрэю, я ячмень сею, дай жа ты мне знаць, з кім я буду жаць».

---

У дужках пазначаны гады крыніц, з якіх узяты матэрыялы.

Дадзены варыянт календара не лічыцца завершаным і бездакорным, работа над ім працягваецца.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ, СЦЭНАРЫІ І ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ

## *ДЗЕНЬ СЯМЁНА*

**14 верасня (1 верасня па с. ст.) — Сямён, абрад «Жаніцьба коміна» (пасвета). Вясной на Фаміным тыдні, на Засеўкі**

Абрад «Жаніцьба коміна» спраўлялі двойчы на год: 14 верасня (або 1 верасня па с. ст.) на дзень Сямёна ў народным календары і вясной на Фаміным тыдні (тыдзень пасля Вялікадня). Памяць пра гэты абрад і сам комін захавалася на Палессі, і ў розных раёнах абрад носіць розныя назвы: «Жаніцьба коміна», «Жаніцьба пасвета», «Жаніцьба лучніка».

Першы раз увосень лучыну на лучніку або пасвеце запальвалі ў хаце, пачынаючы прасці, неабавязкова 1 верасня па с. ст., але і пазней, калі вызваляліся ад сельскагаспадарчых работ у полі і на агародзе, а ўвечары збіраліся да каго-небудзь на вячоркі. Гэты звычай можна выкарыстоўваць і як урачысты абрад 14 верасня, які сімвалізуе пачатак навучальнага года, цікавых вячорак у школе, як пачатак жыцця першакласнікаў у новай сям'і — школьнай сябрыне. Думку — «Школа — гэта наша вялікая сям'я» (або тое ж — пра дзіцячы сад) — неабходна падкрэсліваць, выконваючы абрад. І яшчэ — калі абрад правялі, трэба ў пэўным месцы захоўваць свяціла (як гэта зрабіць, растлумачым пазней) і час ад часу збірацца каля яго на сябрыны, запальваць свечку пры правядзенні іншых абрадаў і святаў (напрыклад, на Дзяды), у час гутарак пра народныя звычаі для дзяцей і дарослых. Гэтае свяціла — сімвал таго агню (жыцця, народа, памяці), які перадалі нам продкі. І мы павінны яго захоўваць і перадаваць нашчадкам, «каб нашаму народу не было пераводу».





## *Сяцi, наша свяцiла!*

*(сцэнарый для вучняў пачатковай школы)*

Удзельнікі — дзеці і выхавацелі, настаўнікі, бацькі і іншыя члены сям'і, госці. Пажадана, каб усе апранулі нацыянальную вопратку і папоўнілі яе атрыбутамі: паясамі, наміткамі на галовы, гальштукамі тканымі або з тасьмы, саламянымі абручамі або шапкамі з тасьмой, трэба не забыцца пра кветкі.

Абавязкова павінна гучаць народная музыка.

Нагадваем: 1 верасня (14 верасня па н. ст.) і праз тыдзень пасля Вялікадня, усяго два разы на год, спраўляюць гэты абрад. Першы раз — як пачатак хатніх работ, вячорак; другі — летніх работ у полі.

Рэкамендуем выкарыстоўваць сцэнарый творча, уключаючы яго ў правядзенне святочных вечароў, ранішнікаў, іншых урачыстасцей. Але абавязкова, як і ў батлейцы, не змешваць абрад з праграмай. Бо абрад ёсць абрад; трэба верыць, што ён мае вялікую сілу ўздзеяння на душы памерлых продкаў, якіх просім садзейнічаць у нашых справах, і на кожнага з удзельнікаў або сведкаў гэтай урачыстасці.

Дарэчы, свята прымеркаваць да дня якога-небудзь святога. Павесьце ў школе (садку) аб'яву, што 1 верасня па старому стылю — дзень Сямёна ў народным календары, што ў гэты дзень на Палессі спраўлялі ўрачысты абрад першага запальвання святла ў хаце і г. д. — кароткае апісанне абраду і яго атрыбутаў.

На ролю гаспадароў выбіраецца нехта з бацькоў ці настаўнікаў. Яны раскажуць пра дзень Сямёна; пра абрад і вераванні нашых продкаў. Гаспадыня і яе дзеці павязваюць ручнікамі і кветкамі, стужкамі комін. Пакрываюць абрусамі сталы (іх трэба паставіць пад лучнікам або пры самай печы).

Гаспадар выказвае пажаданне, захоўваючы гаворку той мясцовасці, дзе запісаны абрад (глядзіце ў дадатковым матэрыяле).

Для гумару хтосьці з дзяцей можа ўстаўляць у прамову рэплікі на тэмы сучаснага жыцця. Гаспадар стукае свавольніка драўлянай лыжкай (яна — сімвал улады).

Гаспадыня *(запальвае свечку і гаворыць):*

Сяцi, наша свяцiла,
Шчоб агню нам не тушыла,
Шчоб добра было прасці, ткаці
І сеяць цяпло ў хаці.

Узяўшы ў рукі палавінку гарбуза, у якую ўстаўлены букаровы цвет, адзін з удзельнікаў вядзе за сабой карагод вакол пасвета (коміна). Пры гэтым спяваюць вясельную песню: пачынаецца «жаніцьба» коміна з працаю.

Мой Семёнку,
Мой салавейку,
Як таб харашэнька!
Як зацвіла калінанька
Да на лютым марозі.
Пацалуймося, мая сванечка,
Да на першым парозі.

Гаспадыня «частуе» комін і запрашае ўсіх да стала. Пачаставаўшыся, уся сям'я, госці спяваюць розныя пазаабрадавыя песні. Але з'яўляецца гаспадыня, якая на падносе нясе «ласошчы» — семкі (гарбузікі), пернікі, бублікі, сушаныя слівы, яблыкі, грушы, журавіны, каліну. Гаспадар выстаўляе мёд у сотах. У першую чаргу частуюць комін, потым — усіх прысутных (пачастунак залежыць ад дастатку сям'і).

— Дзяўчаты, праспявайце нашаму маладому песню,— просіць гаспадынька, паказваючы на комін. Адна з іх або хорам спяваюць:




Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі,
Посвіты ж нам, коміну, біленькі.
Мы ж цябе квіткамі ўбіралы,
Бервяночкам, рутай аперазалы.
Праца наша — дзіўка гарненька,
Палюбыты коміна радзенька.
Мы ж цябе будзема жаніты,
Жаніты — квас, піва, мёд піты.
Светы ж, каміночку, яснэнька,
Пабуджай чэлядачку раненька:
Шыты, прасты, ткаты маладым,
А падарачкі збіраты старым.
Каміночку, ты нам спагадай,
Кручу, верчу і буры праганяй,
Дым і сажу нясы варагам,
Світ, ахоту і радасць пашлы нам.
Гаспадыня наша, паглядай,
Піва, квасу, мёду падлівай.

Гаспадыня зноў частуе ўсіх, а гаспадар кажа: «Каб так рана ўставалы і шчыра працавалы, як голасна співалы!..»

Затым пачынаюцца танцы, або другая частка праграмы. Калі абрадам пачынаюцца вячоркі, пасля танцаў дарэчы сесці за якую-небудзь работу: вышыванне, аплікацыю, выраб з саломкі, паперы і інш. Затым нехта пачынае расказваць казкі, легенды, паданні. Пачынаць трэба з твора, прысвечанага працоўнай дзейнасці, у залежнасці ад праграмы вечара. Калі застолле ў праграме не прадугледжана, можна абысціся без яго, але частаванне ласошчамі абавязкова ўваходзіць у абрад.

### *ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ*

## *«Жаніцьба пасвета»*

**Свяціла** — прыстасаванне для асвятлення ў розных рэгіёнах Беларусі мела свае назвы: **камінак** — смалісты корчык або лучына, якія паліліся на рагу прыпечка, звернутага да покуці, для асвятлення хаты; **дзядок** — спецыяльнае прыстасаванне, куды торкалі лучыну (такі стаяк на ножках); **светач** — такое ж прыстасаванне, але дзядком яго называлі на Гродзеншчыне, а светачам — у Віцебскай вобласці.

Выкарыстанне агню ў гісторыі чалавецтва мела выключнае значэнне. Пачынаючы расказ пра наша свяціла, каратка апішыце жыццё старажытнага чалавека, якое цалкам залежала ад агню: гэта цяпло і святло; гарачае харчаванне, магчымасць абараніцца ад драпежнікаў; гэта попел — угнаенне, якое дапамагала збіраць багатыя ўраджаі. Нарэшце, толькі з дапамогаю агню сталі выплаўляць жалеза, выраблять шкло.

Нашы продкі былі язычнікамі (язык — народ, язычніцтва — народная рэлігія, вера ў мноства багоў). На іх думку, багі кіравалі рознымі сіламі ў прыродзе, былі пасрэднікамі паміж чалавекам і навакольным асяроддзем. Іх шанавалі, прасілі аб літасці, ім прыносілі ахвяры.

Наш абрад «Жаніцьба коміна» звязаны з культам агню. Паводле старажытнага міфа, богам агню быў Сварог (ад санскрыцкага слова, якое азначае: неба), ён злучыў неба і зямлю, навучыў людзей каваць жалеза, яму прыпісваецца таксама ўвядзенне шлюбу (ён злучаў пару, і муж з жонкай павінны былі захоўваць вернасць адзін аднаму ўсё жыццё. Хто парушаў гэты закон, таго Сварог кідаў у вогненную печ). З пашырэннем хрысціянства гэтыя функцыі — апякунства шлюбаў — былі нададзены святому Кузьме. Сварог — галоўнае боства ўсходніх і заходніх славян. Калі сёння запытаем дзяцей, імёны якіх старажытных багоў ім вядомыя, — абавязкова назавуць Перуна. Словы «Каб цябе Пярун забіў!» ды яшчэ дзіцячы страх перад навальніцай і захоўваюць у іх памяці вобраз Бога агню. Пярун — пазнейшае імя Дажбога (які ўвасабляе вобраз продка і апекуна славян). Яму пакланяліся, у свяцілішчы ў яго гонар запальвалі рытуальны агонь. Дажбог — Бог сонца, ён даваў цяпло, спрыяў ураджаю. Гэта — божышча нябеснага агню.

Сварожыч — божышча зямнога агню. На Беларусі ў час сушкі снапоў у Ёўні спальвалі неабмалочаны сноп жыта ў ахвяру Сварожычу. Людзі верылі, што Сварожыч можа адвесці бяду.

Абавязкова раскажыце дзецям пра сялянскую хату, пакажыце малюнак або зрабіце макет, наведайце музей народнай архітэктуры і побыту ў

Строчыцах пад Мінскам, або хату-музей, ці любую сялянскую старую хату. Гэта вельмі цікавая тэма для асобнай гутаркі з дзецьмі. Добра, калі яна будзе папярэднічаць абраду.

Здаўна печ у сялянскай хаце размяшчалася ў куце ля дзвярэй. Гэта — як бы сваё ўласнае свяцілішча сям'і (дарэчы, вуглі з печы выграбалі ў спецыяльную ямку-нішу, прысыпалі попелам — і яны цэлыя суткі выкарыстоўваліся як запалкі). Калі згасне агонь у печы, патухнуць вугольчыкі — лічылася дрэннай прыкметай. Спачатку печы былі курныя: дым ішоў на хату або выходзіў у сені праз адтуліну з дзвярэй, а печ — паўкруглае або авальнае прыстасаванне, складзенае з валуноў на грунце або на невысокай пляцоўцы, — уяўляла сабою капішча. Паступова печ набыла складаную форму, стала канструкцыяй, часткі якой мелі свае функцыі і назвы: апечак — зрубная або слупавая аснова; падпечча — свабодны прамежак унізе, дзе зімой у маразы трымалі свойскую птушку; прыпечак (загнет) — шырокая пляцоўка печы; ляжанка (чэрань) — верхняя частка печы, месца для адпачынку, сушкі адзення, ягад, зерня і г. д.; комін — дымаход і інш.

## *КОМІН, ПАСВЕТ, ЛУЧНІК*

Комін — гэта дымаход у печы, а яшчэ часам рабілі другі комін, які выцягваў бы на гарышча дым са свяцільніка (лучыны або інш.), што асвятляў хату, у спецыяльную дзірку-адтуліну, якая летам затыкалася (пра што нам расказвалі ў вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці). Тут быў запісаны і ўвесь абрад «Жаніцьба коміна».

Для выканання абраду ў школе, садку або дома комін можна пашыць з белай тканіны, працягнуўшы ў швы дроцік або ўставіўшы пруточкі, палачкі. Такі комін лёгкі, яго можна ўсюды падвесіць. Зверху прышываюць вяроўкі, на якіх будзе вісець комін, пад ім падвешваюць лёгкую бляшанку або рашотку — пасвет або лучнік, да якога прымацоўваецца свечка (раней палілі лучыну). Гэта выглядае прыкладна так.



Сапраўдны комін рабілі з лазы, абмазвалі глінай і бялілі. У час абраду ўпрыгожвалі ручнікамі, кветкамі, стужкамі. Яго частавалі півам або квасам, ласошчамі — арэхамі, гарбузовымі семкамі, мёдам у сотах, печывам, а таксама абсыпалі зернем, клалі сала, хлеб — тое, што елі самі.

Абрад называлі яшчэ «Жаніцьба лучніка», «Жаніцьба пасвета». Вядома больш за 10 запісаў гэтага абраду, зробленых у асноўным на Палессі ў XIX—XX стст. Першы яго апісаў Л. В. Шэйн у пачатку 1880-ых гадоў. Сучаснае апісанне вы знойдзеце ў кнізе «Земляробчы каляндар». Мн., 1990 г. С. 268—270 і 270—272.

## *ДАМАВІК*

Паводле старажытных вераванняў беларусаў, у хаце жыў хатнік (дамавік). Яго ўяўлялі ў выглядзе старога дзеда ў белай вопратцы з сівой барадой і доўгімі валасамі. Жыў ён у падпечку або за печчу (часам лічылі, што ў каморы, у сенцах або клеці). У кожнай хаце быў свой такі дамавік, які ўвасабляў памерлага гаспадара. Лічылася, што хатнік ахоўвае будынак, маёмасць. Ён запальвае агонь, назірае за сямейным побытам. Баяліся і шанавалі яго людзі, прыносілі яму ахвяры (на Дзяды за печ або ў падпечак клалі патроху ад усіх страў). Спраўляючы абрад «Жаніцьба коміна», трэба абавязкова, перш чым пачаставацца самім, пакласці на комін крыху ласункаў, ежы і праліць некалькі капель пітва.

### Загадкі пра светач і лучнік, пра лучыну і агонь

Не бразгае дзвярыма, у вокны не грукоча, а ў пакой увойдзе, калі захоча. *(Святло ў хаце)*

Старэнькі дзядок зубкі папёк. *(Светач або лучнік)*

Цыган зубы папаліў,
Цыган грыбы папёк,
У цыгана губы чорны. *(Светач)*

Стаіць Гаўрыла — замазана (мазанае) рыла. *(Каганец, светач)*

Вісіць Гаўрыла, памазаўшы рыла. *(Светач)*

Есць белае, а астаўляе чорнае. *(Лучына)*

Разлажу я пасць — нікому не сказаць: ні цару, ні царыцы, ні папам, ні дзякам, ні нам, дуракам. *(Лучына)*

Чырвоны дзядзя па жэрдцы едзе. *(Агонь на лучыне)*

На гару бягом, а з гары — ні з месца. *(Агонь на лучыне)*

Па жэрдцы чырвоненькі петушок скача. *(Агонь па лучыне)*

На беленькай кладачцы чырвоны певунок скача. *(Агонь на лучыне)*

Не тое грозна, што дзярэцца розна, ды тое страшна, што на канцы ясна. *(Запаленая лучына)*

*З кнігі «Загадкі». А. І. Гурскі. Мн., 1972.*

## «ЖАНІЦЬБА ПАСВЕТА»

У вёсцы Дзяржынск (раней Радзілавічы) абрад успомнілі ў 1988 годзе пажылыя жанчыны, якія раней жылі ў суседняй вёсцы Храпунь Столінскага раёна.

Яны вырывалі з градкі васілька, такі бураковы цвет. І ўстаўлялі яго ў дзірку, зробленую ў палавінцы гарбуза. Потым адзін трымаў васілька, і ўсе за ім хадзілі кругом пасвета і спявалі або казалі:

— Свяці, наша свяціла, щоб агню нам не тушыла, щоб добра было прасці, ткаці і сеяць цяпло ў хаці.

Як «жанілі» пасвета, то спявалі:

— Мой Семенку, мой салавейку, як табе харашэнька! Як зацвіла каліканька да на лютом марозі. Пацалуймася, мая сванечка, да на першым парозі.

Раней выконваліся як спецыяльныя абрадавыя песні, так і вясельныя. У абрадзе прымалі ўдзел дзяўчаты, якія ў гэты вечар «запрадалі». Каля пасвета за грэбнямі, прадучы, спявалі многія пазаабрадавыя песні, слухалі бываліцы, жарты, гулялі на вечарніцах з хлопцамі.

*А. ЛОЗКА*

## *«Жаніцьба коміна»*

У вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна нам прыгадалі, што перад зімой «коміна жанілі». Абвязвалі комін ці пасвет стужкамі, запальвалі лучыну і потым вечарамі пралі кудзелю.

Комін — гэта невялікая труба, сплеценая з лазы і абмазаная глінай, якая прымацоўвалася да адтуліны ў столі. Пад трубой вешалі пасвет (лучнік) — патэльню ці квадрат металічнай рашоткі, дзе гарэла лучына, што асвятляла хату селяніна ў восеньскія і зімовыя вечары.

З дзесятка вядомых нам запісаў абраду лепшым і паўнейшым уяўляецца публікацыя П. В. Шэйна «Жаніцьба коміна», матэрыялы даслаў у 1883 г. настаўнік Пінскага рэальнага вучылішча В. Л. Грудніцкі. Каб уявіць і зразумець старажытны абрад пакланення агню, мы друкуем фрагменты той публікацыі.

«У горадзе Пінску і яго навакольных вёсках здаўна існуе звычай штогод 1 верасня праводзіць абрад пад назвай «Жаніцьба коміна...».

Прыгатаваўшы ўсё неабходнае для вячэры, гаспадыня абвязвае комін і лучнік новымі ручнікамі, а моладзь прыбірае іх кветкамі. Стол накрываецца новым абрусам і ставіцца пры самай печы ці пад лучнікам. Як толькі на дварэ сцямнее, у хату збіраецца ўся сям'я.

Гаспадар выказвае пажаданне: «Пкздароўтэ, дзедуся, бабусю, дзядзька, дзеткі, чаляднічкі, прыяцеляў і дабрадзеяў!.. Зашчытыты худобку: конькі, волыкі, кароўкі для дыток і ўсякую скацінку. Зарадыты хлебец, жыта, пшэныцю і ўсяку пашныцю. Зашчытыты пчолкі, вынесь іх на красну весну!.. Дайтэ чэлядачцы ахоту раненька ўставаты, пры світлі працоваты. Дайтэ, што б нашаму роду не было пераводу...»

Калі ўся сям'я паспее закусіць, павесялее і ва ўсіх языкі развяжуцца, гаспадыня прыносіць у фартуху семкі (гарбузікі), сыпле іх на комін, а на стол кладзе ласошчы: пернікі, бублікі, яблыкі, гнілушкі, каліну, журавіны. А гаспадар прыносіць міску свежага мёду ў сотах. Моладзь збірае рассыпаныя семкі і бярэцца за салодкае. Тады гаспадыня прапаноўвае праспяваць жаніху, коміну, вясельную песню «Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі».

Старэйшыя ў сям'і часта перапыняюць спяванне блаславеннямі, напрыклад: «Каб так рана ўставалы і шчыра працавалы, як голасна співалы!..»

Запісаў абраду з мінулага стагоддзя захавалася вельмі мала, а тэкст песні зафіксаваны толькі на Піншчыне.

Пры святле лучыны можна было не толькі працаваць, але і чытаць. Крапіўка (адзін з псеўданімаў Алаізы Пашкевіч) назвала дзіцячы часопіс «Лучынка», які нёс святло дзецям у шырокім сэнсе гэтага слова. Яна пісала ў 1916 г.: «Праз многа стагоддзяў у нас на Беларусі свяціла лучынка. Яшчэ і цяпер дзе-нідзе ў вёсках збіраюцца на попрадкі з кудзелямі дзяўчаты, маладзіцы: песні спяваюць, казкі баюць. Старэйшая з кабет або нехта з дзяцей ахоўваюць дзеда-лучніка: то вугаль абтрасе, то свежую лучынку

пакладзе. Мігаюць іскры па хаце. Пры пламеньчыку складна родная песня плыве, казка баецца».

На Беларусі, у прыватнасці на Палессі, існуе асаблівая пашана да агню. «Жаніцьба коміна» — гэта сляды культу духаў-продкаў, дзядоў, хатніка, які, паводле ўяўлення язычнікаў, звязваўся з агнём (Сварожычам) і жыў у сушні, на печы і пад ёй, у коміне. Гэта яму прыносіліся ахвяраванні — «ласошчы». Паэтычна ўспрымаецца цяпер абразок з песні «Вяселле коміна з працай». Абрад узнікнуў пры феадалізме і стаў цяпер архаічнасцю, на аснове даўнейшых традыцый пакланення агню. У нас вядомы і іншыя «жаніцьбы»: гульні «Жаніцьба Цярэшкі», «Жаніцьба бахара», свята «Жаніцьба свечкі» і інш.

*Алесь ЛОЗКА*



### *Цуды*

***19/6 верасня — Цуды, Міхайла***

*(дадатковы матэрыял)*

Лічылася, што на Цуды з людзьмі адбываліся розныя незвычайныя здарэнні, аб іх паведамляецца ў многіх беларускіх легендах.

19 верасня адзначаюцца Цуды, або цуда Архістраціга Міхаіла. Прысвятак гэты нерухомы, мае цвёрдую дату. Цуды найбольш вядомы на Беларусі тым, што ў гэты дзень сяляне асцерагаліся запальваць агонь у асецях і не малацілі збожжа, бо, у адваротным выпадку, усё згарыць. Бытуе шмат легенд, у якіх апавядаецца пра названы прысвятак. Тэматычна яны звязаны з малацьбой сабранага з палеткаў і звезенага ў гумны збожжа. Некаторыя з гэтых легенд змешчаны ў восьмым выпуску «Беларускага зборніка» вядомага фальклярыста Е. Р. Раманава, да якіх мы і звернемся.

Аднойчы адзін селянін заначаваў у гумне ў ноч на Цуды, каб потым раней устаць і ўзяцца за малацьбу. Але ноччу на яго навалілася нячыстая сіла, а калі ён схапіў яе за лапы і скінуў з сябе, яна пабегла з дзікім рогатам. І гэты мужык, страшэнна напалоханы, ледзь да хаты дабег.

А вось другі селянін з сям'ёй перад світаннем пачаў ужо малацьбу. І тут раптам у гумно заходзіць вельмі прыгожы чалавек і пытае, што яны тут робяць. Гаспадар як не са здзекам адказвае яму, што, маўляў, не бачыш, чым займаемся, — малоцім. Той жа ў адказ зазначае, што сам усё бачыць. Але перасцерагае, сягоння ж Цуды! Ды селянін на гэтую перасцярогу не зважае, адказваючы амаль з выклікам, што, вось калі змалоцяць, тады і будзе цуда. Пасля такога адказу нечаканы наведвальнік стаўся нябачным, знік, а гумно вокамгненна занялося полымем і згарэла з усім збожжам, ледзь толькі паспелі выбегчы з яго гаспадары.

Яшчэ адзін селянін ноччу выправіўся ў гумно распаліць печ, але, прыйшоўшы туды, ён са страхам убачыў, што ў печы гарыць ужо агонь у выглядзе вогненнага шара. Спалохаўшыся, ён выбег з гумна і ўсю ноч чакаў, што яно загарыцца. Але, на шчасце, усё закончылася добра, і думак пра малацьбу ў гэты дзень у селяніна больш ужо не ўзнікала.

З Цудамі таксама ў народзе было звязана павер'е, што калі хто ў гэты дзень сее жыта ды не ведае, што гэта за дзень, то таго чакае добры ўраджай, калі ж хто ведае, але працягвае сеяць ці згадае і не спыніць працу, то збожжа не ўродзіцца.

## Слоўнік

*Асець, восень* — старадаўняя гаспадарчая пабудова для прасушкі збажыны, канапель, ільну. Канструкцыйна больш складаная, чым ёўня (гэта таксама старадаўняя гаспадарчая пабудова, прызначаная для прасушкі збожжавых культур, тых жа самых канапель, ільну). Найчасцей асець ставілі ўнутры гумна ля тарцовай сцяны, процілеглай варотам, зрэдку — за гумном.

*Гумно* — гаспадарчая пабудова для працяглага захоўвання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны, саломы, сена. У помніках усходнеславянскай пісьменнасці слова «гумно» фіксуецца з XI стагоддзя. Спачатку гэта было месца, дзе жывёлай «мялі» (вымалочвалі) зерне. І цяпер у некаторых раёнах Мінскай, Віцебскай, Гродненскай абласцей так называюць пляцоўку для малацьбы ў сярэдзіне гумна або каля яго. У старажытнабеларускіх помніках XV—XVII стагоддзяў тэрмін ужываўся як агульная назва ўсіх будынкаў для захоўвання збожжа і сена. На працягу XVIII—XIX стагоддзяў слова «гумно» ў большасці раёнаў Беларусі замацавалася за збудаваннем для захоўвання і абмалоту збожжа. У Віцебскай і на поўначы Магілёўскай абласцей гумно называюць токам, у большай частцы раёнаў Брэсцкай і на захадзе Гомельскай абласцей — клуняй, у сумежных з Латгаліяй раёнах — рыгай.

## Загадкі

Ляцяць гускі, дубовыя наскі, ляцяць і гавораць: «То — то я! То — то я!»

*(Малацьба)*

Домна! Домна! Зрабі мне добра: мне дробна і сабе добра.

*(Малацьба)*

Як пайду я па вытапу, ды вазьму я па гутату, ды ўдару па татару.

*(Ток)*

Маці гладка, а дзеці кручоныя.

*(Ток і цэп)*

Маці гладка, сыны-цакуны, дочкі — палізухі.

*(Гумно)*

Бацька гарбаты, матка пляскатая, а сын кручоны.

*(Гумно, ток і цэп)*

Бацька-сцюдзёнка, матка-таплёнка, сынкі-скакункі, а дачушкі-лізушкі.

*(Ток, ёўня, цапы і мётлы)*

Бацька-шацёр, матка-хатка, сыны-падхватні, дочкі-падлізухі.

*(Гумно, ёўня, цапы, мётлы)*

Паміж дубінкі, паміж ляшчынкі ляжыць кусок скурацінкі.

*(Цэп)*

У нашага Антонка сярэдзіна тонка.

*(Цэп)*

Братцы-хватцы, сястрыцы-палізушкі.

*(Цапы і мётлы)*

## *БАГАЧ*

**21 верасня (8 верасня па с.ст.) — Багач — свята заканчэння ўборкі зерневых і пачатак азімай сяўбы**

Галоўнае ў абрадзе святкавання Багача — лубка-кошык, напоўнены жытам, з устаноўленай свечкай. Лубка прыладкоўвалася на самым пачэсным месцы — покуці і называлася багач. Багач, згодна павер'я, забяспечваў ніву жытам. На свята лубку з зернем і запаленай свечкай па чарзе пераносілі ад гаспадара да гаспадара, тым самым жадаючы кожнаму багацця. Лічылася, што Багач прыносіць у хату дастатак і шчасце. Таму кожная сям'я была яму рада.

А ў пакіданні яго пачаргова ва ўсіх хатах нельга не бачыць пачатку народнай традыцыі восені.

На Багача да ўсходу сонца гаспадар засяваў ніву жытам. Да азімай сяўбы селянін прыступаў урачыста. У доме ўсё мылася, чысцілася, варылі і пяклі шмат смачнага.

Адпраўляючыся на засеўкі, селянін апранаў белую кашулю; вярнуўшыся з сяўбы, вечарам спраўлялі ўрачыстую вячэру. Чысціня ў хаце, у адзенні сейбіта, дастатак на стале былі абрадавымі захадамі дзеля поспеху ў працы, урадлівасці засеянай нівы. Разам з тым было гэта ўсё святасцю, выказваннем пачуцця вялікай адказнасці, асобай пашаны да хлеба.





### *«На нашай ніўцы сёння дажынкі»*

*(сцэнарый для старэйшай групы дзіцячага садка)*

Зала ўпрыгожана сялянскімі ручнікамі, дыванамі, посцілкамі, рэчамі народнага быту. Пасярод яе — сноп жыта. Гучыць беларуская народная полька «Дажынкі». У залу ўваходзяць дзеці дзвюх старэйшых груп. Яны ўладкоўваюцца на лавах. На сярэдзіну залы выходзіць жанчына ў беларускім нацыянальным адзенні.

**Жанчына.** Шаноўныя госці! Сёння мы запрасілі вас на свята Багач. У мінулым людзі адзначалі яго тады, калі апошні сноп на полі быў дажаты. Сноп урачыста прыносілі ў хату, абмалочвалі, зерне ссыпалі ў лубку. Затым устаўлялі свечку і запавальвалі яе. Такім чынам рабіўся багач, які заносілі ў кожны двор.

Да снапа падбягае дзяўчынка.

**Дзяўчынка.** Гаварыла поле шырокае, жыта ядранае:
Жнейкі, жнейкі мае маладыя, сярпы залатыя,
Прыходзьце ка мне заўтра рана,
Каб я недажатым не стаяла.
Не хачу я ў полі стаяці,
Апошнімі каласамі махаці,
А толькі хачу ў полі — стагамі,
А ў гумне — капамі.

У залу ўваходзіць група жанчын. Яны спяваюць жніўную песню «Як на нашай ніўцы...». Яна выконваецца акапэльна.



(Шырма Р. Беларускія народныя песні. Т. 3. 1959.)

Як на нашай ніўцы сёння дажынкі.
Дзіва, дзіва. *(Паўтараецца пасля кожнага радка.)*
Да краю дажнёмся, мёду нап'ёмся.
Наш хазяін Савасцей дасць гарэлкі берасцень.
Хазяйка цяпера паставіць вячэру.

Жанчыны апрануты ў белыя кашулі і светлыя спадніцы. Галовы пакрыты светлымі хусткамі. Адны нясуць на плячах сярпы, другія трымаюць у руках торбачкі з ежай, глечыкі з квасам. Яны імітуюць абрад «завіванне барады». Жанчыны абступаюць сноп з усіх бакоў, упрыгожваюць яго кветкамі, затым абвязваюць каляровай стужкай.

Дзяўчаты размяшчаюцца асобнай групкай. Яны садзяцца на падлогу і пачынаюць плясці вянкі з каласоў і кветак. Адна дзяўчына падыходзіць да старэйшых і вымаўляе словы, якія павінны прагучаць на фоне спеву.

**Дзяўчынка.** Радзі, Божа, жыта! Радзі і пшаніцу на другое лета!
Лепшае за гэта!

З апошнімі словамі песні жанчыны «дажынаюць» сноп, падхопліваюць яго і выходзяць з залы.

Гучыць беларуская народная песня «Ой, капуста...». Вучні старэйшай групы падымаюцца з месцаў і пачынаюць збор каласоў. Калі музыка перастае гучаць, на сярэдзіну залы выбягае дзяўчынка.

**Дзяўчынка** *(усхвалявана).* Ой, глядзіце, колькі я каласоў назбірала!

**Дзеці** *(Усе).* Дзе? Дзе? *(абступаюць дзяўчынку).* І праўда, багата!

**Хлопчык.** Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там пуста!

**Дзяўчынка.** Зямля, як талерка! Што пакладзеш, тое і возьмеш.

Зноў гучыць музыка. Дзеці пачынаюць збор каласоў. Потым яны садзяцца на падлогу маляўнічай групкай. Музыка сціхае.

**Дзяўчынка.** Ой, нешта сумна стала!

**Адзін з хлопчыкаў** *(весела).* А я ведаю загадкі!

**Дзяўчынка.** А вось і не ведаеш!

**Хлопчык.** Ведаю!

**Дзеці**. Ну, дык загадай!

**Хлопчык.** Добра, слухайце! Стаіць паніч дагары нагамі.

**Дзеці** *(разам).* Вілы, вілы!

**Хлопчык.** А я яшчэ адну ведаю! Маленькі, гарбаценькі, а ўсё поле абскача!

**Дзеці.** Серп! Серп!

**Другі хлопчык.** Я таксама ведаю загадкі.

**Дзяўчынка.** Нічога ты не ведаеш!

**Хлопчык.** Ведаю, вось слухайце. Адна матка дванаццаць сыноў мае, на ўсіх нацiскае.

**Дзеці.** Граблі!

**Дзяўчынка.** Ну, хопіць вам размаўляць... Гутарка гутаркай, ды і за працу час!

Усе падхопліваюцца і пачынаюць зноў збор каласоў пад тую ж музыку. Затым дзеці садзяцца на свае месцы.

На сярэдзіну залы выбягаюць дзеці другой групы. Яны па чарзе вымаўляюць наступныя словы, адлюстроўваючы свае пачуцці выразнымі рухамі рук.

Ой, якая багатая восень!
Усё ў яе ўдалося!
Жыта ў трубу павілося,
А авёс, як тын, парос!
А ячмень палёг на пляцень!
А пшаніца, як брусніца,
А грэчачка, як кветачка!

Гучыць уступ да карагода «Прывітанне, восень» (Муз. М. Шнейдэрмана, сл. А. Благіной, пераклад А. Вольскага).

Дзеці водзяць карагод, у цэнтры якога знаходзіцца дзяўчынка, апранутая ў касцюм Восені:




(Нашим дошколятам /Сост. Л. В. Кузьмичева. Мн., Народная асвета. 1977.)

**Дзеці.** Восень, Восень! Прывітанне!
Рады мы тваім дарам! У цябе мы запытаем:
— Што прынесла, Восень, нам?
**Восень.** Я прынесла вам мукі.
**Дзеці.** Значыць, будуць піражкі!
**Восень.** Я прынесла грэчкі!
**Дзеці.** Будуць перапечкі!
**Восень.** Буракоў, капусты, круп...
**Дзеці.** Будзе боршч і будзе суп.
**Восень.** Ці рады вы грушам?
**Дзеці.** На зіму насушым...
**Восень.** Ну, а яблыкі, што мёд!
**Дзеці.** На варэнне, на кампот!
**Восень.** Я прынесла мёду!
**Дзеці.** Поўную калоду!
Ты і яблык, ты і мёду, ты і хлеба нам дала.
Ну, а добрае надвор'е ты для нас не прыпасла?
**Восень.** Я пашлю вам дожджык з неба!

**Дзеці.** Не, не хочам, нам не трэба!
Дожджык, не перашкаджай, мы збіраем ураджай,
Будзе ў нас багаты год. А цяпер — у карагод!

Дзеці выконваюць беларускі танец. Пасля танца ў цэнтры залы застаецца толькі дзяўчынка Восень. Да яе падыходзяць некалькі хлопчыкаў.

**Хлопчыкі** *(па чарзе).* Ой, Восень мая, Восень сцюдзёная!
Чаго ж ты раненька захаладалася?

**Восень.** А я не раненька, а я не позьненька!
Як мая пара прыйшла, лісточак апаў, зямельку ўслаў!

Усе разам адбягаюць на свае месцы.

У грамзапісе гучыць «Палескі вальс» у выкананні ансамбля «Свята». У залу шпаркім крокам уваходзіць гаспадыня. У руках яна трымае чыгунок з дранікамі.

**Гаспадыня.** *(Зычна).* Гэй, Рыгор! *(Пад нос).* Каб цябе качкі патапталі! І дзе ж гэта ён падзеўся?

Чуцен голас з другога канца залы.

**Рыгор.** Я тут, мая ясачка!
**Гаспадыня.** Дзе цябе носіць! Ты падрыхтаваўся?
**Рыгор.** А што, мая ясачка?
**Гаспадыня.** Як што? Жнейкі ўжо вяртаюцца з работы... О, чуеш, спяваюць?

У гэты час чуваць спеў за дзвярамі. Гаспадары мітусяцца, рыхтуюць пачастункі. У залу уваходзяць жнейкі. Яны спяваюць жніўную песню «Ой, у садочку» (выконваецца акапэльна):




Ой, у садочку цвіла лілея.
Ды жала жытка панна Марыя.
Збор жытка, збор! Нашаму пану ў двор.
*(Пасля кожных двух радкоў)*
Па нашым полі беглі лябёдкі,
Дажалі жытка красны малодкі.
Па нашым полі беглі авечкі,
Дажалі жытка красны дзявочкі.

Па нашым полі скакалі жабы,
Дажалі жытка старыя бабы.
Не шкадуй, пане, бочку мядочку.
Нажалі жытка, так, як лядочку.
Засцілай, пане, сталы і лавы,
Бо ўжо ідзе госць небывалы...

Спявачкі, прыбраныя ў святочнае адзенне, нясуць перад сабой «завітую бараду».

**Жнейкі** *(па чарзе).* Адчыняй, пан, вароты! Ідуць жнейкі з работы!
Адчыняй і другія — ідуць маладыя, сярпы залатыя!

**Усе разам.** Добры дзень, наша гаспадыня!
**Гаспадыня.** Добры дзень, жнейкі маладыя!
**Жнейкі.** Добры дзень гаспадару маладому!
**Рыгор.** Добры дзень жыту яравому, зярну залатому!
Жнейкі з паклонам перадаюць сноп гаспадару.
**Рыгор.** Добрае жыта, багатае...

Гучыць вясёлая музыка восеньскай талочнай песні «Як пазвалі ў талаку» *(Прапануецца інструментальная мелодыя):*




(Восеньскія і талочныя песні / Скл. А. С. Ліс. Мн., Навука і тэхніка. 1981.)

З вясёлымі воклічамі ўсе пачынаюць церушыць сноп над ручніком, затым зерне ўсыпаюць у лубок, устаўляюць свечку і падпальваюць яе. Рыгор бярэ лубок і ўрачыста ставіць, як на покуці.

**Гаспадыня.** Добры ў нас атрымаўся Багач. А зараз не грэх і пачаставацца.

У грамзапісе гучаць вясёлыя мелодыі (ансамбль «Свята»). Жнейкі, госці і ўдзельнікі садзяцца за сталы.

**Гаспадыня** *(разносіць частаванне).* Хлеб ды соль! Смачна есці!
**Жнейкі** *(па чарзе).* Вялікае дзякуй! Мы даўно сябруем з вамі і прыйшлі за пірагамі.
**Гаспадыня.** У мінулым годзе, калі жыта ўрадзіла, дык уся радня хадзіла!
А як жыта звялося, дык нікога не засталося!
**Рыгор.** Ешце, госцейкі, бо без сала куса няма жыцця ў беларуса.
**Жнейкі.** Дзякуй, на смачны кусок знойдзем куток.
**Гаспадыня.** Чым хата багата, тым і рада. А самая багацейшая тая, у якой гучаць песні.

Далей прапануецца вольная праграма на выбар мастацкіх кіраўнікоў. Сюды можна ўключыць народныя песні, танцы. Актыўны ўдзел у гэтай частцы свята павінны прымаць дзеці.

**Рыгор.** Але, дзеўкі, трэба ўжо несці Багача да іншых двароў.
**Жнейкі.** Павесяліліся, і досыць!
**Гаспадыня.** Не, даражэнькія, так справа не пойдзе... Трэба Багача правесці весела, як і сустрэлі. А ну, заспяваем, даражэнькія! Грай, музыкант!

Гучыць любая вясёлая музыка. Гаспадар бярэ Багача і нясе яго з залы, за ім выходзяць усе ўдзельнікі свята.



## *«Прыйшоў Багач»*

*(сцэнарый свята для вучняў пачатковых класаў)*

На сцэне плакат «Прыйшоў Багач, кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку».

На «покуці» — багач, у другім кутку сноп жыта, перавязаны прыгожай стужкай, каля яго вянок з жытніх каласоў і кветак. Над імі развешаны ручнікі і г. д.

Гучыць мелодыя беларускай народнай песні, пажадана жніўнай.

Некалькі дзяцей з каласамі ў руках стаяць на «полі», імітуючы ніву (рост каласоў, іх калыханне, шум ад ветру і г. д.).

**Хлопчык-гаспадар.** А што ў полі рана гукала?
**Ніўка** *(дзеці хорам).* Гаспадар, прыйдзі да нас, паглядзі на нас!

**Гаспадар** *(падыходзячы бліжэй).* Пайду да каваля, закажу сярпоў, паклічу добрых жнеек.

*(Паварочваецца да жнеек):* Жнейкі, будзьце ласкавы, дапамажыце! *(кланяецца ў пояс.)*

**Жнейкі** *(выходзячы).* Ваша ніўка залатая,
Нашы сярпы вострыя! *(кланяюцца ў адказ.)*

(Да «ніўкі»). Добры дзень, ніўка,
Ядранае жыта!

**Адна са жнеек** *(узяла трох чалавек з «ніўкі» і паставіла ў адно месца, як снапок).*

Стаўлю сноп на сто коп,
На тысячу мерак!

**Усе разам** *(ідуць карагодам і спяваюць).*

Грала, грала сонейка,
Небагата грала.
У хмару схавалася,
Дажджу напужалася...

Дзяўчынка-«багіня» стаіць у сярэдзіне карагода, скача і спявае:

Камарочкі вы мае,
Не кусайце вы мяне,
А кусайце жнеек,
Каб мне ўцячы неяк.

Жнейкі хуценька ставяць снапочкі так, як гэта зрабіла першая, і спяваюць:

У нас сягоння вайна была,
Усё поле заваявалі,
Змялі поле мяцёлкамі,
Ідзём дамоў вясёлкамі.
Ніўка, ніўка, ніўка,
Аддай нашу сілку!

Пры гэтым жнеі клаліся на ніву і качаліся на спіне, быццам зямля надавала ім сілу. Ізноў спяваюць:

Мы свайму гаспадару
Ды зрабілі славу:
Жытачка пажалі,
У копы паклалі.

Усе разам, ідучы ў карагодзе:

Канец ніўцы, канец,
Упляцём гаспадару вянец.

Выконваецца танец «Весялуха». Жнеі бяруць вянок і надзяваюць яго на галаву «багіні», а ў рукі даюць сноп. Усё гэта — кружачыся ў карагодзе.

Затым ідуць па гаспадароў:



2. Зак. 641.

Ой, гаспадарачку наш!
Дажыначкаў час!..

Гаспадар і гаспадыня сустракаюць іх хлебам-соллю. «Багіня» выступае наперад і кладзе сноп ля ног гаспадара, а вянок надзявае на галаву гаспадыні са словамі:

— Добры дзень гаспадару! Добры дзень гаспадыні! *(Кланяюцца ў пояс.)* Прынеслі вам вянок з шырокага поля, з ядранага жыта. Гаспадар свайго гаспадарства не страціць, за вянок нам заплаціць. Гаспадару вянок, а нам мёду збанок!

Гаспадар і гаспадыня дораць «багіні» грошы і збанок мёду.

З'яўляецца музыка: хлопчыкі з дудачкай, з бубнам, дзяўчынкі са званочкамі, цымбаламі, пачынаюць іграць. Дзяўчаткі кружацца вакол «багіні», прытанцоўваючы. Пачынаюцца танцы «Талакуха», «Журавель». Затым праводзяцца гульні-карагоды «Проса», «Лянок», «Іванка». Усе танцы і карагоды перамешваюцца жартамі, прыказкамі і г.д.

Гаспадар і гаспадыня дзякуюць жнейкам і «багіні». На гэта жнейкі, развітваючыся, спяваюць:

Дай, Божа, табе, нябожа,
Абсяваць, насяваць,
А нам жаць, дажынаць!

## *ДЗЯДЫ — ДЗЕНЬ ПАМІНАННЯ ПАМЕРЛЫХ*

**1 лістапада — Усе Святыя, памінальны дзень у католікаў.**
**2 лістапада — Задушны дзень.**
**Пятніца-субота перад Змітравым днём (8 лістапада) — Змітраўскія Дзяды, Асяніны**

У беларускага народа дні памінання памерлых захаваліся яшчэ з дагістарычных часоў. Шмат якія старажытныя элементы памінальных язычніцкіх абрадаў страцілі свой першапачатковы сэнс, ад іх засталася толькі сімволіка.

Памінальныя дні, вясновая Радаўніца і вялікія Змітраўскія Дзяды (Асяніны), з уласцівымі ім адметнымі якасцямі найбольш распаўсюджаныя ў нашым краі. Каталіцкая царква прымеркавала дзень усіх памерлых да 1 лістапада (Дзень задушны). А ў народзе, незалежна ад веравызначэння, усё роўна бытуюць чатыры ў годзе памінальныя дні: перад Масленкай, Радаўніцай, Траецкая субота, Змітраўская субота. Аднак найбольш яскравую абрадавую тканку маюць вясновыя і восеньскія Дзяды, якія па сваёй накіраванасці розняцца між сабой.

Згодна з народнай традыцыяй, Радаўніца заўжды прыпадае на другі аўторак пасля Вялікадня. Абрад на прыбраных магілках родных, блізкіх людзей, якія памерлі параўнальна нядаўна, — пры памяці таго пакалення сям'і, якое прыйшло памінаць.

Восеньскія ж Дзяды здаўна праводзяцца ў суботу, часцей у хаце, і памінаюць на іх не толькі членаў сям'і, а ўвесь вялікі род, а то і ўсіх, хто жыў на роднай зямлі. Ушаноўваюць таксама імёны далёкіх продкаў.

Народная творчасць — крыніца чыстых думак і пачуццяў. І толькі яна ўратуе ад абыякавасці. Бо нездарма ж нашы папярэднікі шанавалі памяць памерлых і дні Дзядоў лічылі светлымі. Ведалі: адцуранне ад каранёў пагражае бездухоўнасцю.

Правесці абрад не самае галоўнае, куды важней зразумець неадкладную


МР
ѲУ

патрэбу выконваць гэты абрад. Толькі тады апраўдаюцца намаганні энтузіястаў адрадзіць старажытныя традыцыі.

Дзяды з часам прыходзіцца відазмяняць, з улікам успрымання сённяшнімі людзьмі спрадвечных традыцый. У народзе Дзяды — Асяніны ладзілі ў суботу, у хаце. У некаторых рэгіёнах іх звалі «вячэрай па радзіцелях» (Дзяды перад Масленай — адпаведна — снеданне, Радаўніца — абед, перад Тройцай — полудзень). Загадзя прыбіралі ў хаце, мыліся ў лазні, вешалі свежыя фіранкі, ручнікі, засцілалі белым абрусам стол. Калі трэба было паставіць помнік, ішлі на могільнік, праводзілі прыкладзіны — даводзілі да ладу магільны насып — і паміналі, а затым пачыналася ўжо ўласна «дзядоўская» вячэра.

Размова за сталом вялася аб памерлых дзядах, г. зн. продках роду. Пачынаў яе найстарэйшы з роду: першага прашчура роду нашага было імя такое-та, жыў ён там-та, вызначыўся тым-та і г. д. Апавядаліся прыгоды, характар продкаў, родавыя і звязаныя з родам успаміны і легенды. Варылі на вячэру больш чым трэба было, і рэшткі дзялілі паміж беднымі і жабракамі.



## *«Святыя дзяды, завём вас...»*

Усе мы з хат,
Усе мы з цішыні,
Усе з бабуліных, дзядуліных
далоняў...

Спачатку выхавальнік праводзіць гутарку і нагадвае бацькам аб тым, каб яны расказалі сваім дзецям пра памерлых бабуль, дзядуль, якія яны былі добрыя і працавітыя.

Правядзенне свята

У зале на цэнтральнай сцяне — ікона, ахінутая ручнікамі-набожнікамі. На маленькім століку пад іконай — свечкі. Пасярод залы — стол з памінальнымі стравамі — куццёй, кісялём, блінамі і г. д.

У магнітафонным запісе гучыць жалобная мелодыя скрыпкі, на фоне музыкі чутны званы. У залу ўваходзяць дзеці ў светлым адзенні, яны трымаюць фотаздымкі сваіх памерлых продкаў.

**Выхавальнік.** Сёння мы сабраліся тут, каб ушанаваць памяць тых, каго з намі няма, хто памёр. У мінулым людзі збіраліся за такім сталом, запальвалі

свечку, маліліся, елі куццю і іншыя стравы. Усё гэта на асобных сподачках ставілі для дзядоў пад ікону. Гэтак жа зробім і мы.

Святыя дзяды, завём вас, хадзіце да нас!
Ёсць тут усё, што Бог даў, што я для вас ахвяраваў,
Чым толькі хата багата.
Святыя дзяды, просім вас, хадзіце, ляціце да нас.

Потым усе вячэраюць. Дарослыя размаўляюць з дзецьмі пра іх бабуль, дзядуль, як трэба шанаваць іх памяць. У канцы абраду дзеці і дарослыя слухаюць у грамзапісе малітву ў выкананні хору.



## *Усе Святыя*

Да гэтага дня дзеці рыхтуюць альбомы-радаслоўныя. У час гутаркі настаўнік расказвае пра дзень памінання, прапаноўвае распытаць у сваіх родных, сваякоў аб продках, запісаць іх імёны, прозвішчы, чым займаліся, чым вызначаліся, гады жыцця і г. д.

На першай старонцы альбома начэрчана радаслоўнае дрэва.

Потым прапаноўваецца запісаць са слоў мамы ці таты расказ аб памерлых продках. Калі ёсць фотаздымкі, іх трэба размясціць пад тэкстам ці перад ім. У гэтым абавязкова павінны дапамагаць бацькі. Дзеці загадзя вырашаюць, пра каго з продкаў варта расказваць.

Памінальная вячэра праводзіцца разам з бацькамі, дзядулямі і бабулямі за вялікім сталом, пакрытым белым абрусам. Добра, калі старэйшыя дапамогуць сабраць памінальны стол у адпаведнасці з беларускай традыцыяй.

Вячэру пачынае настаўнік. Ён расказвае аб дні ўшанавання памерлых, а затым дае слова самаму старэйшаму за сталом (яго трэба абавязкова папярэдзіць загадзя).

Можа і сам настаўнік пачаць так:

— Няма той мясціны на Беларусі, дзе не збераглі б трапяткіх адносін да памінальных дзён. *(Запальваючы свечку.)* Святыя дзяды, хадзіце да нас! Мы — дзеці Беларусі, запалім свечку, клікнем нашых продкаў, паразважаем у цішы... Бо мы — народ, і маем род, і маем памяць, голас, зрок, сэрца...

І пацякуць няспешна ўспаміны дарослых і дзяцей. Настаўнік павінен тактоўна, неназойліва накіроўваць успаміны, размовы за гэтым памінальным сталом.

## *Памінальная вечарына ў форме сучаснай трызны*

*(сцэнарый для вучняў старэйшых класаў)*

**Дзеючыя асобы-сімвалы:** Дзяўчына-Памяць, Юнак-Лёс, Паэт-Вяшчун, Багіня памінання — Жаля, Сівы Стары, Музыкі (Гусляр, Скрыпак, Лірнік, Жалеечнік, Дудар), Спявачка, Сучаснікі, Апавядальніца.

**Афармленне залы:** Пасярэдзіне, бліжэй да покуці, стаіць невялічкі стол, засланы саматканым абрусам. На стале — памінальны букет з галінак елкі, хвоі, каліны. Ляжыць бохан свежаспечанага на сухіх лістах хлеба, стаіць вялікая міска з памінальнай куццёй, чарка, бутэлька ці графін з гарэлкай. На куце — крыж, ахілены вышываным ручніком. Пад крыжам на ўслончыку, абвітым дзеразой, стаіць міска, поўная жыта, у якую ўторкнута свечка. У цэнтры залы вісіць абраз пад ручніком. Каля яго гараць свечкі. Тут жа могуць ляжаць лісты з турмаў ад рэпрэсіраваных, а таксама ад сваякоў — ахвяр 30—40-ых гадоў — і пісьмы-трохвугольнікі з франтоў. Па баках залы стаяць рамы, у якіх замест партрэтаў — белая папера — сімвал невядомасці лёсаў. Уздоўж залы размешчаны партрэты славутых людзей Беларусі, памяць якіх сёння ўсенародна ўшаноўваецца. Напрыклад, Цішкі Гартнага, Алеся Гаруна і інш. За партрэты засунуты галінкі елкі ці каліны. У самым дальнім кутку залы стаіць звон, голас якога будзе сімвалам гісторыі. З вокнаў звешваюцца белыя ручнікі — сімвал жалобы ў беларусаў.

Ціха грае скрыпка ці гуслі, пакуль не пачнецца рытуал памінання.

Абрадава-сучасная дзея пачынаецца ў двары: купка моладзі, апранутая ў белае адзенне, з белымі стужкамі ў валасах, саджае дрэўца (ці пэўную сімвалічную колькасць дрэў) у знак народнай памяці аб слаўных продках. Пакуль дзяўчаты абвязваюць саджанцы белымі стужкамі, гучыць жалобна-гераічная мелодыя гусляў ці жалейкі. Потым каля кожнага дрэўца ставяць свечку.

**Дзяўчына-Памяць.**

Мы ўзышлі,
Нібы зярняты,
З поля,
І ўпадзём ізноў у поле мы.
Поле,

У тваім замкнёным коле
Нашы душы, думы і дамы.
*(Пятрусь Макаль)*

(Уступае скрыпка.)
**Юнак-Лёс.**

А зямелюхна чарназёмная,
Расхініся ж ты на староначкі.
Ды сагрэй жа ты, прыгарні
Нашай памяці карані.
Гаснуць блуднымі слёзы znічкамі.
Нашы страты ўсе не палічаны.
Ды бацькоўскі край век не выстыне.
Не знямець зямлі чорнай выспінай.
Нашы парасткі караністыя,
Сэрцы й думачкі нашы чыстыя.
У сваім краі ўстанем дрэвамі,
Ўзыдзем праўдаю, светлай вераю.
*(Антаніна Хатэнка)*

Мелодыя гусляў ці жалейкі мацнее. Выходзіць Паэт і прарочым голасам чытае:

Тут не хочацца ні гаварыць, ні пець—
Нібы к вечнасці прыйшоў у госці.
Можа, гэта той курган-капец,
Дзе ляжаць паэтаў даўніх косці.
Каб жыццё ўпустую не пралахаць,
Кожны мусіць нейкі храм свой мець,
Дзе не хочацца ні гаварыць, ні пець—
Толькі моўчкі, безгалоса плакаць.
*(Ніл Гілевіч)*

**Багіня Жалю** моўчкі апырсквае дрэва вадой з глінянага гарлача і накіроўваецца да ўваходу ў залу. Услед за ёй ідуць Гусляр, Паэт, Дзяўчына-Памяць, Юнак-Лёс і ўсе астатнія.

Зала запоўнена задумлівай музыкай аргана ці гучаннем жалобных мелодый *(фанаграма).* Стаяць незапаленыя свечкі ля абраза і на дзядоўскім стале. Гудзе тры разы звон. Выходзіць Апавядальніца. Музыка сціхла. Растаў гул звону. Апавядальніца ў белым адзенні, якое сімвалізуе ў беларусаў чысціню памяці.

**Апавядальніца.** Дзяды нашы святыя, радзіцелі, хадзіце да нас вячэраці. Чакаем вас, як і тысячы, і сотні гадоў назад чакалі. Хадзіце на бяседу ціхую, спавядальную ўсе, хто на гэтай зямлі некалі жыў, — і старыя, і немаўляты малыя, і маці, і сёстры, і браты, і бацькі, і людзі чужыя, незнаёмыя. Пагаворымо мы з вамі, дзяды, як спрадвеку ў краі нашым, і вясной на Масленку, і ля магілак на Радаўніцу, і перад Калядамі, і на Сёмуху. Бо як жыве прырода разважна, так і памяць нашая не згасае, асвятляе шляхі наступнікам. Верым, як верылі некалі вы, дзяды нашы, — чалавек не знікае без следу. Душа ягоная жыве ў сусвеце. Гэта тыя, хто адышоў са сцежак

зямных, перадаюць нам розум, дух, традыцыі і вопыт. Гэта ад вас пуцявіны нашыя да дзяцей, унукаў і далей імкнуць.

Дзяды нашыя шаноўныя, завітайце на Асяніны. Мы хаты прыбралі, ручнікі белыя памінальныя павесілі. Чакаем вас. Зла не трымайце, што, бывала, забываліся на вас, не заклікалі на вячэру, магіл не берaглі. Мінае чорны час здранцвення, вяртаемся да ісцін векавечных. Дык дапамажыце, мудрыя дзяды, дайсці нам да святых крыніц вечнасці, каб дзеці не зблудзілі потым.

Для вас мы адчынілі дзверы, вокны, для вас на стол прыбралі, як належыць. Запалім свечку ў жыце, як спрадвеку. Бо нам не жыць, калі не помніць вас.

...Здавалася, у цемры забыцця, у шале адцурання ад народа, калі ад нас ахоўвалі магілы і, кволыя, нявінныя, таптали кветкі, не будзе даравання нам, нашчадкам, што гэтак занядбалі мы святое. Ды вы мудрэй за нас, дзяды. І вось ідзіце спадчыну агледзець. Не надта мы багатыя цяпер, ад гучных слоў аскоміна на сэрцах. І ўсё ж сышліся разам сустрэць вас, пагаварыць пра былое. Сказаць не складна, можа, але чыста, сумленна і аддана вам: мы чуем вашых душаў трапятанне. Чакаем вас і верым.

**Дзяўчына-Памяць:**

Расплакаўся Яся, перад Богам
стаўшы,
Накрыж рукі склаўшы:
«Ах, Божа мой, Божа!
Як на гэтым свеце ўсяго нам мала:
І злата, і срэбра — усё нам
патрэбна.
А на тойма свеце нічога не трэба».

(Уступае скрыпка.)

**Юнак-Лёс** *(пераймае яе думку).*

А толькі трэба сажань зямлі
ўдоўжкі,
Ды чатыры дашчуркі
І дваццаць лакцёў плацця —
І ўсё наша багацце,
А жоўтыя пяскі — усё наша
наміцце.

*(З народнага)*

**Юнак-Лёс** *(заклікае дзядоў).*

Прыхадзіце, дзяды-радзіцелі,
І старыя, і малыя,
Хто на етай сялібе жываў,
Хлеба-солі ядаў.
Прыхадзіце, дзяды-радзіцелі,
К свайму сталу, к нашаму
прыпечку.
Хлеба-солі засылайце,
Каб было чым душы памінаць
Год ад году,
Век ад веку.

**Юнак-Лёс** запальвае свечку ў зерні.

**Дзяўчына-Памяць** атуляе яе далонямі, каб не згасла, затым налівае ў чарку гарэлкі, кладзе лусту хлеба, адкладае лыжку з куццёй для дзядоў на талерку, а з місай ідзе між радоў. Усе бяруць куццю рукамі.

«Выходзяць» павольна і нячутна дзяды — постаці ў белых, можна празрыстых, апранках, летуценныя і тонкія...

Пакуль «ідуць» дзяды, аднекуль здалёку чуецца голас (можна фанаграмны), які нібы пераадольвае ціхае гучанне музыкі.

Бывае так: жыве чалавек на зямлі, прырос да яе. Ходзіць штодзень па травах. А нібы... на іншай планеце знаходзіцца. Клічуць яго залётныя вятры, зманьвае чужы голас. Душа без кораня?

Нямее чалавек у гаманкім свеце. Роднага слова адцураецца. Не матуліна кроў пульсуе ў венах яго?.. Падмяніў нехта песню, што нёс чалавек у свет? Бывае так... Ды не павінна быць.

*(Працягвае іншы голас на фанаграме.)*

Хто я — дзівак, бяздомны, як месяц? Чаго хаджу па свеце нястомна? Што шукаю на сцяжынках глухіх, між муроў зруйнаваных і вежаў, між насыпаў курганных і гарадзішчаў? Хто я — прышэлец з глыбіні вякоў? Што магу аддаць людзям?

Сэрца маё трапяткое б'ецца суладна з зямлёю. Мова мая — дыханне спрадвечных бароў. Думка мая заблукала ў таемных нябёсах.

Існасць мая — знітаванне з радзімаю цёплай...

Маю я Космас, Зямлю і руплівую Памяць, што з продкамі лучыць, шукае нашчадкаў. Маю я свету бясконцасць і прыгаршчы мараў. Маю надзею. Да грудзей прытуляю Гісторыі птаха...

*(Гучыць песня ці журботная мелодыя скрыпкі.)*

Спявае-галосіць Спявачка. Выходзіць Паэт і гартае кнігу Гісторыі. Пасля кожнага прачытанага сказа тры разы гудзе-стогне звон.

**Паэт.** Старонку за старонкай мы перагортваем кнігу нашае Памяці, летапіс Гісторыі нашай.

*(Доўгі працяглы гул званоў.)*

...палае зьніч на Перуновым капішчы...

...на Нямізе снапы сцелюць галовамі...

...над Дзвіною, у Полацку, Сафія плыве, нібы карабель...

...на Наваградскіх пагорках вырастаюць суровыя вежы...

...лес дзідаў і харугвы з пагонямі калышуцца на Грунвальдскім полі...

...у вуніяцкіх храмах загучала родная мова...

...суседзі-дабрадзеі апанавалі нашым краем...

...у паўстанцкія шыхты па чарзе ўслед за бацькамі ўстаюць дзеці, унукі...

...надыходзіць час Адраджэння, зарунела нашая ніва...

...свяціў час нам разам, талакой, збіраць ураджай, ды грымнулі сусветныя войны-землятрусы. Папялішчамі задыміліся Хатыні, калючым дротам ашчэрыліся Курапаты...

...перасохлі крынічкі, не чуваць пошуму векавечных дуброў.

Чарнобыльскім шляхам зноў едуць паязджане...

...храм стары зруйнавалі, абразам нягледзячы ў твары...

...Вось, нарэшце, схамянуліся людзі, сабраліся дзядоў спамянуць, падзячыць ды пакаяцца...

*(Сяржук Вітушка)*

**Апавядальніца** (перад тым, як моладзь назаве імёны).

У кожнай сям'і берагуць-шануюць памяць пра сваіх дзядоў. Але мы, беларускі народ, — адна вялікая сям'я. І злучае нас у гэту вялікую сям'ю памяць пра нашых дзядоў.

У чуйнай цішыні па краях залы павольна ўстаюць па чарзе юнакі і дзяўчаты ў белым адзенні, кожны з іх называе імя славутага дзеяча Беларусі з любога адрэзку часу нашай гісторыі, як можа заглыбіцца ўдзячная памяць, і да сённяшніх дзён.

**Дзяўчаты і юнакі** *(па чарзе.)*

**Легендарныя волаты:**

— князь радзіміцкі Радзім, князь дрыгавіцкі Тур, князь крывіцкі Рагвалод, князёўна Рагнеда;

— Ефрасіння Полацкая ды Кірыла Тураўскі;

— вялікі князь Вітаўт;

— Леў Сапега, Кастусь Астрожскі;

— Францішак Скарына, Пётра Мсціславец, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі;

— Тадэвуш Касцюшка, Адам Міцкевіч, Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч;

— Алаіза Пашкевіч, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч;

— Вацлаў Ластоўскі, браты Луцкевічы;

— Цішка Гартны, Алесь Чарвякоў;

— Ларыса Геніюш, Уладзімір Караткевіч;

— Яўгенія Янішчыц, Міхась Дубянецкі.

(Юнак ці дзяўчына, называючы імя славутага дзеяча, адданага патрыёта Радзімы, запальвае свечку. Успыхвае шмат агеньчыкаў памяці. Свечкі павінны быць загадзя пастаўлены на стале ў падсвечніку.)

**Апавядальніца.** Памаўчым хвіліну. Памянём бацькоў і маці, дзетак-немаўлят, братоў, сясцёр, каханых і сяброў, і змагароў за нашу волю, і нявінных ахвяр. Памянём дні чорныя, гады, калі паміралі — гінулі... ад куль, ад здрады, ад маны ці зла, ад Чарнобылю скрушнага. Паслухаем іх душы.

*(Хвіліна маўчання.)*

**Юнак-Лёс.**

Крычыць маўчання хвіліна.
А мы ўсё ніяк не злічым —
Пульсуе зямля пад намі.
Мы мяккай зямлі ім зычым.
Ці ж лёгка пад дзірванамі?

*(Нэлі Тулупава)*

(Гучыць тужлівая песня-балада пра зямлю — людскі прытулак.)

**Дзяўчына-Памяць** *(пасля паўзы і звону).*

Сонейка яснае на небе, узыдзі ў іх непрыглядныя цямніцы хоць адною лучынкаю светлаю, хоць адным тоненькім валаском залаценькім, кропелькаю расы гаручаю, тваім святым агнём, хоць ручайком купальным.

Спавядаецца, жаліцца Дуда.

**Дзяўчына-Памяць.** Мама, мама, рукі твае ў барознах маршчынак, з дрыготкімі жылкамі, рукі твае шурпатыя, ды такія ласкавыя... прытаміліся, сцішыліся, як ластаўкі ў дождж. Мама, мама, вочы твае прытушылі слязінку і знерухомелі... І толькі ў гаі, як радзімка, бугарок...

**Юнак-Лёс.**

Спі, родная.
Ты мала спала.
Ты неспакойна спала на зямлі,
дзе мала цішыні і ладу мала,
і сны твае трывожныя былі.
Спі, родная.
Ты мала спала.
Дзяцей прыспіш — сама усё не спіш.

**Паэт-Вяшчун.**

Спі, родная.
Ты мала спала.
Ты з дня у дзень і з году ў год
рук не складала —
мала спала,
нас гадавала —
мала спала,
была навала —
мала спала,
навала мінавала —
мала спала...
Ты знала больш бяссоніц і турбот.
Тваім спакоем мала даражылі.
Ты старажыла сон усёй зямлі,
а твой, а матчын сон не сцераглі.
Спі, родная. Ты мала спала.

*(Анатоль Вярцінскі)*

Ізноў галосіць Дзяўчына-плакальшчыца (ці гучыць запіс галашэння) па мужу, брату... Добра, калі прагучыць паўстанская ці рэкруцкая песня.

**Паэт-Вяшчун.**

## КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ

Вочы на свет закрываць не трэба—
Ёсць у прыроды туманныя дні.
Вось і завешчаны далеч і неба,
Як праз ваду — вечарамі агні.
Што вы, туманы, у сваім вар'яценні
Так замуцілі вякі і гады
І на прастор наш барвова-асенні
Зноў нацягнулі далёкай бяды?
Зноў я адкінуты вамі, туманы,
У перабыты бязлітасны час.
Стук?
Гэта быццам бы бой барабанны.
Крык?
Перад сконам, паўстанцы, да нас!
Скончана ўсё. Так паспешна ў лёхах
Світку мужыцкую здзёрлі з плячэй.
Гэтыя ж тут, недзе блізка, патроху

Гаснуць без жалю любімых вачэй.
Воды сцюдзёныя, гнуткія кладкі—
Трэба палотны бяліць.
Я не кравец, не шавец аніякі,
Трэба кашулі смяротныя шыць.
Голас ад гора дрыжыць і нямее—
Трэба ісці галасіць.
Я і магілы капаць не ўмею—
Мёртвых жа трэба ў дол апусціць.
Толькі ідзі, ідзі і не падай.
Доўга туман над зямлёю стаіць.
.......................................................
Сходзяць туманныя дні з лістападам.
Сонца праглянула...
Жыць!

Вось далакоп, і шавец я, і столяр...
Доўга стаялі туманныя дні,
Твар мой збялеў ад жалобных застолляў,
І зледзянелі пагляду агні.
Столяр, калыскі на шчасце майструю
Для немаўлятаў усіх.
Я і шавец, і абнову любую
Шыю для святаў зямных.
Вось я рыдлёўкаю грунт наш капаю—
Дрэўца, хлапчук, пасадзі.
Вось я і сумную песню спяваю
Там, дзе нядаўна блудзіў.

*(Рыгор Семашкевіч)*

Вакаліз-галашэнне. Дзяўчына-спявачка плача-галосіць на працягу гучання верша. А потым набірае моц урачыстая духоўная мелодыя.

Выходзіць **Паэт.**

Нас трамбавалі ў жальнікі-равы.
Сырым пяском нам засыпалі вочы.
Мы прараставі дзідамі травы.
Лістотай шапацелі мы прароча.
Крывёю захлыналася зямля,
сляпых ахвяр прымаючы ва ўлонне.
Наступнікі! Вам цяжка адбаляць
пакуты нашы ў жудасным палоне.
Гудуць хваіны ў ямах, як сурма.
Канваліяў званы па нас галосяць.
Мы — у прасторы, ў часе. Нас няма.
А вецер стогны па Сусвеце носіць.
Нашчадкі нашы! Адрачоны род!
Замольваем з-пад шыбеніцы веку:
каб зведаў волі змучаны народ,
засейце памяццю дзірван палетку.
Ды запаліце свечку на памін:

няхай агонь пабораецца з ветрам.
...Край, дараванне нашае прымі —
спакоем дыхае зямная нетра.

*(Антаніна Хатэнка)*

Плача Жалейка. Багіня Жалю выходзіць з пукам зёлак. Выконвае магічны языцкі вакаліз. Мелодыя паволі заціхае. Жаля велічна абыходзіць «покуць», абкурваючы яе зёлкамі, прыгаворваючы: «Зара-заранiца! Чырвоная агнявіца! Узыдзі над зямлёю сунічнай. Асвяці імёны іх чыстыя, бязгрэшныя, вечныя! Лёс іх ахвярны!

Царыца-вадзіца! Светлая крыніца!

Красная дзявіца! Коцішся ты, вадзіца, па днях, па начах, па вячэрніх зорах, з-пад крутых гор, з-пад жаркага сонца, з-пад яснага месяца, з-пад латыра камня, па тонкіх жылах, марскіх сілах. Падмываеш ты крутыя берагі, жоўтыя пяскі, калоды валяныя, траву шаўковую і вымываеш сырое карэнне, белае каменне. Ачышчаеш цароў, каралёў і ўвесь народ высокі! Абмый, зажыві боль зямелькі нашай пакутніцы. Вадзіца-царыца! Зямная і нябесная! Вылекуй боль неспатольны!»

Грае задуменна гусляр. Сівы Стары разважна чытае:

...Смерць ашалела волатаў касіла.
Імшэлі пні. Світаўся маладняк.
Увесну продкі дыхаюць з магілаў.
Усходзяць думкі іх жывою сілай
у спавівальні будучага дня.
Заснула хата. А старыя гуслі
зажурана пра вечнае гудуць.
...Я на пупышцы раніцы прачнуся.
Пайду гасцінцу тройчы пакланюся—
Адваражу драпежную бяду.

*(Антаніна Хатэнка)*

**Дзяўчына-Памяць.**

...Скавытаў і енчыў нема вецер.
Па-сірочы плакала жаўна.
Чорны воран панаваў на свеце—
трэбная ўладарыла труна.
А планета гушкалася ў зорах.
Нараджала. Песціла сады.
Ноч-зладзейка у прыполе чорным
прыхавала катавы сляды...

*(Антаніна Хатэнка)*

*(Зноў гучыць галашэнне — сіроцкая песня.)*

**Багіня Жалю** *(замаўляе, абыходзячы рытуальны стол, нібы мацуючы кругазварот жыцця).*

Устану я рана-раненька, умыюся бела-беленька, узыду на крутую гару, зірну пад ясную зару. Рукі белы заламлю. Перад матухнай-зямлёй укленчу. Скажу я і сонцу краснаму, і вятрыску буйнаму, і вытоку, і кроне, і караню, і парастку, і зверу лютаму, і чалавеку літасціваму: успомніце!

І месячык ціхі, і зорачкі светлыя — світальныя, вячэрнія — і зёлкі, і птахі пявучыя бачылі: не абмывалі іх і не хавалі. Вачэй не закрывалі, ручак не складалі, не адпявалі. Снапамі падалі яны...

Сляпелі дні і ночы ад чакання. Крывёю цёплай набрыняла поле. Вада ў крыніцы горкла ад слязы. Спынялася дыханне, пухлі ногі, ад роспачы сівелі валасы. Збалела сэрца ад нямой надзеі...

*(Журботна плача скрыпка.)*

**Юнак-Лёс.**

У цішыні напятай душы ўскрэслі,
Зноў растрывожаць сонныя клады...
Чаго прасцей — гісторыю закрэсліць.
Ды паўстаюць з мінуўшчыны дзяды.
І вось ужо акрэсленыя рысы:
Усмешка, вочы, прысак далані...
Да іхняй праўды сёння дакраніся:
Успомні, павініся, памяні!

*(Антаніна Хатэнка)*

(Плыве тужлівая мелодыя скрыпкі.)

**Дзяўчына-Памяць**.

І ўдзень, і ўночы, і світаннем, і на змярканні, і на ўсходзе бяжы, вада— журбы адхланне. Спатоль пякельны боль, народзе! У чыстым полі і ў дуброве, у цёмнай пушчы, у белым гаі ўзыдзі, маё святое слова, на паратунак... Заклінаю!

Бяры святло зямлі, крыніца! Нясі, як кроў жывую ў венах. Знясіленаму дай напіцца. Каб уваскрэсла ў сэрцы вера. Блакіт слязы тваёй, крыніца, няхай адорыць шчодра сонца. Пад ціхі крыж вада бруіцца струменем памяці бясконцым. І маладзік, і поўня, і ветах, і Мілавіца, і Дзянніца! Дабро пашліце людзям свету. Насыпце зорак у крыніцу!

У небе зоркі, у лузе росы, у лесе травы лекавыя — збалелых душаў чуйны Космас, Сусвету клетачкі жывыя!

Дзяўчаты спяваюць канты. Затым — доўгі звон, трывожны і заклінальны.

**Юнак-Лёс.**

Я ведаю:
не вечны шлях жыцця,
Не вечнае знядужалае сэрца.
Яно ў грудзях аднойчы разарвецца.
Я ж ведаю:
не вечны шлях жыцця.
Ды мне не страшна:
нешта застанецца
Пасля мяне ад дум маіх і спраў,
Ад парыванняў, што ў душы сабраў.
Я веру: нешта ў свеце застанецца.
Застанецца
на роднай зямлі грудок.
Застанецца
на роднай мове радок...

*(Генадзь Бураўкін)*

**Дзяўчына-Памяць.**

Мы так яе і называем — братняй.
Гаворыць звычай, даўні і святы,

што паўшыя на полі ратным
і разам пахаваныя — браты.
Што ж, ёсць у гэтым праўды доля.
Яны зляглі ад куль адных.
І ў доле, як у дружным доме,
нішто не падзяляе іх.
Там — цішыня.
Там — мір і згода.
Ляжаць, плячо ў плячо, рады.
Не знае мёртвая прырода
варожасці. Яны — браты.

*(Анатоль Вярцінскі)*

**Сівы Стары.**

Ёсць дзень, калі з вякоў ссівелых
Ідуць, ідуць да нас Дзяды.
А мы, з душою ачарсцвелай,
Каменнем сыплем на сляды.
Нямыя вусны зноў нямеюць,
Сляпыя вочы слепнуць зноў.
Няўжо на сонца выпаўз нелюдзь
І сэрцы вырваў у сыноў?
Няўжо ў грудзях нясём каменне,
І памяць спалена няўжо?
Мы ж самі ў заўтрашніх памкненнях
Памерлі ўжо. Памерлі ўжо.
Мы ўжо Дзяды. Наступных летаў
Няўжо і нас заб'юць сыны?
Жывём без Бога ў дробных сэрцах,
Забылі прашчуравы сны.
І помніць голас немаўляці,
Якога ўзняў на дзіду таць.
Як можна не прывеціць маці,
Як можна бацьку не вітаць?
Як можна? Літасцівы Божа,
Не дай аглухнуць, скамянець!
Мой лёс над безданню варожыць—
Без прадзедаў няма мяне.
Няма мяне, калі няма Учора,
Няма мяне — не будзе Заўтра днець.
...Дзяды ідуць. Дзяды да нас гавораць.
А іх з трыбун крыжуе смерць...

*(Алесь Емяльянаў)*

Плыве песня — гераічна-самотная балада.

**Паэт-Вяшчун.**

Далёкія-далёкія дарогі
Пад хмарнай лебядзінай чарадой...
Іду... Не веру ў д'ябла, ані ў Бога.

Былі б — дык не паднеслі б чары той:
Пакутваць цяжка гневам і журбою,
Ў пустыні марна да пяскоў гукаць.
За край, даўно адвучаны ад бою,
Ад мовы, гонару і языка.
І жыць, як тыя, што вось-вось сканалі,
Але яшчэ не ўпалі ў вечны смерч:
Мозг шле навокал клічы і сігналы,
А цела — у мёртвы лад закула Смерць.
Ў распадзе клетак мозгу, бы ў магіле,
Чуць, як лікуе крумкачоў імша,
Ўсе словы чуць у гневе і бяссіллі,
Пакуль не вернецца ў Нішто душа.
І з горыччу, бы ў сполаху зарніцы,
Убачыць раптам дальнія гады,
Калі нашчадкі ўзвядуць грабніцы
Ўсім тым, каго распялі іх дзяды,
Каго пабілі на стагнах каменнем,
Каго на плаху валаклі з турмы...
Вы, людзі ўсіх наступных пакаленняў,
Ці будзеце у роспачы, як мы,
З сваёй апошняй ледзяной калыскі
Чуць мозг, што марна растае ў агні?
Не трэба. Што нам славы абеліскі?!
Што нам, памерлым, znічы і граніт?!
Калі жадаем мы адной кароны:
Пачуць, як лёсу валяцца муры,
Пачуць, хаця і ў першы дзень па сконе,
Ў згасанні мозгу ярасны ваш крык.
І зразумець, што вы ўзламалі краты,
Апошняй думкай, цяжкай, як свінец,
Што блізка ён, вялікі ваш пачатак,
Што блізкі ён, вялікі мой канец.
І ў водбліску згасальнае заранкі
Апошнім промнем, як лязом нажа,
Пайсці раллёю, мною ўзаранай
Для руні невядомай і жаданай...
Пайсці да вас...
І да свайго крыжа.

*(Уладзімір Караткевіч)*

Ідуць усе чытальнікі.
Выходзіць **Паэт.**

Жылі-былі...
Так пачынаюцца казкі.
Задоўга да нас
людзі жылі-былі.
Справы рабілі,
хацелі любві і ласкі,
ірвалі краскі.
І адышлі, адплылі.

Жылі-былі...
Словы гучаць эпітафіяй.
Жылі-былі.
І адышлі, адплылі.
Толькі над намі
лятаюць іх душы птахамі,
толькі сляды іх
цямнеюць усё на зямлі.
Жылі-былі...
Скончацца нашы краскі,
справы і ласкі,
скончыцца наш час.
Жылі-былі...
Так пачынаць будуць казкі.
І гэтыя казкі
будуць ужо і пра нас.
*(Анатоль Вярцінскі)*

**Сівы Стары** *(сядзіць і прамаўляе).*

Я хацеў бы спаткацца з Вамі
У ціхую сінюю ноч
І сказаць:
«Бачыце гэтыя буйныя зоркі,
Ясныя зоркі Геркулеса?
Да іх ляціць наша Сонца,
І нясецца за Сонцам Зямля.
Хто мы такія?
Толькі падарожныя — папутнікі
сярод нябёс.
Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?»
*(Максім Багдановіч)*

Гудзе Ліра ці плача жалейка, роспачна і спавядальна *(На дудзе без скрыпкі).*

**Юнак-Лёс.** Спагадны свет! Бязмежны свеце! З дажджамі, зоркамі, вятрамі, не дай задзьмуць жыццёвай свечкі — не дай душу зямлі параніць.

Пайду па ўсёй зямлі радзімай, па долах і гарах, і пушчах, і па балотах, і па сцежках, і па карэнні дрэў спрадвечных, па берагах азёр і рэк, пад мройным небам, сонцам вечным, перад паглядам чалавека, пад позіркам нязгасных зораў, зірну на ўсе бакі чатыры, сусвету нізка пакланюся і памалюся на дарогу, што ад мінуўшчыны ў вечнасць радзінным ручнікам спавіта.

**Дзяўчына-Спявачка** пяе песню чыстую, ціхую, маркотную. *(Фанаграмнае гучанне.)*

Зямля-зямелька. Свята сямейка.
Мая надзея. Нясу нядзельна
Гаючы зёлкі.
Малюся сонцу, чырвону золку.

...Святыя вязні сваёй радзімы.
Душа не гасне. Зямля не стыне.
...Мае турботы. Мае трывогі...
Пчаліне — соты. А мне — дарога.
Іду шляхамі між неба й долу.
У светлым храме малю я долі.
Майму народу, маёй Айчыне.
Жывому роду не стлець, не згінуць.
Бялеюць косці — зямля мудрэе.
Гадуе Космас жыццёва дрэва.
Сусвет гукае да чыстых зорак.
Зямля трымае.
Дзіця гаворыць.
...Сын чалавечы. Зямны. Нябесны.
Люляе Вечнасць матулі песню.

*(Антаніна Хатэнка)*

**Паэт-Вяшчун.**

Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край,—
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,
Цвіў гэты белы-белы май,—
Часцей, мой друг, прыпамінай.
Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што ўсё зрабілі—
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Маністы ўвосень на рабіне
І ў росных смолках майскі луг...
Не забывай пра іх, мой друг!..

*(Ніл Гілевіч)*

**Багіня Жалю** *(на фоне ўзнёслага спявання скрыпкі).*

Не раздзімайце, буйны ветры, былінкі кволыя па свеце. Трымай дзяцей, зямная нетра! Гадуй заступнікаў суквецце! Разгушкай голас чалавечы ўвысь, бязмежная прастора! Хай зазірне ў вочы Вечнасць, каб не душыла сэрца змора! Гайдай, зямелька, жытні колас — святую будучыню веку. Круціся, божых летаў кола! Не дай загінуць чалавеку. Не дай спустошыць людзям душы — абераж, кара зямная! Гаючай повязі не рушце Зямлі і Неба! Заклінаю!

Не рушце пругкай ніткі лёсу, вятры залётныя, чужыя... Тут заснавала Вечнасць кросны. Бягуць вясельныя сцяжыны. Жывём. Прадзём спрадвечнай долі жывое прадзіва, святое. Жыццё бярэ вытокі з болю і нараджэнне смерці тоіць... Імкні, світальная Дарога! Надзея крылы развінае. Святла айчыннага парогу не растапчыце... Заклінаю!

Маўклівасць. Цемра. Выходзяць жанчына і мужчына ў чорнай апранцы з чорнымі стужкамі на галаве. У руках яны трымаюць белыя хусты. Здаля гучыць журботнае галашэнне.

**Ён.**

У росах сцюдзёных купаецца ночка.
Зязюля кувае ў самотным гаёчку.
Не спіць белатвары анёл — немаўлятка:
Ягоная доля — над прорваю кладка.
Раскінуты роспачна ў свет ручаняты—
Расхрыстаны крыж. Акрылёны? Распяты?
...Расшчэплены атам. Счаплёныя пальцы.
І свечка ўтрапёная ў чорным палацы.
Хусцінку сціскаюць далоні нямыя.
Над белай зямлёю — чорны дух лейкеміі.

**Галашэнне.**

А мая ж ты кветанька,
А мая ж ты любая,
У чырвона летайка
Ой, цябе на згубу я
Нарадзіла-песціла
Люлянкаю-песняю.
Ножанькі здарожаны,
Ручанькі зняможаны...

**Яна.**

На сорак дзянькоў малітоўна і скрушна
Заплакаць матулі. А ветру загушкаць
Яе галашэнне ў немых цянётах,
Дзе нам паміраці дазволена ўпотай.
Пад зоркай бяды, на глухім небакраі
Чыя памінальная свечка згасае?

**Галашэнне.**

А мая дачушачка,
Пташка-шчабятушачка,
Ягадка няспелая,
Галованька белая.
А мая ж ты красачка,
Зорка мая, ясачка,
Не згасайце, вочанькі,
Проці цёмнай ночанькі.

**Ён.**

Адплакала ў полі тужлівая каня.
Бабуля зямлі саграбла на расстанне
У клуначак белы дрыготкай рукою...
А могілкі дыхалі вечным спакоем.
Ручнік на крыжы, як абраз перад светам.
З радзімы жанчына сыходзіць раздзетай.
Атрутная вопратка кінута долу.
Няма павяртання да крэўнага дому.
Не вецер-блазён яе цела кранецца.

Употайкі ўп’ецца пад самае сэрца
Нялюдскага ладу шалёная куля.
А хто ў белым свеце жанчыну прытуліць?..

**Галашэнне.**

А мае ж вы пальчыкі,
Лёгкія пялёстачкі...
Сонечныя зайчыкі
На русявых косачках.
Донечка-слязіначка,
Яблынька ружовая...
Не аддам сцябліначку
У глухія сховы я.

**Яна.**

За дозы смяртэльныя ў гул дэманстрацый
Якімі рублямі бяздушна заплацяць?
Нашчадкі сляпыя да бездані крочаць.
Крывёй захліпаецца ўночы сыночак.
Крыжуе расстанне маўклівыя вокны.
У гулкім бары грыбнікам не галёкаць.
Развеяўся попел балючых выжарын.
Як свечкі, над краем гаротным Стажары.
...Зжаўцелае цела на жоўтым услоне.
Падбітымі птушкамі ўпалі далоні.
А хто ж уратуе, суцешыць, заслоніць?
Бязлітасна трэбы збірае плутоній.

**Галашэнне.**

А маё ж ты сонейка,
Нашто закацілася?
На зямельцы цёмненька
Без цябе зрабілася.
Ой, з якога полечка,
Любая зязюлечка,
Галасок твой тоненькі
Мне чакаць адкулечка?

*(Усе ўкленчваюць.)*

**Ён.**

Мая ж ты зямелька, сляпая вязніца,
А я ж над табою — вярбінаю ніцай.
Страчала Дзянніцу, вяла Мілавіцу.
Бывала, што сіл не ставала хрысціцца.
Стаіць на кладах адзінока капліца—
Не будзе каму за памерлых маліцца.

**Яна.**

Ой, кінуся ў свет, як у лютую пельку,
Выгнанніца любай святое зямелькі.

Іду немінучым чарнобыльскім шляхам...
Не сэрца — вуголле пякучага жаху.

**Галашэнне.**

Паявіся, дочачка,
Пташка адляцелая,
Хоць у небе кропачкай,
Зоранькай нясмелаю...

*(Фрагменты з паэмы Антаніны Хатэнка)*

Трывожна, роспачна гудзе звон. Гучыць малітва *(фанаграма царкоўнага хору).* Людзі ўстаюць. Удзельнікі вечарыны ідуць у залу з запаленай свечкай, ад якой усе прысутныя запальваюць агонь Памяці. Граюць Скрыпка і Ліра вечную мелодыю памяці і суму. Юнакі і дзяўчаты з кветкамі падыходзяць да партрэтаў гістарычных дзеячаў. Дзве дзяўчыны абыходзяць залу з памінальнымі хлябамі на ручніках, кожны з прысутных адломвае кавалачак хлеба. Потым Апавядальніца бярэ хлеб на ручніку, адносіць да дзвярэй ці вакна са словамі: «Ідзеце, Дзяды, з Богам, да наступных Дзядоў», якія паўтараюцца тры разы.

Пяе царкоўны *(камерны)* хор *(або фанаграма).*

Выходзіць Апавядальніца, прапануе занесці ў кніжку-памінальніцу дарагія імёны.

Гудзе і растае ў цішыні звон.

Юнак-Лёс і Дзяўчына-Памяць раздаюць усім лісты з тэкстам і нотамі песні-малітвы *(прыкладаюцца да сцэнарыя).* Малітву пяюць усе разам.

Гучаць паданні, гераічныя песні *(па выбару).*

* * *

На нягоды жыцця не жальцеся.
Не было б перамог без нягод.
Нараджайцеся, нараджайцеся
Кожны месяц і кожны год.
У вачах любімай дзяўчыны,
У вачах суседзяў, сяброў.
У вачах прафесараў чынных
І забеганых дактароў.
І ў шырока раскрытых дзіцячых
Вачанятах.
І ў плыткай вадзе.
Не старэйце, людзі, дачасна,
Нараджайцеся кожны дзень.

*(Пімен Панчанка)*

### Малітва

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларусяй ціхай і ветлай

расcып праменне Свае хвалы.
Дай спор у працы будзённай, шэрай,
на хлеб штодзённы, на родны край.
Павагу, сілу і веліч веры
у нашу праўду, у прышласць — дай!
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!

*(Наталля Арсеннева)*

## *ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ*

...Дзяды — свята продкаў, не звязанае з сонечным культам, прыпадала на восень, менавіта на 1 лістапада. Дзісненскія крывічы ўрачыста абходзяць двое Дзядоў: веснавыя — Наўскі Вялікдзень і восеньскія — Вялікія Дзяды. Наўскі Вялікдзень, веснавыя Дзяды, пасвячаецца толькі наўцам, гэта значыць новапамерлым (бацькам, братам, сёстрам, дзецям), а Вялікія Дзяды пасвячаюцца цэламу роду, як толькі можа сягнуць памяць людская, і ў гэтым ёсць істотная розніца паміж веснавымі і восеньскімі Дзядамі.

Даўней восеньскія, Вялікія, Дзяды абходзілі не паасобнымі сем'ямі, а родамі. Аб такіх родавых памінках апавядаў мой бацька, за якога яшчэ памяццю, у 1840-ых, 1850-ых гадах спраўлялі гэткія памінкі на Дзісеншчыне: Вангіны, Сарокі, Шышкі, Рублеўскія, Рымшы, Дзямідовічы і іншыя. На гэткія Вялікія Дзяды збіраліся надзвычай у дом найбагацейшай з роду сям'і ўсе дарослыя родзічы — кожны са сваімі прыпасамі, і за агульным сталом спраўлялі вячэру. Вячэра пачыналася агульнымі малітвамі і спевамі за памерлых, якія прыпісвала царква. Скончыўшы малітвы, найстарэйшы з роду першы ішоў за стол і, запаліўшы абрадавую свечку, якая дагэтуль стаяла ўткнутая ў карцы, напоўненым збожжам, гаварыў стоячы: «Святыя Дзяды, просім за пачэсны стол!» Пасля гэтага забіралі па старшынству месцы за сталом усе пры тым бытныя. Абрадавыя на Дзяды стравы — гэта юшнік з крыві, вараны з мясам, каўбаса і аладкі. Размова за сталом вялася выключна аб памерлых дзядах, гэта значыць — продках роду. Пачынаў яе найстарэйшы ў родзе пасля першай чаркі, якая ішла ўкругавую, звычайным чынам, што першага прашчура роду нашага было імя такое-та, жыў ён там-та, вызначыўся тым-та і г.д. Далей гаварылі аб бліжэйшых продках аж да апошніх. Пасля вячэры размова цягнулася да «трэціх пеўняў», апавядаліся прыгоды, характары продкаў, радавыя і звязаныя з родам успаміны і легенды.

Падобна вышэйзгаданым дробнашляхецкім Дзядам, праводзіліся Дзяды і ў сялянскіх родах, толькі з большай прымешкай паганскіх перажыткаў. Гэтак рашчынялі напярэдадні Дзядоў хлеб, і пяклі яго абавязкова на сухіх лістах; калолі парсюка на дзень Дзядоў, і ўрэшце вечар прысвячаўся гутаркам аб жыцці продкаў.

За маёй памяццю, у 1880-ых, 1890-ых гадах, ужо ў Дзісеншчыне не святкавалі Дзядоў родамі, а толькі сем'ямі. У маёй сям'і гэта адбывалася

такім парадкам. Напярэдадні Дзядоў з самай раніцы жанкі прымаліся за капітальную чыстку хаты і ўсіх гаспадарскіх статкаў. Вечарам уносілі дзяжу, ставілі яе на крыжох, сярод хаты, пакрывалі чыстым абрусам і садзіліся за стол вячэраць. У час вячэры лічылі дзядоў, гэта значыць прыпаміналі ўсіх памерлых продкаў. У нас налічалі іх да 30. Пасля вячэры расчынялі дзядоўскі хлеб і на другі дзень пяклі столькі боханаў, колькі налічылі дзядоў. Раніцай ехалі ў царкву і там раздавалі баханкі ўбогім, кожнаму па адной. Велічыня баханкаў залежала ад заможнасці сям'і: сем'і багатыя пяклі вялікія баханкі, а бедныя абмяжоўваліся «бондачкамі» з кулак велічынёй. На вечар былі запрошаны бедныя з суседства, чалавек да 10, і пачыналася за агульным сталом вячэра. На вячэру прыгатаўлялі юшнік з крыві, а ў гады, калі не калолі на Дзяды падсвінка, то клёцкі з «душамі», гэта значыць, з завернутымі ў цеста скваркамі, і аладкі з верашчакай або замест аладкаў каўбасы з сырой капустай і на заканчэнне саламатка, гэта значыць, сушаныя яблыкі, грушы і ягады, вараныя на мёдзе, або замест «саламаткі» аўсяны кісель з мядовай сытой. Варылі на вячэру больш, чым было трэба: і рэшткі мяса, аладак і інш. дзялілі паміж беднымі: кожны вяртаўся дадому з клункам, у якім заўсёды акрамя ўсяго іншага была пара каўбас.

Перад вячэрай маліліся з малітоўнікаў па памерлых, а пасля вячэры, пасядзеўшы і пагутарыўшы на пахавальныя тэмы сям'і, разыходзіліся.

З пераказаў майго бацькі, чутых ад дзеда і старых людзей яго пакалення, з днём Дзядоў звязвалі яшчэ адзін цікавы абрад — гэта ўпісванне і выпісванне з сямейнай кронікі членаў сям'і. Новананароджаных упісвалі, а памерлых выпісвалі. Кронікі гэтыя вяліся на бэльках хаты ў пачэсным куце.

*(Крывіч. 1927. 12, с. 66-69.*
*Зап. у Дзісненскім п.)*

## ДЗЯДЫ, АБО ПАМІНАЛЬНЫЯ АБРАДЫ

...Багата ў якіх мясцовасцях існуюць яшчэ дахрысціянскія жалобныя абрады. На Піншчыне, хоць і часткова, яны захаваліся і па сённяшні дзень, іх адзначаюць у лістападзе пад назвай Дзядоў. Ужо нават сам лістапад прыносіць разважлівыя думкі пра тое, у чым выяўлялася жыццё і што на нашых вачах перастала быць жывым: на палях востра тырчыць адно толькі ржышча пажатага збожжа; ні тут, ні ў лесе не чуваць болей песень; ні на дрэве, ні пад ім не напявае пастушок, пажоўклае і пачырванелае лісце аблятае з калісьці зялёных вершалін і смутна ўсцілае ўзгалоўе паміраючай прыроды на зімовы сон. Толькі часам пачуеш галасы адлятаючых жураўоў, смутныя, як пахавальны плач. Хмура і панура: не відаць сонца, ад нябёс да зямлі навісла густая імгла. Толькі доўгім вечарам і ўночы праясняецца неба полымем зарыва, ці то ад смаляных печаў, ці то ад агнёў, рассыпаных далёка па балотных травах. Можна сказаць, што гэта зарыва, запаленае пры пахаванні прыроды. У сялянскія двары плённая восень натрэсла з поўнага рога і зерня і гародніны. У сялянскіх хатах спакойны, добры дух; сяляне маюць час успомніць пра сваіх продкаў, якім яны абавязаны жыццём, бадзёрым здароўем і ўласным набыткам, якія і Бога хваляць, і жыць на

свеце іх навучылі; цяпер яны маюць час адплаціць доўг удзячнасці душам сваіх продкаў, дзякуючы абраду ў гонар памяці, і спраўляюць Дзяды.

На Піншчыне напярэдадні Дзядоў, альбо вячэры для памерлых, гаспадыні старанна прыбіраюць свой дом, усю рухомую маёмасць, расстаўляюць па кутках усе гаспадарчыя прылады, каб тыя не заміналі ў хаце духам, што збіраюцца прыйсці сюды на бяседу. Назаўтра амаль усёй сямейнай грамадой ідуць на могільнік, падаюць на магілы, плачуць уголас і моляцца за сваіх памерлых. Вярнуўшыся дадому, мітусяцца ў падрыхтоўцы да памінальнай вячэры, і да самага яе надыходу на працягу цэлага дня ніхто нічога не есць. Вечарам засцілаюць стол белым абрусам, пасярэдзіне яго запальваюць гарэлку для нагадвання пра пякельнае полымя (...), кідаюць соль на распаленае вуголле, каб пачуць мову яго таямнічага трэску. Асвяціўшы стол васковай свечкай, ставяць на яго боб ці гарох з мядовай сытай, поліўкамі з рыбы і мяса — кіслымі і прэснымі, смажанай саланінай, аладкамі, яечняй з каўбасамі, кашай прасяной ці грачанай, малаком макавым і кіслым. Пасярод страў ставяць на стале булку хлеба і нарэзаным хлебам ці малымі боханамі абкладаюць вакол стала так, каб тры булачкі былі ў рад адна каля другой, на пачэсным месцы стала. Тут жа, каля гэтага пачэснага месца ці на покуці, вешаюць драўляную шабельку і пры ёй (калі няма кап'я) качаргу, у выпадку, калі хтосьці з гаспадароў служыў у войску. Прыгатаваўшы багатую для продкаў вячэру, каб іх духі ў колішнім іх доме шчодра прыняць і ўсім дагадзіць, адчыняюць вокны і дзверы, старэйшыя з сям'і абыходзяць дом навокал, моляцца, паглядаючы ў бок могільніка, і запрашаюць памерлых. Вярнуўшыся ў хату, у цішыні садзяцца воддаль стала і прыглядаюцца да ўяўнай бяседы духаў. Калі, па разуменню гаспадыні, духі нарэшце насыцяцца, яна падае знак, гаспадар садзіцца за стол і запрашае сям'ю і астатніх вячэраць. Гаспадар пачынае першы, зачарпнуўшы ад сыты з бобам або гарохам, ці так званай куцці, і першыя яе лыжкі адлівае для памерлых у асобную пасудзіну; за ім тое ж робіць гаспадыня, потым пачынаюць есці ўсе астатнія. Такім жа чынам гаспадар з гаспадыняй адліваюць духам і частку з усіх іншых страў. Яшчэ некалькі дзесяткаў год назад падчас святкавання Дзядоў завязвалі вочы смялейшай і спецыяльна выбранай для гэтага дзяўчыне ці жанчыне і саджалі яе на слуп, укапаны ў падлогу каля печы. Гэта жрыца, цэлы дзень перад тым не еўшы, прыглядалася да душ, якія ўваходзілі ў хату, стараючыся пазнаць у іх сваіх знаёмых і родных; бачыла ў сваім уяўленні, як душы далёкіх сваякоў і сяброў дружалюбна набліжаліся да тых, хто сядзеў за сталом, палохалася выгляду постацей душ, не вядомых яе дому, і чужых, і абцяжараных пракляццем за крыўды і прысваенне чужога. Убачыўшы постаці гэтых непрытульных агрэсіўных душ, жанчына палохалася, часам страціўшы прытомнасць, валілася на зямлю, палохаючы тым самым астатніх.

*(Зянькевіч, с. 111—113.*
*Зап.у Пінскім п.)*

## *СВЯТА МЛЫНАРОЎ*

**25 кастрычніка (12 кастрычніка па с.ст.) — дзень Марціна, свята млынароў.**
**11 лістапада (у беларусаў-католікаў) — Марцін, свята млынароў**

У беларускім народным календары знайшлося месца і для свята млынароў. Праца млынара звязана з жытам, пшаніцай, мукой, хлебам. А для селяніна жыта, хлеб — гэта аснова дабрабыту, бязбеднага існавання сям'і. Сабраны добры ўраджай, адказная праца закончылася, трэба і аб хлебе падумаць, і млынара ўшанаваць, каб муку добра змалоў. Можна і павесяліцца!

Тэму і задачы заняткаў неабходна вызначаць у залежнасці ад узросту дзяцей. Так, у дзіцячым садку і пачатковых класах яны могуць будавацца на аснове вывучэння беларускіх народных казак: «Два камені» (Людзей слухай, а свой розум май). Апрацоўка А. Якімовіча. — Мн.: Юнацтва, 1988. С. 55 — 56), «Як мельнік чорта надуваў» (Беларускія народныя казкі. 2-ое выд., дап. Склад. Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. — Мн.: Навука і тэхніка, 1986. С. 475 — 477) і іншых.

Заняткі могуць праводзіцца наступным чынам: разгадванне загадак, кароткае знаёмства са святам млынароў; прагляд ілюстрацый з відамі розных млыноў, іх апісанне і прызначэнне; работа над тэкстам казкі.

План заняткаў у сярэдніх класах больш складаны. Ён можа насіць камбінаваны характар. У план уключаюцца: шырэйшае знаёмства з млынамі, іх гісторыяй; успаміны дзяцей аб прачытаным; сцэнічнае выкананне старажытнай гульні «Млын»; развучванне народных танцаў «Млынок», «Мельнік»; канструяванне і выраб з паперы, дрэва макетаў старажытных пабудоў; наведванне музеяў побыту беларусаў (агляд жорнаў і млыноў, калі ёсць такая магчымасць).

Вучні сярэдніх і старэйшых класаў вызначаюцца самастойнасцю ў падрыхтоўцы да тэматычных заняткаў. Форма іх правядзення — лекцыя ў



спалучэнні з гутаркай. Па даручэнню настаўніка школьнікі могуць самастойна рыхтаваць асобныя тэмы, з якімі потым выступаюць: Лексічнае значэнне паняццяў «жорны», «млын», «вятрак» (работа са слоўнікамі). Гісторыя ўзнікнення і развіцця млынавой справы. Адлюстраванне млыноў у старажытных дакументах. Гісторыя беларускіх млыноў. Архітэктура і пабудова. Млыны ў беларускім фальклоры.

Многае патрэбнае пры падрыхтоўцы да свята млынароў настаўнікі і выхавацелі знойдуць у дадатковых матэрыялах.



## *«Круціцеся, жорны...»*

*(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў)*

Настаўнік расказвае пра свята млынароў (гл. дадатковы матэрыял) і паказвае малюнкі млыноў.

— Як жа мелецца мука?
— Што такое жорны? А жоранцы?

(Добра, калі ёсць магчымасць паказаць жоранцы або на малюнку жорны.)

— Паслухайце, калі ласка, казку «Два камені» (гл. дадатковы матэрыял).

Праводзіцца гутарка па казцы.

**Дзяўчынка.** Адзін дзед ніколі не наесца! Хто гэта?
*(Млын)*

Крыламі махае, а ляцець не можа.
*(Вятрак)*

Круціцца, верціцца цэлы век, а не чалавек.
*(Млын)*

Трасецца, калоціцца, аб усім свеце клапоціцца.
*(Жорны)*

Выконваецца танец «Млынок» (гл. дадатковы матэрыял).
Інсцэніруецца ўрывак казкі «Як мельнік чорта надуваў» (гл. дадатковы матэрыял).

**Дзяўчынка** да інсцэніроўшчыкаў. Мялі Ямеля — прыйшла твая нядзеля.
**Адзін з іх.** Добрыя жорны ўсё перамелюць.
**Дзяўчынка.** З музыкі ды млынара не будзе гаспадара.
**Хлопчык.** Кожны млын на сваё кола ваду лье.

**Дзяўчынка.** Круціцеся, жорны,
З'едзен хлеб наш чорны:
Крысін і Марысін,
Грунін і Анісін,
З'едзен і Пятроў хлябок.
Намялі на іх, дзядок.

Гульня ў «Млын». Інсцэніроўка песенькі «Заінька шэранькі» ці «Чорны баран».

## *ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ*

**Млын** — á, *м*...

2. Прадпрыемства, на якім мелюць збожжа; будынак з устаноўленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу збожжа. *Паравы млын. Ветраны млын.*□*На беразе Марачанкі сярод поплаву відна была будыніна — вадзяны млын.* Лобан. *Рачулка чыстая з-за млына. Цячэ праз травы і камлі.* Лось.

◊ *Ліць ваду на млын каго, чый.*

(Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 3. 1979. С. 166.)

**Млін,** *м.* **Млын.** *На Рыччы млін такій, шо робіць муку белу-белуптлёванку.* (Тураў.) *У войну не було мліноў, а булі жорна.* (Луткі.) *Морэ Морыйське, болото Пінське, сто коней цягне, адзін жэрэбец стогне* (загадка). *Млін* (адгадка). (Хачэнь). *Меле, як пусты млін* (пра балбатуна). Старажоўка.

(Тураўскі слоўнік. Т. 3. 1984. С. 83.)

**Млынище,** –а, с. ср. Мѣсто, где была мѣльница. Кони на мѣльниць ходюць.

(Словарь бѣлорусскаго нарѣчія, составленный И. И. Носовичем. Спб, 1870. С. 236.)

**Вятра́к,** ветрака́, *м.* Ветраны млын. *Па адзін і па другі бок вёскі стаялі ветракі, як страшыдлы, шырока раскінуўшы свае крылы.* (Колас.)

(Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 1. 1977. С. 604.)

**Жорны** -аў; *адз. няма.* Ручны млын, які складаецца з двух гладка абчэсаных круглых камянёў, пры дапамозе якіх зерне перацiраецца на муку. *Маня з мачыхай перасявалі пшанічную муку на пірагі к святу і дамалвалі высеўкі ў жорнах.* (Васілевіч.)

(Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. 1978. С. 258.)

**Жо́рван,** *м.* Жорны. *Жорван — мельніца, што рукамі круцяць.* Ручаёўка. *Трэба свінням жыта змолоць на жорван, а то ў мельніцу нема чо́го везці.* Чаплін.

(Янкова Т. С. Дыялектны слоўнік Лоеўшчыны. 1982. С. 116.)

**Млён,** *м. Ручка, якой круцяць камень у жорнах.* Тураў.

(Тураўскі слоўнік. Т. 3. 1984. С. 83.)

**Жорны, жерна, жорна,** *наз. Жорны.* Мы толькі жорна и до Матшокголы на млыны даемъ [*Литовская метрика. Книга судных дел. 1903*]; в

него кнегиню взюла... два топоры боты жорны сковородꙋ [*Кніга Віцебскага земскага суда. 1539*]; Тогъды два будуть на рольи, одинъ возьметьсе, а другий оставитьсе. Две мелючие в жорънах, одна возьметьсе, а одна оставитьсе [*«Евангелле» ў перакл. В. Цяпінскага каля 1580 г.*]; подъ дворомъ млынъ зрубъ новый ничымъ не критый, пустый безъ кола и безъ жоронъ [*Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, 1606*]...

(Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Т. 10. 1990. С. 52.)

**Жорновникъ** *наз. Той, хто робіць жорны.* Пан Бутримъ мовилъ: тыи жорновники дають мнъ, тивꙋнꙋ, здавна Въликоденного двадцать и чотыри гроши. [*Литовская метрика. Книга судных дел. 1514.*]

(Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Т.10. 1990. С. 52.)

**Жорны** *(жорна),* толькі мн. *У вайну немяц млін спаліў, то ўсе на жорнах малолі. Ой цяшко круціць той камянь.* Грабава з Зэльвеншчыны.

**Ветраны млын** /архіт./. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі /в. Ляды Жлобінскага раёна. — *А. Л.*/. Пабудаваны ў канцы XIX ст. з дрэва.

Млын шатровага тыпу з 2 жарнавымі паставамі ўяўляе сабой васьмігранную ўсечаную піраміду каркаснай канструкцыі, якая стаіць на драўляным зрубе. Завершаны васьміграниым шатром, які паварочваецца вакол вертыкальнай восі пры дапамозе 2 кансолей. Асновай канструкцыі з'яўляецца магутны слуп — матавіла. На слуп пасаджана кола-шасцярня, што прыводзіць у рух жарнавыя паставы. Цяпер млын мае электрычны прывод.

Ветраны млын — прыклад вытворчай пабудовы.

*А. Ю. Пятросава.*

/Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн.: БелСЭ, 1985. С. 178./

Таксама можна прачытаць пра ветраныя млыны, якія захаваліся: ў в.Заляшаны і перанесены ў Клецк /Збор помнікаў... Мінская вобласць. Кн. I. Мн., 1987. С. 209/; у в. Зелянец Хоцімскага раёна/ Збор помнікаў... Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 347/; у в. Ястромбель і перавезены ў 1935 г. ва Уласы Баранавіцкага раёна /Збор помнікаў... Брэсцкая вобласць. Мн., 1984. С. 95/; у в. Бярозаўка Кармянскага раёна (Збор помнікаў... Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 219).

**Вятра́к,** *млын ветраны,* збудаванне для размолу зерня з дапамогай сілы ветру. На Беларусі В. пачалі будаваць пазней, чым вадзяныя млыны, аднак у XYIII—XIX стст. яны былі паўсюдна. У 1840 г. у Мінскай губ. дзейнічала 795 вадзяных млыноў і 315 в.; у 1860-ыя гг. ў Гродзенскай губ. вадзяных млыноў было 592, конных — 157, В. — 374. У залежнасці ад спосабаў павароту В. да напрамку ветру яны падзяляліся на стрыжнёвыя (слупавыя) і шатровыя.

Стрыжнёвы млын звычайна паварочваўся да ветру ўсім корпусам, меў фундамент з бярвення ці камення, на якім мацавалі крыжавіну з тоўстых бярвёнаў. Апошняя паварочвалася на вертыкальным слупе з дапамогай дышля. Таўшчыня слупа 80—90 см. Рама з брусоў служыла асновай млына. Такая ж рама крыху меншага памеру была і ўверсе. Да іх прыбівалі абшыўку з дошак (часам з дранкі, гонты, шчапы). Прынцып будовы вертыкальнага кола на гарызантальнай восі ўверсе і яго злучэнне з цаўкамі гарызантальнай шасцерні даволі складаны. Вертыкальная вось гарызантальнай шасцерні злучалася ўнізе непасрэдна з верхнім каменнем пастава і прыводзіла яго ў рух. Такія млыны звычайна мелі адзін пастаў. На канцы гарызантальнай

восі мацавалася 4 — 6 крылаў. У зах. і зрэдку ў паўн.-усх. паветах Беларусі сустракаліся невялікія (сядзібныя) стрыжнёвыя млыны (казлоўкі) на адзін пастаў вышынёй да 4 — 5 м. Такі млын абслугоўваў жыхароў аднаго хутара ці нават двара.

Шатровыя млыны больш складаныя і дасканалыя. Па форме яны васьмівугольныя або круглыя. У іх да ветру паварочвалася толькі верхняя частка — шацёр, ці вежа (шапка), дзе размяшчалася гарызантальная вось. Страха двухсільная ці круглая. Шацёр паварочваўся на крыжавіне з дапамогай доўгага дышля — бервяна, якое спускалася ад крыжавіны на зямлю. Нярэдка дышаль складаўся з трох тоўстых жэрдак, сярэдняя служыла стрыжнем, дзве астатнія ахоплівалі корпус шатра з двух бакоў. Унізе жэрдкі мацаваліся разам. Дышаль прывязвалі да аднаго з 6 укапаных у зямлю слупкоў. На канцы гарызантальнай восі мацавалася 4—6, радзей 8 крылаў — доўгіх брусоў, абшытых тоненькімі дошкамі ці дранкай — застаўкамі. У залежнасці ад сілы ветру колькасць заставак на крыле змяншалася ці павялічвалася. На Віцебшчыне крылы часам абшывалі парусінай. Унутры шатра на гэту ж вось насаджвалася вялікае вертыкальнае кола (у сярэднім да 4 м у дыяметры). Яно мела да 100 кулакоў (кліноў) з цвёрдага дрэва (дубу, грабу і інш.). Апошнія злучаліся з цаўкамі меншага ў 6—8 разоў гарызантальнага кола, насаджанага на вертыкальную вось. Вось праходзіла праз памост 3-га паверха (яруса). На ўзроўні 2-га паверха на гэту вось мацавалі ніжняе гарызантальнае кола з 30—40 кулакамі. Яны злучаліся з двух бакоў з цаўкамі гарызантальных шасцерняў, восі якіх мацаваліся непасрэдна да верхніх камянёў. Над кожным з паставаў мацавалі кош для засыпкі зерня. Мяшкі з зернем падымалі з дапамогай блока. Дыяметр літых камянёў 1,5—1,8 м, таўшчыня кожнага каменя каля 40—45 см. На кожным паверсе былі па 2 маленькія акенцы. Дыяметр асновы шатровага млына каля 7—8 м. Кверху млын звужаўся. З бярвёнаў будавалі толькі 1-ы паверх. Там размяшчаліся 2 вялікія скрыні для мукі. Шатровыя млыны ўперамежку са стрыжнёвымі будаваліся на ўсёй Беларусі, але найбольш іх было ў паўд.-ўсх. раёнах. Стрыжнёвыя В. сустракаліся часцей на Брэстчыне і Гродзеншчыне. В. дзейнічалі да сярэдзіны XX ст.

*Л. І. Мінько.*

*(Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. — Мн., 1989. С. 131.)*

**Жорны,** прылада для памолу зерня; ручны млын. Былі каменныя і драўляныя. Каменныя Ж. у Ст. Русі ўжываліся паўсюдна. У Паўд.-Зах. і Паўн.-Усх. Русі іх рабілі з пясчаніку, буйназярністага граніту, вапняку, дыярыту. Складаліся Ж. з 2 каменных дыскаў дыяметрам 35—50 см, таўшчынёю 10—13 см, пастаўленых у скрынку ці станок. Каб мука лепш ссыпалася, паверхню ніжняга каменя рабілі трохі выпуклай, а верхняга — увагнутай, для лепшага размолу зерня рабочая паверхня мела насечкі. Пазней майстравалі больш масіўныя, удасканаленыя Ж. з камянямі дыяметрам 55-70 см, выш. 15—20 см. Ніжні нерухомы камень звычайна быў таўсцейшы, верхні (верхавік) — больш лёгкі; ён меў у сярэдзіне адтуліну для засыпкі зерня, мацаваўся, паднімаўся і апускаўся пры дапамозе паўпрыцы — жалезнай крыжавіны або пласціны, якая круцілася на шпяні, замацаваным у ніжнім камені. Камень прыводзіўся ў рух пры дапамозе доўгага круглага кія (млёна), верхні канец якога ўстаўляўся ў бэльку ці ў адтуліну спецыяльнай планкі, прыбітай да сцяны, а ніжні — у жалезную

скабу на краі верхняга каменя. Сустракаліся Ж. з кароткай ручкай. Шпень прымацоўваўся на спецыяльнай падстаўцы, якую паднімалі і апускалі клінам, каб мяняць вышыню стаяння верхняга каменя і рэгуляваць мліва. Пры адсутнасці камянёў ці пясчаніку жарнавыя паставы рабілі з дубовых калодак, на рабочую частку якіх набівалі веерападобнымі радамі кавалачкі чыгуну або жалеза. Такія Ж. сустракаліся пераважна на Палессі, большасць з іх не мелі паўпрыцы. Формы і памеры станка былі розныя: чатырохвугольны — 80x80 ці 90x90 см (пашыраны па ўсёй Беларусі), круглы — дыяметрам да 80 см (сустракаўся на Палессі і Цэнт. Беларусі), у выглядзе ночваў (ва Усх. і Паўд.-Усх. Беларусі). Яшчэ ў канцы XIX — пач. XX ст. Ж. былі неабходнай прыналежнасцю амаль кожнага сялянскага двара. Стаялі яны звычайна ў сенцах, радзей у хаце або варыўні. За дзень на каменных Ж. можна было змалоць 2—3 пуды зерня. Да 1920-ых гг. значную частку зерня бел. сяляне малолі ў Ж., бо плата за мліва складала дзесятую частку прывезенага ў млын зерня, што для беднякоў было не пад сілу. Ва ўжытку захаваліся да 1950-ых гг.

*Л. І. Мінько.*

*(Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. — Мн., 1989. С. 195—196.)*

## *МЛЫНЫ*

Вадзяныя млыны на Палессі з'явіліся ўжо ў старажытнарускі перыяд. Акты XVI ст. часта называюць аднаколавыя сялянскія млыны вешнякамі. Яны будаваліся не толькі на рэках, але і на балотах. Напрыклад, інвентар 1668 г. апісвае балотныя вешнякі каля Дзівіна (Кобрынскі раён) і адзначае, што яны працуюць тут «згодна даўняму звычаю і павіннасці».

Па прынцыпу работы вылучаліся колавыя і наплаўныя млыны. Колавыя працавалі за кошт энергіі вады і будаваліся ў комплексе з плацінай або запрудай. Наплаўныя размяшчаліся пасярэдзіне рэчкі па палях або паромах — «лодзях», «скрыне». Іх механізмы прыводзіліся ў рух натуральным цячэннем ракі. Галоўным рабочым органам вадзянога млына з'яўлялася кола, якое пры дапамозе валаў і шасцярончатых перадач круціла верхні камень пастава. Акрамя млыноў, якія малолі зерне, вядомы «фолюшы» (сукнавальні) і «тартакі» (лесапільні)...

Млын у Цімкавічах (Капыльскі раён), паводле інвентару 1833 г., уяўляў манументальнае трохпавярховае збудаванне. На першым паверсе размяшчаліся прыёмнае памяшканне і трохкамернае жыллё (хата-сенцы-хата). На другім паверсе знаходзіліся рабочае памяшканне з чатырма паставамі і чатыры хаты з каморамі і сенцамі. Трэці паверх займаў склад збожжа.

У этнаграфічнай літаратуры склалася меркаванне, што ветраныя млыны ў Беларусі распаўсюдзіліся толькі ў XVIII ст. ...

Так, ветраны млын, на нашу думку, існаваў у XVI ст. у Кобрынскім замку, інвентар якога 1597 г. называе «вежу млыновую». «Люстрацыя хлебных млыноў Берасцейскага староства» 1777 г. паказвае, што толькі ў гэтым старостве ў другой палавіне XVIII ст. існавалі 34 ветраныя мельніцы. Значыць, на захадзе Палесся ветраныя млыны ў XVIII ст. былі ўжо дастаткова распаўсюджаныя.

На Беларускім Палессі сустракаліся два тыпы ветракоў: стрыжнявы (козлавы) і шатровы...

*(Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся. XVII—XIX стст. — Мн., 1978. С. 76—79.)*

Цікавымі пабудовамі былі конныя манежы. Звычайна манеж будаваўся ў адным комплексе з пуняй ці гумном. У манежы размяшчаўся механізм, аснову якога складала драўлянае зубчатае кола вялікага дыяметра, звычайна 3—4 м. Гэта кола прыводзілася ў рух запрэжаным канём, які хадзіў па крузе. Пры дапамозе розных прыстасаванняў, выкананых таксама з дрэва, рух ад кола перадаваўся малатарні, размешчанай у пуні ці гумне. Часта кола злучалася з жорнамі, і, такім чынам, атрымліваўся конны млын. Такія млыны былі распаўсюджаны на Палессі, Гродзеншчыне і Наддзвінні. Часцей за ўсё сяляне будавалі адзін манеж на ўсю вёску. У вёсцы Янукі Докшыцкага раёна старажылы расказвалі аб перасоўным манежы, які меў калёсы, і яго перавозілі ад гумна да гумна. Нярэдка манеж прыстасоўвалі і для вытворчасці дранкі...

*(Лакотка А.І., Барыс С.В. Сцежкамі дзядоў: Этнагр. нарысы: Кніга для вучняў. Мн., 1986. С. 70.)*

## *АДМАХАЛІСЯ*

...Час ад часу пад'язджаў пад ветраковыя ўсходні са свайго ці з суседняга сяла вазок з пукатымі мяхамі ў драбінах і худзенькім конікам у хамуце пад вялізнаю крывою дугою. Побач з возікам шлёпаў растаптанымі лапцямі вусаты дзядзька ў шэрай свіце ды круглай шапцы без брыля, не інакш, пашытай з сырамятнай шкуркі з зімовага ягняці. Гаспадар ветліва ручкаўся з ім, кідаў задаволеным зрокам на мяхі ў драбінах і заводзіў прыязныя доўгія размовы. І не без прычыны: гэта ж, глянь, заробак сам у рукі прыйшоў — як не ладны грош, то мерка збожжа пэўная! Дзьмуў роўны ветрык, і вятрак размашыста загортваў яго пругкія паверы сваімі крыламі ды аж тросся ад працавітай натугі. Спявалі колы, гаманілі шасцерні, бурчэлі жорны, і цёк з жалабка ў кораб плаўны струменьчык мукі, як непаспешліва цяклі калісьці дні, гады, дзесяцігоддзі...

Цяжка з упэўненасцю сказаць, калі канкрэтна паявіўся першы на свеце вятрак, але напэўна вядома, што ў другой палавіне XIII стагоддзя ён ужо быў папулярны ў Англіі. У адным з англійскіх рукапісаў, які паходзіць з 1270 года, знаходзіцца найдаўнейшы малюнак ветрака. Яго выгляд нагадвае казачную хатку на курынай ножцы: на даволі высокім слупе змайстравана невялікая будка, каля шчытавога боку страхі якой відаць чатыры крылы, што круцяць вось. Яна, відаць, прыводзіць у рух жорны. У будку можна ўзабрацца па даволі высокіх усходнях — драбінцы. Падобны вятрак ёсць і ў італьянскім рукапісе з XIV стагоддзя.

...Што ж, нашым продкам намнога лягчэй было не шкадаваць нявольнічай ці сваёй уласнай працы або запрэгчы да яе струмень вады, чым скарыстаць з надта ж свавольнай ды наравістай сілы ветру. Таму, відаць, у «Люстрацыях каралеўскіх маёмасцей ваяводства Падляскага» з 1570 і 1576 гадоў аж кішыць ад пераліку млыноў на самых розных рэках, рэчках, рачулках, а нават і ручаях, пра якіх цяпер проста ўспаміну няма, бо яны высахлі. У той жа час зусім не ўпамінаюцца ветраныя млыны...

Затое ў XVIII стагоддзі наступіўшае хуткае развіццё гарадоў і мястэчак і ў сувязі з тым павелічэнне запатрабавання на муку і крупу выклікала даволі хуткае развіццё будаўніцтва ветракоў. Паяўляліся яны перш за ўсё там, дзе

не было ўмоваў пабудаваць новыя вадзяныя млыны. А такіх умоваў было ўсё менш. Непрыхільна да вадзяных млыноў адносіліся памешчыкі, бо розныя млынавыя запруды і сажалкі, падымаючы ўзровень вады, прычыняліся да забалочвання лугоў і палёў. У каралеўскіх маёмасцях на тагачаснай усходняй Беласточчыне разгарнуў актыўную гаспадарчую дзейнасць падскарбій надворны літоўскі А. Тызенгаўз. Каб належна эксплуатаваць лясныя багацці, ён перш за ўсё зрабіў сплаўнымі Нарву, Нараўку, Сакалду, Супрасль і іншыя рэкі. Значная колькасць вадзяных млыноў, размешчаных на іх берагах, у сувязі з гэтым перастала існаваць. Таму ў хуткім часе на пагорках вакол гарадоў, мястэчак, а таксама каля памешчыцкіх фальваркаў пачалі гусцець вяночкі ветракоў. Належалі яны да памешчыкаў, манастыроў або гарадскіх прадпрымальнікаў: уладальнікаў розных мануфактур, купцоў, толькі зрэдку іх гаспадарамі былі незаможныя рамеснікі. Прыгоннае сялянства ў той час ветракамі не цікавілася — увесь свой скупы збор з мізэрных гаспадарачак перамолвала яно ў жорнах. Абы толькі было што малоць!..

Знясенне прыгону яшчэ больш садзейнічала змяншэнню колькасці вадзяных млыноў, затое настаці часы праўдзівага росквіту для ветракоў. Выраслі яны, як грыбы пасля дажджу, на ўзвышшах амаль каля кожнай вёскі, а пры вялікіх сёлах нярэдка было іх па некалькі...

Аднак гэты «залаты век» ветракоў не трываў доўга. Успыхнула першая сусветная вайна, пачаліся зацяжныя пазіцыйныя баі, і ваюючыя бакі заядла знішчалі якраз ветракі, бо яны былі дасканалымі назіральнымі пунктамі, служылі арыенцірамі для артылерыі і г.д. Яшчэ горш давялося ветракам, калі Беласточчыну акупавалі кайзераўскія войскі. Каб сцягнуць як мага болей збожжа ад насельніцтва, немцы пад пагрозай цяжкіх пакаранняў забаранілі малоць яго звыш устаноўленай імі мізэрнай колькасці на душу насельніцтва. Каб не дапускаць да нелегальнага памолу, акупанты знішчалі ветракі, жорны, большасць вадзяных млыноў...

Цікава, што нярэдка незвычайнае майстэрства млынароў выклікала амаль забабонную боязь у людзей. Хадзілі легенды пра іх, як пра ведзьмароў, што трымаюць сувязь з нячыстымі сіламі, часам змушаюць чарцей круціць крылы свайго ветрака, калі няма ветру, або насіць цяжкія мяхі са збожжам ці мукою. А ў прыказцы «Мельнікава карова, дзеўка папова і эканомава кабыла ніколі галодныя не былі» выявілася зайздрасць да мельнікавага жыцця, крыху лепшага, чым усіх іншых у сяле.

Трагічны лёс спаткаў ветракі ў час апошняй вайны. Фашысты, абклаўшы насельніцтва цяжкімі падаткамі... забаранілі малоць звыш устаноўленай імі галоднай нормы, пры гэтым за мліва бралі вялікі збор збожжам...

Некаторыя ветракі служаць яшчэ і цяпер да мліва збожжа на асыпку, як, напрыклад, у М. Бабулевіча ў вёсцы Парцава каля Бельска. Некаторыя майстры-самавучкі прыстасавалі ветраныя млыны да іншых прац, напрыклад, А. Гаранюк з вёскі Кабылянка каля Міхалова — да пілавання бярвенняў на дошкі, А. Савіцкі з Садовага Стоку каля Супраслі — да вытворчасці электрычнасці, а І. Палецкі з Гарбароў у гміне Міхалова — да выточвання розных металічных элементаў і іншых прац.

...Нямала ёсць у беларускім фальклоры твораў, у якіх ідзе гаворка пра ветракі, хоць бы ў такой хітрай загадцы: «На купіне талочыцца, уся яго вера калоціцца», запісанай М. Федароўскім, або ў больш даступнай, запісанай у мінулым стагоддзі П. Чубінскім у былым Бельскім павеце: «На

васьмі нагах стаіць, аж трыма вачыма на вецер глядзіць». А ці мала спявалася песень, у якіх выступае млын і млынар? Прыгадаем найбольш папулярную пра любога дзявочаму сэрцу маладога млынара, што «меле і пытлюе ды соладка цалуе». У казках жа розныя разбойнікі ды зладзеі любяць хавацца ў ветракі, каб там падзяліць паміж сабою награбленае дабро. Ветракі займаюць віднае месца ў прафесіянальнай літаратуры і мастацтве. На першым плане тут стаіць паняцце «бяссэнсавага змагання з ветракамі», якое выйшла са славутага рамана «Хітрамудры Ідальга Дон Кіхот Ламанчскі» пяра іспанскага пісьменніка Сервантэса і абышло ўвесь свет...

*М. Гайдук.*

*(Беларускі каляндар. Беласток, 1979. С. 145—156.)*

**Заява Віктарына Адынцэвіча пра спусташэнне яго млына Войцехам Ціжом (1565—1566)**

Прислалъ до книгъ земъскихъ Слонимъскихъ землянинъ господарьский повъту Слонимского Вихторинъ Одинцевичъ, жалуючи и оповедаючи на земенина господарьского повету Слонимского пана Войтеха Тижа о томъ, ижъ дей онъ року шестьдесятъ шостого, месеца Мая двадцать первого дня, волторокъ, наехавши моцно кгвалтомъ з слугами и многими помочниками своими на именье мое Бусежъ, на ставъ мой на реце Бусежи мельника моего Ондрейца збилъ и зранилъ, колесо воденое млиновое зрубалъ, у млине двери вырубавши, каменье жорновое побилъ, кошъ з житомъ муки моей властивое и завозницкое пять бочокъ разсыпалъ, лоток зрубилъ и вонъ у реку выкинулъ, железа млиновые, веретене, полъприцу, клевцовъ три, свердeлъ, долото, секиръ две побрилъ; в тотъ часъ за наеханьемъ его кгвалтовнимъ, з млина жита и муки мерочное и завозничее всего двадестя бочокъ згинуло...

*(Акты, издаваемые виленскою коммиссiею для разбора древнихъ актовъ. Т. XXII. Акты Слонимского земского суда. — Вильна, 1895. С. 240—241.)*

**Артыкул 21**
**Коли бы хто своим ставом инший став або сеножати затопил або греблю к чужому берегу присыпал**

Теж уставуем: коли бы хто у своей дедизне всю суполную реку мел, то ест обадва бы береги его были, а на ней ставы и млыны поставил, а суседние вышние млыны своим ставом затопил, так ижбы ув инших вышших млынех за подвышеньем воды в нижнем ставе мливо быти не могло, альбо если бы сеножати затопил без воли того пана, чые сеножати суть, а он бы за то отмены взяти не хотел, к тому, если бы теж хто половицу реки, то есть один берег маючы, а присыпал греблю к берегу другому чужому або што грунту, сеножати чужое водою занял и затопил, албо шкодливе подмочыл, так ижбы хто пожытку звыклого слушного, який перед тым мевал с того грунту своего, мети не мог...

А перед подкоморым покажет ли се то явне с права, же в которой с тых речей кривда се ему дееть, тогды подкоморый маеть на той противной

стороне ему дванадцать рублев грошей гвалту и к тому шкоды, што бы их затым у замешканье млива або в неужываныо грунту своего затопленого поднял, за доводом слушным сказати...

*(Статут Вялікага княства Літоўскага. 1588. — Мн., 1989. С. 263—264.)*

**Артыкул 7**
**Хто бы кому озеро албо став, або сажовку зволочил, або млын зжог**

...А пакли бы млын сказил або греблю перекопал, або млын зжог, а в том бы оный шкодовал, иж млын стоял, а пожитку ему з млива не было, або теж став выпустил, на што слушный довод учинить або присегою телесною потвердить, таковый маеть платити гвалт дванадцать рублей грошей и шкоды або замешканье млива за слушным доводом оправити. А млын будет ли скажон, тот же, хто будеть сказил, знову своим накладом збудовати...

*(Статут Вялікага княства Літоўскага. 1588. — Мн., 1989. С. 272.)*

## *ГУЛЬНЯ Ў «МЛЫН»*

У гэтай гульні адзін хлопец кладзецца на тапчане і бярэ кароткую палачку ў рукі. Каля тапчана садзіцца другі хлопец і ставіць на падлозе міску, у якой знаходзіцца збанок з попелам. Зверху іх накрываюць посцілкай, якая спускаецца аж да зямлі. Другія робяць мельніка-яўрэя. Узяўшы мех, напханы саломай, прывязваюць да жывата якому-небудзь хлопцу і прычэпліваюць бараду з лёну ці пянькі ды надзяваюць шапку. Мельнік падыходзіць да тапчана і пускае ў ход млын: хлопец, што ляжыць на тапчане, пачынае не моцна, але часта стукаць па ножках тапчана, а той, што сядзіць унізе, — круціць збанок у місцы, ад чаго ўтвараецца шум, падобны, як у млыне. Тады мельнік адыходзіць убок і выдае сябе за спячага. Хлопцы, што імітуюць шум млына, неўзабаве перастаюць круціць збанок і стукаюць палкай. Тады другія хлопцы будзяць мельніка. Узяўшы таўкач (а калі яго няма пад рукою, дык якое палена), хто-небудзь крычыць: «Хаім, млын стаў! Млын стаў!» — ды б'е з усёй сілы па жывату-сянніку. Мельнік прачынаецца не хутка і, усхапіўшыся, бяжыць да тапчана і б'е кулаком па пятах таго хлопца, што ляжыць на тапчане: гэта мельнік нібы падбівае кліны. Пасля гэтага млын зноў ідзе, а мельнік садзіцца і спіць. І гуляюць такім чынам, пакуль служыць ахвота.

(Наша ніва, 1911, № 6. Запісана ў Мінскім павеце.)

## *ТАНЦЫ «МЛЫНОК», «МЕЛЬНІК»*

«Млынок», «Мельнік» — танец, харэаграфія якога была незаслужана забыта, хаця яго ў свой час выконвала трупа І. Буйніцкага і ўпаміналася танец этнографамі XIX ст. У фальклорных экспедыцыях Мінскага інстытута культуры запісаны ў асноўным на поўдні і паўднёвым захадзе Беларусі,

а таксама ў Віцебскай вобласці. Галоўны пластычны матыў танца — кручэнне мельнічных жорнаў (на шматазёрнай Віцебшчыне — колаў вадзянога млына), а таксама праца самога мельніка.

Прывядзём некалькі варыянтаў.

Танцоўшчыкі становяцца ў кола адзін за другім, злучаючыся праваю рукою ў цэнтры круга, левую кладуць на плячо адзін аднаму і кружацца пад песню. Кола можа рухацца з нарастаннем хуткасці, ногі пры бегу выкідваюцца ўперад, «з падбрыкам». Прыпеўкі самыя розныя:

Ой, мамачка, ельнік, ельнік.
Любіць мяне мельнік, мельнік...
Мука шатруецца,
Мельнік з дзеўкамі цалуецца.

Прывядзём два варыянты напеву, запісаных у Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці:



У Гомельскай вобласці чацвёра танцоўшчыкаў злучаюць у цэнтры правыя рукі і бягуць па крузе. Пад рукамі ваўчком кружыцца пяты. Іншы раз танцор залазіць пад лаўку або пад стол і там кружыцца або проста голасам узнаўляе «тарахценне» мельніцы.

У «Мельніку», запісаным студэнткамі Інстытута культуры Е. Кірылавай і Н. Арціменя ў вёсцы Прыбалавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці, двое хлопцаў становяцца адзін супраць другога ў нявываратнай чацвёртай пазіцыі і падаюць адзін аднаму левую руку. На «раз» — цэнтр цяжару пераносіцца на правую нагу ў невялікім прысяданні, левая нага злёгку прыпадымаецца, правая рука робіць узмах над галавою; на «і» — крок на левую нагу з ударам ступнёй, правая рука апускаецца паверх левай, нібы нешта захопліваючы. Рух паўтараецца некалькі разоў, пасля гэтага да танцуючых далучаецца яшчэ двое хлопцаў, утвараючы кола з крыжападобным злучэннем у цэнтры левых рук. Усе чацвёра працягваюць пачаты рух. Ствараецца ўражанне, нібы круцяцца крылы мельніцы.

Дзяўчаты ў гэты час, прытанцоўваючы, рухаюцца вакол хлопцаў. Затым, нагнуўшыся, уваходзяць у цэнтр кола, замяняюць хлопцаў і паўтараюць іх рухі. Хлопцы танчаць вакол дзяўчат упрысядкі, апісваючы «васьмёркі» і выкідваючы розныя каленцы. Пасля гэтага ўсе ідуць парамі па кругу крокам з двайным прытопваннем.

І, нарэшце, на Віцебшчыне юнак, што танчыў «Млынок», круціўся пасярод хаты ўпрысядку з выцягнутай убок нагою (рух «мельніцы»), доўгаю палкай, якая ўяўляе сабой вуду, «вудзіў» рыбу, а затым кружыўся, апусціўшы палку на зямлю і стараючыся дакрануцца ёю да ног гледачоў. (Запісана ад В. Запольскага 1905 г.н. у вёсцы Логаўцы Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.)



## Загадкі*

Трасецца, калоціцца, аб усім свеце клапоціцца. *(Жорны)*

Брат брата сячэ — бела кроў цячэ. *(Жорны і мука)*

Два вепры б'юцца, паміж іх пена цячэ. *(Млынавыя колы, жорны)*

Мех на мяху і кій навярху. *(Жорны)*

Радзіўся ў цьме, не бачыў ні сонца, ні луны, прыступалі людзі, прабілі грудзі, набілі жэзл і вянец, на тым яму і канец. *(Млынавы камень)*

Радзіўся ў цяні, не відзеў ні сонца, ні месяца, дабраліся да мяне людзі, прабілі мне наскрозь грудзі, жалезным абручам мяне падпаясалі і скакаць казалі. *(Жорны)*

Сівенькі канёк аўса хоча. *(Жорны)*

За сцяною крамяною два мядзведзі гудуць. *(Жорны)*

За сцяною касцяною бугай раве. *(Жорны)*

Кароўка мычыць, у небе хвосцік стучыць. *(Жорны)*

Сядзіць Давыд, калом прыбіт; яму даеш і кланяешся, а ён усё просіць. *(Жорны)*

Стаіць на гары, крыламі махае, супраць ветру грудзі падстаўляе. *(Вятрак)*

Круціцца, верціцца цэлы век, а не чалавек. *(Млын)*

Пціца — не пціца: на дзевяці нагах стаіць, ва ўсе бакі глядзіць, крыламі махае, а лятан не лятае. *(Ветраны млын)*

Стаіць гон на ганах, на дванаццаці нагах, кліча сана скаварына з-пад белага горада. *(Млын)*

Крыллямі маша, а ляцець не можа. *(Вятрак)*

Адзін дзед ніколі не наесца. *(Млын)*

Бегла чачотка праз сямі варотка, прыйшоў чачот, даў ёй вецер — тыц і стала. *(Млын)*

Трах-тарарах, вада бяжыць, барада трасецца. *(Вадзяны млын)*

На ганах, на ганах, на чатырнаццаці нагах, талусіны-балусіны з-пад белага мястэчка. *(Вадзяны млын)*

Стаіць кулік над вадою, круціцца, лапочыцца, аб ім людзі клапоцяцца. *(Вадзяны млын)*

Стаіць мядзведзь на купіне, дрыжыць і калоціцца, а к яму ўвесь свет коціцца. *(Млын)*

Стаіць дом нахлебны, усяму свету патрэбны, а ў тым доме гучы, крычы, на гуры заўлячэ і праз граты ўцячэ. *(Млын)*

На рэках, на водах, на ра́кавых клешнях стаіць двор бялебен, на ўвесь свет патрэбен. *(Вадзяны млын)*

Стаіць вулей на балоце, не жне, не малоціць, а за хлеб грошы калоціць. *(Вадзяны млын)*

*(Загадкі: Беларуская народная творчасць / Скл. Грынблат М. Я., Гурскі А. І. Мн., 1972. С. 227—233.)*

---

* У запісе тэкстаў захавана лексіка мясцовасці.

# ЯК МЕЛЬНІК ЧОРТА НАДУВАЎ

*(казка)*

У некаторым царстве, у некаторым гасударстве жыў адзін пруднік, і вельмі добра знаў ён сваю справу. Вось ён адзін раз малоў-малоў — камень яго і астанавіўся. Ён і тое рабіць, ён і другое рабіць — нічога не бярэ. Ён і гаворыць:

— Што за чорт!

А чорт як тут быў:

— Што табе нада?

— Ды як — што нада: чаму ты так шуціш?

— Ды затым я шучу, каб ты не малоў.

— А што мне рабіць?

— А давай у карты гуляць.

— На што мы будзем гуляць?

— Хочаш — на арэхі, а хочаш — на шчаўчкі.

— Адпусці мяне на тры часы.

Вось пруднік пайшоў да каваля ды скаваў сабе малаток на пружыне і нажаў алавяных арэхаў; тады і прыходзіць к чорту гуляць. Чорт раз узяў, другі раз узяў, а трэці раз пруднік схамянуўся. Як здалі карты, чорт і пытае ў прудніка:

— Што ў цябе?

— Хрэсці!

Чорт і гаворыць:

— Бяры, бяры!

Вось яны гулялі-гулялі, потым чорт як стане яго арэхі кусаць: жвець, жвець, дый выплюне, а пруднік як выйграе, так і пакусае. Чорт і гаворыць:

— Ці не хопіць нам гуляць у арэхі: твае арэхі дрэнь, давай лепш на шчаўчкі.

Вось як здадуць карты, чорт і пытае:

— Што ў цябе?

— Хрэсці!

Тады чорт гаворыць:

— Бяры, бяры!

Вось пруднік як стаў даваць свае шчаўчкі, чорт і кажа:

— Не, пруднік, хопіць і на шчаўчкі гуляць!

— А што будзем цяпер рабіць?

— А во што, брат пруднік, пойдзем ляда матычыць.

— Ну, пойдзем!

Пруднік матычыць цэлы дзень па ланічку, а чорт дзесяцінку. Вось яны наматычылі вялікае поле.

— Ну, што мы будзем сеяць? — пытае чорт.

— А пасеем пшаніцу.

Вось яны пасеялі пшаніцу. Расла-расла тая пшаніца і ўжо паспела. Тады прыходзіць чорт к прудніку:

— Ну, пруднік, давай пшаніцу дзяліць! Што ты возьмеш: макушкі ці камлюшкі?

— Я вазьму макушкі.

А чорт:

— А я вазьму камлюшкі.

Вось пруднік стаў ірваць макушкі ды вазіць дамоў і кладзе ў гумно, а чорт ірве ржышча ды носіць у кусты. Потым пруднік пачаў сваю пшаніцу малоць, памалоў яе. Прыходзіць чорт к прудніку:

— Давай мне паспытаць сваёй часці!

Пруднік даў чорту пакаштаваць ляпёшкі. Чорт і гаворыць:

— А ты мяне надуў, пагадзі — цяпер ужо не надуеш!

Давай зноў ляда матычыць.

Вось яны ўзматычылі.

— Ну, пруднік, што мы цяпер пасеем?

— А цяпер ужо пасеем рэпу.

Вось яны пасеялі рэпу. Паспела рэпа.

— Ну, пруднік, будзем рэпу дзяліць?

— Давай. Ды глядзі не памыліся: не вазьмі зноў камлюшкі.

— Не, — гаворыць чорт, — ты мяне ўсё надуваеш, а цяпер ты не надуеш: цяпер я ўжо вазьму макушкі.

А пруднік гэтаму і рад.

Вось пруднік стаў выбіраць рэпу, а чорт давай валачыць ціцыву ў кусты. Управіліся яны з гэтай рэпай. Прыходзіць чорт к прудніку і гаворыць:

— Ну, давай есці, чыё каму падабаецца!

Вось даў пруднік чорту адну рэпку. Чорт і гаворыць:

— Ну, што, пруднік, наша дружба, здаецца, з табою ўрозь.

— Калі так, то ўбірайся прэч!

— Што табе нада яшчэ?

А пруднік гаворыць:

— А во што мне нада: пазыч мне грошай тысяч пятнаццаць.

— А, гэта можна! А калі ты мне іх аддасі?

— А во калі я табе аддам: калі будуць ісці свінні з поля пяшком ды будзе вялікая спякота.

Вось чорт давай выбіраць самы жаркі дзень. Пайшоў на выган і глядзіць, як свінні ідуць: шагам або не. А свінні ідуць сваім парадкам. Нельга чорту ў прудніка грошай спытаць. Вось ён і гаворыць:

— Ну, што, пруднік, прапалі мае грошы?

— Ты пачакай нямнога, потым зноў прыйдзі.

Праз некаторы час чорт зноў прыходзіць к прудніку, а пруднік стаў над ракой і давай віць вяроўку. Чорт і гаворыць:

— Пруднік, што ты гэта робіш?

— А я ўю кавязу, усіх чарцей з вады завязу!

— Брат пруднік, зрабі міласць, не ві! Што ты ў мяне грошы занімаў, то я ў цябе не буду пытаць.

Вось з тых пор пруднік з чортам раздружыўся.

*(Добровольский В.Н. Смоленский этнографический сборник. — СПб, ч. 1, 1891. С. 638—640.)*

# ПРА МЛЫН У АЛЬХОВІЧАХ

*(паданне)*

Па-нашаму, па-простаму, то тут, дэ мы жывэмо, называецца Ольховічы. Мой прадзед Лубко быў бедны чалавек. Вон служыў дваццаць лет у войску. І там дэсь якось банк з золатам разбілі. Набраў вон таго золата і, вэрнуўшысь дадому, купіў гету гаспадарку, а многа захаваў дэсь пад грушу. Меў штэры сыноў. Адзін сын пагледзіў тое. Паехаў раз прадзед на Спаса на Грабарку разам з тым сынам. Покі бацька маліўсе, сын бягом дадому і до таго золата. Воно было ў двух саганьцях. Мэншы саганэць вон пакінуў, а большы забраў. І стаў сабе зэмлі прыкупоўваці, а потым і млына пабудаваў собе ў Станковічах. А бацька нэ мог аджалаваці тае страты, праклінаў зладзея і ўдэнь і ўночы. Сын слухаў-слухаў тые праклёны і кажа:

— Тато, не праклінайтэ, то я ўзяў.

А бацька на тое:

— Ну, сынку, нэхай так будэ. Ты нэ пропіў, ано пабудаваўся прэч. Пользуйсе на здорове.

Так тое і асталосе. А тэпэр то і млыны пагнілі і Лубкі-млынары сталі звадзіцісе.

Сама меней чатырыста год з запруджанай грэбляю Машчонкі лілася жолабам вада на млынавае кола і круціўся ды скрыгітаў камень, мелючы жыта, авёс, пшаніцу ды грэчку. Завозу бывала багата, а з завознікаў за мліва браў мельнік скобкам збожжа. Малоў жа дробна або груба, а хто хацеў, дык яму і на рафку пускаў.

*(Ніва, 1975. № 16. Запісаў М. Гайдук у в. Альховічы Сямяціцкай гміны ад былой мельнічыхі Ганны Каменскай, 1911 г.н.)*

# ДВА КАМЕНІ

*(казка)*

Ляжаў пры дарозе вялікі камень. Хто ні ідзе, спыніцца каля яго, пасядзіць, адпачне, а то і падсілкуецца трохі. Людзі з усяе акругі ведалі той камень і шанавалі яго.

Пабудаваў у тых мясцінах адзін чалавек новы млын. Але не было ў яго камянёў для жорнаў. Паехаў ён у горад, купіў там верхні жарнавы камень і вязе яго на валах дахаты. Убачыў жарнавік свайго таварыша пры дарозе і заганарыўся.

— Вось бачыш, які я пан! Мяне на валах возяць, а ты нікому не патрэбен. Валяешся тут, як ламачына. Прэч з дарогі, бо расцісну, як порхаўку!

Тут на валоў напалі авадні ды сляпні. Закруцілі валы хвастамі ды як скокнулі ўбок... Зачапіўся воз за камень, што ляжаў пры дарозе, вось зламалася, і ганарысты жарнавік паляцеў далоў. Ды як рэзнуўся аб прыдарожны камень, што аж усярэдзіне ў яго нешта трэснула.

Ляжыць жарнавік і траха са злосці не лопаецца, што давялося апынуцца побач з такім брыдкім каменем.

Тым часам млынар пачаў прыглядацца да прыдарожнага каменя. «Ці не зрабіць мне з яго споднік для жорнаў»? — думае.

Паклікаў ён майстра. Агледзеў майстар камень ды выкаваў з яго споднік для млынавых жорнаў.

Прывёз млынар абодва камені і зрабіў з іх жорны: камень, што валяўся пры дарозе, палажыў пад спод, а куплены — наверх.

Меле сподні камень муку ды толькі радуецца, што цяпер ён яшчэ лепш служыць людзям. А верхні камень аж скрыгоча ад злосці, фанабэрыцца перад таварышам:

— Куды табе да мяне! Я калі захачу, дык задушу цябе! Не ты, а я мялю муку!

Пры гэтым ён так закруціўся, так зашумеў, што аж распаўся на кавалкі.

Пабедаваў млынар да выкінуў тыя кавалкі ў гразь як непатрэбныя.

Купіў млынар новы жарнавік, доўга малоў ім, але і той зламаўся.

А сподні камень трапіўся такі моцны ды ўдалы, што і да гэтага часу меле.

*(Беларуская народная казка ў апрацоўцы А. Якімовіча.)*

## Прыказкі і прымаўкі

Каму што, а мельніку вецер.
Кожны млын на сваё кола ваду цягне.
Добрыя жорны ўсё перамелюць.
Хоць позна, да завозна.
Калі засыпаў, то няхай меле.
Мялі Ямеля — прыйшла твая нядзеля.
Нясі здароў, калі змалоў.
З музы́кі ды з млынара не будзе гаспадара.

*(Прыказкі і прымаўкі, кн. 1 / Скл. М. Я. Грынблат. Мн., 1976. С. 161—162.)*

## Лічылка

Круціцеся, жорны,
З'едзен хлеб наш чорны:
Крысін і Марысін,
Грунін і Анісін,
З'едзен і Пятроў хлябок.
Намялі для іх, дзядок.

*(Дзіцячы фальклор / Скл. Г. А. Барташэвіч, В. І. Ялатаў. Мн., 1972. С. 426.)*

## Дзіцячыя песні




— Заінька, шэранькі,
Дзе ж ты биваў?
— У млыне, у млыне.
— Што ты відаў?
— Мех мукі, мех мукі.
— Чаму ж не ўзяў?
— Хацеў я, хацеў я,
Млынар не даў:

Набеглі, набеглі
Млынарчыкі,
Пабілі, пабілі
Мне пальчыкі.
Набеглі, набеглі
Падмельшчыкі,
Пабілі, пабілі
Мне плечыкі.

*(Грыневіч А. Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925. С. 12. — Зап. А. Грыневіч у Нясвіжскім р. ад П. Гаўрыка.)*




— Дзе ж гэта быў ты, наш чорны баран?
— На млыне быў, на млыне быў, міласцівы пан.
— Што ж ты рабіў там, наш чорны баран?
— Муку малоў, муку малоў, міласцівы пан.
— Хто ж цябе скрыўдзіў, наш чорны баран?
— Млынарчыкі, млынарчыкі, міласцівы пан.
— Як цябе білі, наш чорны баран?
— Ды палкамі, стукалкамі, міласцівы пан.

— Як жа ты плакаў, наш чорны баран?
— Мэмэ-мэмэ, мэмэ-мэмэ, міласцівы пан.
— Як жа ўцякаў ты, наш чорны баран?
— То я скокам, то я бокам, міласцівы пан.
— Як бараніўся, наш чорны баран?
— Ды вось гэтак, ды вось гэтак, міласцівы пан.

*(Дзіцячы фальклор. С. 321. Зап. В. Ф. Гусціновіч у 1960 г. у в. Кажан-Гарадок Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл. ад М. Р. Гусціновіч, 1964 г.)*

## *СВЯТА КАВАЛЁЎ*

**14 лістапада (1 лістапада па с. ст.) —Кузьма — свята кавалёў**

Унясенне свята кавалёў у народны каляндар гаворыць аб вялікай павазе да майстроў, якія займаліся коўкай металу. Некалі навучанне кавальскаму рамяству працягвалася ад 3 да 7 гадоў.

Звычайна кузня стаяла на краі вёскі, пры дарозе. Адтуль даносіўся стук молата і перазвон жалеза. Гэта каваль каваў метал. Ён вырабляў падковы, падкоўваў коней, адкоўваў восі для калёс ці палазы для саней. Ён жа каваў і зубіў сярпы, варыў сякеры і малаткі; адкоўваў нажы і нажніцы, нарогі да сахі і плуга... З глыбокай павагай адносіліся да каваля людзі, лічылі яго волатам, у якога рукі ў золаце.

Мы падаём разнастайны матэрыял па тэме кавальства, з якога настаўнікі і выхавацелі могуць выбраць для сваіх заняткаў неабходнае. У рабоце з тэкстамі, якія носяць рэгіянальны характар, неабходна вучням расказаць аб дыялектных асаблівасцях беларускай гутарковай мовы, але ўсё ж лепш падаваць гэты матэрыял на сучаснай беларускай, бо правядзенне такіх свят — цудоўная магчымасць моўнага абагачэння і г.д.

У залежнасці ад узросту дзяцей выхавальнікі або настаўнікі на аснове пададзенага матэрыялу самі прадумваюць тэмы і формы работы. Але лічым мэтазгодным у дзіцячым садку правесці гутарку з дзецьмі аб народным свяце кавалёў і пазнаёміць з казкамі:

«Каваль» у кнізе «Беларускія народныя казкі». 2-ое выд., дап. /Склад. Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў. Мн.: Навука і тэхніка, 1986. С. 308—316.

«Каваль і аднавокае гора». Там жа. С. 332—334.

«Каваль бяды іскаў» у тэме «Чарадзейныя казкі», ч. II /Склад. К. П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч. Мн.: Навука і тэхніка. 1978. С. 403 — 404.

Для вучняў пачатковай школы змяшчаем сцэнарый правядзення свята. Гэты сцэнарый можа перапрацоўвацца, дапаўняцца дадатковымі матэрыяламі.



У сярэдніх класах можна спалучыць свята кавалёў з працай па тэме «Кавальства» з курса «Беларусазнаўства» (зборнік 2, прыкладная праграма «Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», 6—7-ыя класы).



## *Па рабоце майстра знаць*

*(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў)*

**Настаўнік** *(расказвае аб святце Кавалёў (гл. вышэй і дадатковы матэрыял.)*
— Існуе шмат паданняў пра кавалёў. Паслухайце адно з іх «Кузьма і Дзям'ян».

**Хлопчык.** Жылі калісьці на беларускай зямлі кавалі Кузьма і Дзям'ян. А ў той старонцы завялася ў той час змяя, якая ела людзей. Дайшла чарга і да кавалёў.
— Давай, брат Дзям'ян, зробім жалезную саху!
Зрабілі яны жалезную саху і кажуць змяі:
— Пралізнеш трое дзвярэй нашай вежы, дык мы самі табе сядзем на язык і ты нас з'ясі.
Лізнула раз змяя, другі, трэці — і пралізала трое дзвярэй. А Кузьма яе ўхапіў за язык кляшчамі, а Дзям'ян — кувалдай па галаве гвоздзіць. Запрэглі яе ў саху дый пагналі лес араць. Аралі поле, аралі луг, аралі ўсё і не давалі піць. Не вытрымала змяя і здохла. Толькі пасля гэтага спыніліся кавалі.
Вось так выратавалі кавалі свой край ад змяі.

**Дзяўчынка.** А хто ведае прыказкі і прымаўкі пра каваля і працу? Давайце правядзём спаборніцтва «Складзі прыказку» (З падрыхтаваных палавінак скласці наступныя прыказкі).

Рамясло піць-есці не просіць, а само корміць. Па рабоце майстра знаць.
Які рамеснік — такая работа. У каваля рукі ў золаце.
Багаты зажабруе, а каваль запануе.
Каваль куе, а жалеза пяе.
Каваль без молата, як без рук.

**Хлопчык.** А давайце пагуляем у «Кавалькі»!
(Апісанне гульні гл. у дадатковых матэрыялах.)

**Дзяўчынка.** Чур! Я лічу, хто будзе гуляць!
Саломіна, яроміна,

Трысцель — свісцель,
Конік кован.
— Чым падкован?
— Золатам бітым,
Навадзітым,
Эч, прэч!

Пасля гульні выходзяць дзяўчынкі і, звяртаючыся да хлопчыкаў, спяваюць:

Сіўка — варонка,
Да-лі-гойда!
Куды паляцела?

Хлопчыкі адказваюць:

К кавалю на двор.

І далей па тэксту (гл. дадатковы матэрыял).

**Дзяўчынка.** Хораша вы песню спяваеце, заслухалася я нават. А ці ведаеце вы казкі пра каваля?
Праводзіцца віктарына «Кавалёчкі» па казках «Каваль», «Каваль і аднавокае гора», «Каваль бяды іскаў», «Каваль-вярнідуб» («Беларускія народныя казкі»).

**Хлопчык.** Казкі ведаем на «пяць»,
А цяпер давай скакаць.

Дзяўчынкі вядуць карагод «Каваль» або танец «Кавалі» (гл. дадатковы матэрыял).

Гэтым танцам заканчваецца свята.

## *ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ*

**Кава́ль,** — я, *м.* Рабочы, майстар, які займаецца коўкай металу. *Крутаплечы, з пудовымі кулакамі, каваль Кастусь Махнач з ранку да вечара рамантаваў са сваімі памочнікамі плугі, бароны, перацягваў колы, акоўваў перадкі.* Курто. // *перан.* Той, хто сваёй настойлівай працай дамагаецца чаго-небудзь, стварае што-н. *Каваль свайго шчасця.* □ *Нас мільёны... Мы інакшай, лепшай долі кавалі.* Таўбін.

(Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. 1978.)

**Кова́ль** — 1) кузнецъ. Кагда ледъ — ковалю медъ. Коваль халодный — плохой кузнецъ. Коваль іонъ у насъ холодный. Между тъмъ ковали куютъ козочкины копытики. Ельнин[ский уезд]... 2) самец, производитель. Были бы коваль да ковалиха, а етыга будить лиха.

(Смоленскій областной словарь. / Сост. В. Н. Добровольскій. Смоленскъ, 1914. С. 329.)

**Ковать** *незак.* І. Каваць. *До войны мой дзед коваў.* Чэрнічы. *Кую, кую ножку, поеду ў дорожку, дорожка крывенька, кобулка слепенька* (песенка-забаўка, якая суправаджаецца пастукваннем пальцам у пятку дзіцяці). *Саша не куе, не меле* (прыказка пра нядатнага чалавека). В. Малешава. 2. Набіваць камень у млыне. Цераблічы.

(Тураўскі слоўнік. Т. 2. С. 200—201.)

**Ку́зьня**, — і, ж. Кузьня. *Кылі б тут блізка кузьня была, дык бы кыня пыдкувалі, і калёсы нада було б абкуваць.* Арцёмаўка Міласл.

(Бялькевіч І.К. Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны. Мн.: 1970. С. 236.)

**Тапанімічныя назвы**

**Кавалёўка,** рака, левы прыток р. Шаць (бас. Пцічы). Даўж. 22 км. Цячэ ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл...

**Кавалі́**, вёска ў Бабруйскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Беліца...

**Кавалі́**, вёска ў Рускасельскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл., на р. Нарачанка.

**Кавалі́**, вёска ў Гледанскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл...

**Кавалі́**, вёска ў Ваверскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл...

**Кавалі́**, вёска ў Ружанскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл...

**Кавалі́**, вёска ў Клясціцкім с/с Расонскага р-на Віцебскай вобл...

**Кавалькі́**, вёска ў Белаліпскім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Бярозка...

*(БелСЭ. Т. 5. 1972. С. 203—204.)*

**Кавалі́**, майстры, якія займаліся коўкай металу (гл. *Кавальства*). У старажытнасці адначасова былі гутнікамі — майстрамі па выплаўцы жалеза з балотнай ці азёрнай руды, з якога потым выкоўвалі прылады працы, зброю, хатняе начынне, упрыгожанні і інш. У XI—XIII стст. К. адасобіліся ад гутнікаў, у XIV—XVII стст. дыферэнцыраваліся ў шэраг вузкіх спецыяльнасцей: мечнікаў, замочнікаў (клудачнікаў), рагатнікаў, лучнікаў, нажоўшчыкаў і інш. Гарадскія К. належалі да саслоўя мяшчан і з XVI ст. мелі права аб'ядноўвацца ў *цэхі рамеснікаў*. У 2-ой пал. XVII ст. шмат К. з Беларусі працавалі ў Маскоўскай дзяржаве. Навучанне кавальскаму рамяству працягвалася ад 3 да 7 гадоў, пасля чаго вучні станавіліся чаляднікамі (падмайстрамі). Для атрымання статуса майстра К. павінны былі зрабіць «вандроўку» па рамесніцкіх цэнтрах (ці заплаціць за яе) і выкаваць пэўны выраб («зрабіць штуку»). Сельскія К. задавальнялі патрэбы навакольнага насельніцтва ў неабходных прадметах хатняга ўжытку, сельскагаспадарчых прыладах і інш. Перадача майстэрства адбывалася шляхам вучнёўства, часта ў сваіх бацькоў (калі рамяство было спадчынным) ці ў местачковых К. Да канца XIX ст. К. працавалі часова ці пастаянна па найму ў грамадскіх кузнях, пазней сталі набываць уласныя і ўсталёўваліся ў вёсках. Да канца XIX ст. у кожным павеце налічвалася да 50 сельскіх К. Звычайна К. працавалі разам з памочнікам-малатабойцам. Акрамя гарачай ці халоднай коўкі К. выконвалі зварку, загартоўку, а таксама слясарныя, бляхарныя, паяльныя і інш. работы. У час Вял. Айч. вайны К. у партызанах выраблялі і рамантавалі зброю. У наш час К. працуюць у калгасных і саўгасных майстэрнях, рамантуюць сельскагаспадарчую тэхніку, задавальняюць патрэбы ў неабходных вырабах, звычайна валодаюць газа- і электразваркай.

*Я. М. Сахута.*

*(Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 225.)*

**Кавальства,** вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага ці халоднага кавання. На Беларусі вядома з часоў жалезнага веку. Жалеза здабывалі з балотнай руды

ў невялікіх паўшарападобных печах (домніцах), з атрыманых загатовак (крыц) выкоўвалі наканечнікі коп'яў, нажы, долаты, конскую збрую, упрыгожанні і інш. Пашыралася ў XI—XIII стст. З жалеза выкоўвалі рэчы гаспадарскага і бытавога прызначэння: сякеры, долаты, нажы, нажніцы, свярдзёлкі, зубілы, шпоры, коп'і, цвікі, крэсівы, замкі, ключы, спражкі, фібулы і інш. К. звычайна займаліся гарадскія рамеснікі, якія валодалі таксама загартоўкай, цэментацыяй, зваркай. У XVI ст. узніклі першыя кавальскія цэхі (Слуцк, Полацк, Магілёў, Віцебск і інш.), якія аб'ядноўваліся разам з іншымі (галоўным чынам слясарнымі) ці выдзяляліся ў самастойныя. Уставы кавальскіх цэхаў рэгламентавалі характар работы кавалёў: акоўванне транспартных сродкаў, падкоўванне коней, выраб сякер, крукоў, шлемаў, якараў, ланцугоў, рашотак, а таксама розных рэчаў маст. характару. Асаблівага развіцця дасягнула К. у XVII—XVIII стст. У Віцебску, Полацку, Мінску, Магілёве, Пінску, Гродне налічваліся дзесяткі кавалёў розных спецыяльнасцей: нажоўшчыкаў, мечнікаў, замочнікаў, кацельшчыкаў і інш. Пераважная большасць гарадскіх майстроў працавала ў сферы манументальнага будаўніцтва. Яны выраблялі агароджы, балконы, лесвічныя парэнчы, алтарныя перагародкі, крыжы, флюгеры і інш. Многія беларускія майстры-кавалі працавалі ў Маскоўскай дзяржаве. У XIX ст. з развіццём прамысловасці К. у гарадах заняпала, адначасова ўзрастала яго роля ў вёсцы, дзе яно задавальняла галоўным чынам бытавыя і гаспадарчыя патрэбы навакольнага насельніцтва. Для кавальскіх работ будавалі асобнае памяшканне — *кузню,* у якой былі *горан* і неабходныя *кавальскія інструменты.* Вугаль (з лісцевых парод дрэў) набывалі на смалакурнях ці выпальвалі самі, жалеза выкарыстоўвалася ў выглядзе заводскага фасоннага пракату (шыннае, падкоўнае і інш.) ці match рознага жалезнага лому. Асноўныя віды работ: акоўка транспартных сродкаў (калёс, саней, брычак, вазкоў) і выраб металічных дэталей да іх, падкоўванне коней, выраб сельскагаспадарчага інвентару (сярпы, сашнікі, матыкі, драпашнікі), слясарнага і столярнага інструменту (сякеры, свярдзёлкі, стругі, долаты, скоблі), прыладаў хатняга ўжытку (секачы, качэргі, вілкі, багры, бязмены, крэсівы), дэталяў аснашчэння жылля і мэблі (завесы, клямкі, замкі, крукі, зашчэпкі, кра́ты) і інш. Для выкоўвання патрэбнага вырабу жалезную загартоўку награвалі ў горне дачырвана (для надання металу пластычнасці) і, паклаўшы яе на кавадла, ударамі малатка выкоўвалі з яе патрэбную форму. У залежнасці ад прызначэння вырабаў іх тэрмічна апрацоўвалі — цэментавалі (насычалі паверхневы слой вугляродам, што надавала вырабам павышаную цвёрдасць і трываласць), загартоўвалі (награвалі і хутка ахалоджвалі ў вадзе для надання цвёрдасці, пругкасці) і адпускалі (награвалі і паступова ахалоджвалі, што змякчала дзеянне загартоўкі, змяншала крохкасць і павышала пластычнасць)...

*Я. М. Сахута.*

*(Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. С. 227—228.)*

## ЧАРОЎНЫЯ РУКІ

На краі вёскі, пры дарозе, стаяла кузня. Адтуль даносіўся стук молата і перазвон жалеза. Гэта каваль каваў метал. Ён вырабляў скобы або цвікі, адкоўваў вось для калёсаў ці палазы для саней. Каваль вырабляў падковы

і падкоўваў коней, рабіў конскія жалезныя путы і замкі для іх; ён нацягваў шыны на колы калёсаў.

Ён жа каваў і зубіў сярпы, варыў сякеры і малаткі, акоўваў нажы і нажніцы, нарогі да сахі і плуга...

...Ён вырабляў і рамантаваў прадметы за пэўную плату збожжам або грашыма. Яго праца цанілася дорага, аб чым гавораць прыказкі: «У каваля што стук, то грыўня», «У каваля рукі ў золаце».

Сучасныя калгасныя і саўгасныя кузні непазнавальна пераабсталяваны (мяхі заменены электрычнымі кампрэсарамі), але тэхналогія апрацоўкі жалеза засталася тая ж самая...

Наша беларуская зямля заўсёды была багата на таленавітых і майстравых людзей. Беларускія рамеснікі (збройнікі, керамісты, майстры залатых і сярэбраных спраў, будаўнікі) яшчэ ў XVII ст. славіліся сваім майстэрствам за межамі свайго краю. Вялікая колькасць іх працавала ў Рускай дзяржаве, у прыватнасці ў Маскве.

*(Лакотка А. I., Барыс С. В. Сцежкамі дзядоў. Мн., 1986. С. 115—117.)*

## З ГІСТОРЫІ КАВАЛЬСКАГА РАМЯСТВА

Нешматлікія ўцалелыя да нашага часу кавальскія вырабы XVI—XVII стст. сведчаць, што тагачасныя беларускія майстры былі добра знаёмыя з агульнаеўрапейскімі мастацкімі стылямі. Аднак гэта не зусім сведчыць аб механічным перайманні чужых узораў. Майстрамі праводзіўся своеасаблівы іх адбор, творчае пераасэнсаванне ў адпаведнасці з уласнымі густамі і мясцовымі традыцыямі.

Найбольш ярка змены ў мастацкіх стылях ілюструюць каваныя дэталі архітэктурнага ўбранства. Характэрная для перыяду готыкі* акоўка дзвярэй збудаванняў многіх краін Еўропы ўяўляе сабой рамбічную сетку з металічных стужак, прыбітых да драўлянай паверхні вялікімі кованымі цвікамі з гранёнымі ці фігурна аформленымі ў выглядзе разеткі, кветкі плешкамі. Каваныя фігурныя аздобы мацаваліся як на скрыжаваннях жалезных палос, так і ў прамежках паміж імі. Выдатным узорам работы беларускіх майстроў у такой стылістыцы з'яўляецца каваны дэкор дзвярэй Супрасльскай благавешчанскай царквы пачатку XVI ст. (сёння — тэрыторыя Польшчы; разбурана нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1944 г.).

...Уплыў Рэнесансу** найбольш ярка выявіўся ў каваных рашотках. Калі гатычныя рашоткі выконваліся з гранёных стрыжняў і вызначаліся некаторай сухаватасцю і суровасцю, то асноўнай асаблівасцю рэнесансавых вырабаў становіцца прымяненне круглага прута. Ён даў магчымасць аздабляць вырабы разнастайнымі спіралямі, завіткамі, адгалінаваннямі, якія заканчваліся лістамі, кветкамі, вінтападобнымі вусікамі.

---

* Готыка (ад назвы германскага племя готаў) — стыль у еўрапейскім мастацтве XII—XVI стст., які папярэднічаў рэнесансу і вызначаўся імклівасцю і стромкасцю форм, узбагачаных насычаным ажурным дэкорам з перавагай крыжападобных элементаў.

** Рэнесанс — слова паходзіць ад французскага «адраджэнне», гэта эпоха XIV—XVI стст. (у Беларусі — XVI — першая палова XVII ст.), якая з'яўляецца пераходнай ад сярэдневяковай культуры да культуры новага часу і вызначаецца зваротам да антычнай культуры спадчыны (адраджэнне).

Выдатнымі ўзорамі такіх вырабаў з'яўляюцца дзвярныя рашоткі касцёла ў Вішневе Валожынскага раёна. Адна з іх, пазначаная датай «24 мая 1619», асабліва звяртае на сябе ўвагу...

Новы стыль (барока*. — А. Л.) з яго пышнасцю, пампезнасцю, адмысловай дэкаратыўнасцю парушыў выразную схему кавальскіх вырабаў, у тым ліку і рашотак. Металічныя стрыжні мудрагеліста пераплятаюцца між сабой, у дэкор уключаюцца каваныя кветкі, букеты, лісце. Узорамі такіх вырабаў з'яўляюцца дзвярныя рашоткі ў касцёле аўгусцінцаў у Міхалішках Астравецкага раёна, бернардзінскім касцёле ў Гродне (XVII ст.) і інш.

Многія работы беларускіх кавалёў выяўляюць уплыў мясцовага народнага мастацтва, разнастайнае спалучэнне заходнееўрапейскай стылістыкі і ўсходняй тэматыкі. Прыкладам з'яўляецца каваны дэкор дзвярэй сінагогі сярэдзіны XVII ст. у старым Быхаве (не захавалася).

*(Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацкае кавальства. Мн., 1990. С. 20—23.)*

## *АКОЎКА ТРАНСПАРТНЫХ СРОДКАЎ*

Аснашчэнне транспартных сродкаў металічнымі дэталямі — з'ява ў народным побыце беларусаў (як і іншых суседніх народаў) параўнальна позняя...

Значнае пашырэнне аздоблены выязны транспарт меў сярод заможнага насельніцтва ў заходняй частцы Беларусі ў часы буржуазнай Польшчы. Адмыслова выраблены брычка ці вазок лічыліся сімвалам прэстыжнасці, асабліва сярод шляхты. Па іх выгляду меркавалі пра гаспадара, яго заможнасць, дастатак, а значыць — і становішча ў грамадстве.

...Прыгожа аздобленыя вазкі шырока ўжываліся ў вясельных абрадах, што знайшло сваё пацвярджэнне ў вуснапаэтычнай творчасці:

Па нашу Любку
Падвода прыйшла—
Вазок маляваны,
Конь гадаваны.

*(Шчарбінская воласць Віцебскай губ.)*
(Там жа. С. 125—129.)

## *МАСТАЦКАЕ КАВАЛЬСТВА Ў НАРОДНЫМ ПОБЫЦЕ*

Найбольш пашыраным відам мэблі, які меў асабліва багатае і своеасаблівае металічнае ўбранне, з'яўляюцца куфры. Здаўна яны выконвалі важную ролю ў вясельным абрадзе, таму выраблялiся з асаблівым стараннем і ўмельствам, спалучаючы ў дэкоры розныя яго віды: кавальства, роспіс, разьбу...

---

* Барока (ад італьянск. barocco — вычварны, дзівосны) — стыль, які ўзнік у еўрапейскім мастацтве канца XVI — сяр. XVIII ст. на аснове традыцый позняга рэнесансу і папярэднічаў класіцызму; творы вызначаюцца дынамічнасцю кампазіцыі, пышнасцю дэкору, кантрастам маштабаў, рытмаў, матэрыялаў. (Заўвагі нашы.)

Цікавы раздзел народнага мастацкага кавальства складаюць унікальныя вырабы...

Сярод падобных твораў перш за ўсё варта адзначыць жырандоль, адкаваную ў 1881 г. для мясцовага касцёла таленавітым мастаком-кавалём і паэтам-самародкам П. Багрымам з Крошына (Баранавіцкі раён). Гэты унікальны ўзор кавальскага майстэрства ва ўсіх адносінах цікавы і каштоўны: ён добра збярогся, дакладна датаваны, з абазначэннем аўтара і месца вырабу. Сёння жырандоль (па-мясцоваму — жарандаль) упрыгожвае экспазіцыю музея, арганізаванага ў будынку былога касцёла. У творы ўвасобіліся ўсе лепшыя тэхналагічныя і мастацкія дасягненні кавальства канца XIX ст., спалучыліся праявы заходнееўрапейскага мастацтва, гарадскіх цэхавых рамёстваў і мясцовых народных традыцый, нарэшце, праявілася высокае майстэрства вясковага паэта-каваля...

Як расказваюць мясцовыя старажылы, П. Багрым у заклад з мясцовым панам выкаваў сцізорык (па іншых звестках — брытву), які нельга было адрозніць ад вырабу замежнай фірмы. Падобны сцізорык зберагаўся ў Крошыне да нядаўняга часу, прычым яго не брала ржа. Гэта пацвярджае надзвычай высокі ўзровень майстэрства каваля, яго дасведчанасць у сакрэтах тэхналогіі апрацоўкі металаў.

*(Там жа. С. 140—153.)*

## *«ВЯЗУЦЬ СКРЫНІ МАЛЯВАНЫЯ...»*

Сёння спяваюць далёка не ўсе цудоўныя песні пра куфар. (І гэта зразумела. Ён цяпер адыгрывае пасіўную ролю ў вясельным абрадзе, ім рэдка карыстаюцца ў побыце). Напрыклад, песня «Да гула пчолка, гула, кругом бору лятаючы...», што была запісана ў 1914 годзе ў Дарашэвічах (цяпер Петрыкаўскі раён) польскім даследчыкам К. Машынскім, у сучасным рэпертуары вёскі ўжо не зафіксавана. А твор гэты вельмі вобразны. Нявеста, якая збірала ў куфар пасаг, упадабляецца руплівай пчолцы: «Вулейку мой навесенькі, быў жа ты паўнесенькі; што за год нанасіла, то за час разнасіла!» У песні трапна выкарыстаны псіхалагічны, падмацаваны страфічным, паралелізм:

Да плакала Марылька,
да куфрыка прылягаючы:
«Куфрыку мой навесенькі,
быў жа ты паўнесенькі...
Што за век нарабіла,
то за адзін вечар раскаціла».

...У Драгічынскім раёне, дзе выраблялі, як і ў суседніх Іванаўскім і Пінскім, маляваныя куфры, спяваюць: «Яго коні каваныя вязуць скрыні маляваныя». У Бешанковіцкім: «Вось табе, мамачка, торба верацён, а мне, моладзе, шкаф палацён...» На Тураўшчыне і ў прылягаючых раёнах, дзе ў духоўнай і матэрыяльнай культуры збераглося больш архаікі, бытавалі стара даўнія, аббітыя дэкаратыўным жалезам, амаль без размалёўкі скрыні. У іх на вяселле бацькі і надкублікі (сяброўкі нявесты) везлі пасаг. Брат нявесты не аддаваў дарма скрыню з дому, прасіў за яе выкуп. Ад'язджаючы, спявалі песню, у якой выказвалі клопат пра тое, каб не згубіць «ні скрыні, ні пярыны, ні маладой гаспадыні»:

...Бо як скрыню згубім,
То другую зробім.
А як маладую згубім,
То другой не знойдзем.

На сваім двары маладому даводзілася выкупляць скрыню:

...Скрыня сакоча.
Чаго яна хоча?
Паўтара залатога
Ад князя маладога.

На кубле ці скрыні ў многіх мясцовасцях адбываўся важны рытуал вяселля: «засмальванне», расплятанне валасоў маладой...

Выраблялі скрыні і ў Лельчыцкім раёне. Усё, апроч скобаў для бакавых ручак і чатырох кольцаў, якія заказвалі ў кузні, кожны майстар рабіў сам. Скрыні былі вялікія па памеру (шырыня і вышыня да 70 см, даўжыня — да 1,5 м). Добрыя майстры змацоўвалі дошкі сталярным клеем, вуглы — шыпамі. Самі рабілі з дроту на спецыяльных прыстасаваннях дэкаратыўныя цвічкі. Геаметрычныя фігуры для аздобы высякалі, падклаўшы дрэва, з бляхі спецыяльнымі саматробнымі зубіламі. Паводле характару дэкору можна было вызначыць майстра, бо кожны меў свой, адметны «почырк». Устаўлялі ўнутраныя замкі або рабілі прыстасаванні для вісячых...

Скрыні выраблялі ў Лельчыцкім раёне і пасля вайны. Славіліся такія майстры, як Р. І. Бакуновіч са Слабады, М. А. Дрынеўскі з Тонежа, Я. Р. Бакуновіч, П. І. Сушчык з Букчы, В. М. Бабовіч, І. В. Гайкевіч, П. М. Лукашэвіч з Дзяржынска. Цяпер яны выяўляюць сваё майстэрства ў сталярнай справе.

*Алесь Лозка*

*(Мастацтва Беларусі. 1987. № 8. С. 74—75.)*

## Прыказкі і прымаўкі

Рамясло піць-есці не просіць, а само корміць.
Па рабоце майстра знаць.
Які рамеснік — такая работа.
Замка без ключа не робяць.
У каваля рукі ў золаце.
Багаты зажабруе, а каваль запануе.
Калі на двары лёд, то кавалю мёд.
Як снег завее, то каваль хварэе.
У каваля што стук, то грыўня.
Каваль куе, каваліха пяе.
Каваль куе, а жалеза пяе.
Не ўмееш шыць золатам, так куй молатам.
Каваль без молата, як без рук.
Каваль на то клешчы куець, каб рук не папеч.
Каваль — без сякеры, шавец — босы.
Пугаю кавадла не рассячэш.
З іголкі долата не зробіш.

*(Прыказкі і прымаўкі, кн. 1 /Скл. М. Я. Грынблат. Мн., 1976. С. 146—157.)*

## Загадкі

Спераду горача, а ззаду холадна. *(Каваль каля горна)*
Спераду грэе, а ззаду вее. *(Каваль зімою каля горна)*
Поп саграшыў, а дзяка калоцяць ці лаюць. *(Агонь і жалеза)*
Поп саграшыў, а дзяк пакутуе. *(Агонь і жалеза)*
(Загадкі /Скл. А.І. Гурскі. Мн., 1972. С. 215—-216.)

## Гульні

### *Крук*

Для гэтай гульні дзеці выбіраюць даволі прасторнае месца, дзе-небудзь каля каменя. Адзін з хлопчыкаў («каваль») б'е каменем па камені, г.зн. куе. Побач з кавалём два хлопчыкі бяруцца за рукі. Астатнія выбіраюць «матку», звычайна самага моцнага сярод удзельнікаў, і становяцца адзін за адным. «Матка», якая ўперадзе, вымаўляе гукі: «Кру-кру-кру», і ўся чародка, імітуючы жураваў, паўтарае тое ж. Усе бягуць за ёю да двух хлопчыкаў, да так званых «варотаў», праходзячы пад іх узнятымі рукамі. Пасля праходу «маткі» хлопчыкі, якія стаяць з узнятымі рукамі, стараюцца некаторых не прапусціць, «абарваць» апошніх жураваў, якія ў такім выпадку павінны стаць новымі «стаўбамі варот». Але дзеці, папярэджаныя «маткай», моцна трымаюць адзін аднаго за вопратку і стараюцца ўсе прайсці да каваля. Падышоўшы да яго, «матка» пытаецца:

— Што куеш?

Каваль адказвае:

— Воду.

— Вада нашто?

— Для тваіх дзіты.

— Дэ в мэнэ дзіты?

— За плячыма.

— В тэбэ пацеркі перэд очыма.

І з крыкам «кру-кру-кру» зноў бягуць вакол стаўбоў і ідуць да каваля праз вароты, і г.д. да таго часу, пакуль вароты не абарвуць у «маткі» ўсіх дзяцей. Каб не дапусціць гэтага, «матка» мацнейшых ставіць бліжэй да сябе, а слабейшых — у канец. У адваротным выпадку могуць быць абарваны адразу ўсе дзеці. Калі «матка» згубіць усіх, то павінна зрабіцца кавалём, уступіўшы яму сваё ганаровае месца.

Як бачна, гэтая гульня адлюстроўвае пералёты жураваў, якіх часта бачылі дзеці. Яна атрымала назву ад гука «кру», які выкрыкваюць птушкі.

*(Архіў Акадэміі навук СССР, г. Ленінград. Ф. 104, воп. 1, № 100, л. 3—4. Запісаў Пуцэвіч Васіль у г. Бельск Гродзенскай губ.)*

### *Кавалькі*

Робяць з дрэва два кавадлы і каля кожнага з іх па ўстою прыладжваюць лёгкі драўляны малаток з прывязанай да яго ручкі ніткай.

Затым два гульцы паасобку торгаюць за ніткі, каб малаткі без перастанку білі па кавадлах, а трэці гулец падстаўляе пальцы то адной рукі, то другой якраз у тыя месцы, дзе б'юць малаткі. Калі ён здолее падстаўляць

і адымаць пальцы з аднаго або другога кавадла так, каб па іх не ўдарыў малаток, дык ён становіцца торгаць нітку, а той, хто торгаў нітку, — на яго месца.

*(Дзіцячы фальклор /Скл. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1972. С. 541.)*

## *Каваль*

Выбіраюць з удзельнікаў гульні «каваля». Каваль мае скручаную «пытку» з хусткі або ручніка. На лаве пад шапкай ці яшчэ пад чым хавае якую-небудзь рэч, напрыклад, арэх, цыбуліну, гарошыну і г.д. Да каваля падыходзяць па чарзе дзеці і адгадваюць, што схавана. Хто не адгадае з першага разу, таго каваль б'е пыткай. Так праходзяць усе ўдзельнікі гульні. Калі ніхто з удзельнікаў не адгадае, які прадмет схаваны, тады ўсе б'юць каваля.

*(Дзіцячы фальклор. С. 542. Запісана ў в. Адамчукі Віленскага павета.)*

## *Ковайло*

Дзіцячая гульня з мячыкам. У ковайло як гуляюць, то выкоўваюць м'ячыком, як хто поймае, то очко, як не поймае, то вулазіць. В. Малешава.

*(Тураўскі слоўнік. Т. 2. 1982. С. 200.)*

## *Лічылка*

Саломіна, яломіна,
Трысцель-свісцель,
Конік кован,
— Чым падкован?
— Золатам бітым,
Навадзітым.
Эч, прэч!

*(Дзіцячы фальклор. С. 430.)*

### **Дзіцячая песня**




— Сіўка-варонка.
Да-лі-гойда!*

— А нашто кароўкі?
— Млечка даіці.

---

* Паўт. пасля кожнага радка.

Куды паляцела?
— К кавалю на двор.
— Нашто табе каваль?
— Косы каваці.
— Нашто табе косы?
— Траўку касіці.
— Нашто тая траўка?
— Каровак карміці.

— А нашто млечка?
— Сырцы ляніці.
— А нашто сырцы?
— Пастухоў карміці.
— А дзе ж пастухі?
— На вайну пайшлі.
— Дзе тая вайна?
— Пасярод гумна.

*(Грыневіч А. Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925. С. 14. Запісаў В. Багдановіч на Дрысеншчыне.)*

**Радзінная песня**

Паздароў, Божа, каваля,
А што скаваў нам дзіця.
А ці ў ручкі не хукаў,
А ці молатам не стукаў,
А ў мяккіх падушках,
А пад цёплай дзяружкай,
Без молата, без кавадла,
А паглядзіш — дзіця ладна.

*(Радзінная паэзія /Скл. М.Я. Грынблат. Мн., 1971. С. 111. Запісана ў Шчарбінскай воласці Віцебскага павета.)*

## *Каваль*

*(карагод)*

У дастаткова хуткім тэмпе выконваецца карагод «Каваль», запісаны ў Гомельскай вобласці [ад Т. Валчковай 1913 г.н. у в. Канапліцы Рагачоўскага раёна]. Тры пары, якія стаяць паўкругам, пад тэкст, што спявае хор, зыходзяцца. Першая і другая пары кружацца пад руку. На яшчэ больш хуткі прыпеў: «Я і ў дзеле была, прыгаварывала, проціў мілага стаяла, разгаварывала» ўсе ўдзельнікі ідуць уперад, дробна адбіваючы, затым вяртаюцца на свае месцы. На наступную страфу ў цэнтры кружацца другая і перадапошняя пары, а на прыпеў усе зноў з адбіваннем рухаюцца ўперад.





*(Чурко Ю.М. Белорусский хореографический фольклор. Мн., 1990. С. 131—132.)*

## *Каваль, Кавалі*

*(танцы)*

Танец, пабудаваны на харэаграфічным асэнсаванні працы кавалёў. Пагэтаму лейттэмай многіх варыянтаў з'яўляецца ўдар «молата па накавальні», які ўзнаўляецца палкамі аб падлогу, далонямі, кулакамі, каблукамі, нагамі, быццам куюць.

Да танца створана даволі вялікая колькасць прыпевак, суладных з рытмам удараў:

Я праз кузню шла,
Малаток нашла.
Любі мяне, кавалёк,
Падарую малаток.

Прывядзём некалькі музычных найгрышаў і найбольш характэрных варыянтаў прыпевак да танца, запісаных у палявых экспедыцыях:




Часта танец гэты выконваецца сольна. У Гродзенскай вобласці «Каваля» танцавалі мужчыны — адзін або двое. Стоячы на левай назе, танцор правую выстаўляе на паўпальцы ўперад з прыгнутым каленам. Яго правая рука ляжыць на калене далонню ўверх, а левая, сціснутая ў кулак, з усяго маху апускаецца на далонь правай, нібы молат на кавадла. Ударыўшы так

некалькі разоў, першы танцор робіць нешта накшталт па-дэ-баскаў, мяняючыся з другім месцамі і прымаючы пачатковую позу. Трэці рух узмацняе першы: удар па «кавадле» адбываецца ўжо не кулаком, а галавою. Пры гэтым корпус рэзка нахіляецца ўперад, да калена. Першая нага, што стаіць на паўпальцах, апускаецца на пятку. Адначасова з нахілам корпуса правая нага, якая сагнута ў калене, падымаецца. Пасля гэтага танцоры зноў робяць па-дэ-баскі [запісана ад І. Ганчарэвіч 1898 г.н. у в. Новы Двор Свіслацкага раёна].




*(Нотны прыклад прыведзены з «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі». Т. 2. 1985. С. 604)/ — А. Л.)*

У Гродзенскай вобласці бытаваў і другі варыянт танца. Двое мужчын спачатку ходзяць па крузе, прытанцоўваючы, затым становяцца адзін супраць другога і бяруцца за рукі. Свабоднымі рукамі яны ўзмахам рытмічна б'юць па прыціснутых далонях. Пры гэтым абодва сінхронна хістаюцца, пераносячы цэнтр вагі цела з адной нагі на другую (уперад — назад).

Масавы варыянт танца пад назваю «Кавалёк» зафіксаваны ў Гомельскай вобласці. Мужчыны і жанчыны дзвюма лініямі ідуць насустрач адзін аднаму. Пры гэтым мужчыны стукаюць кулаком па калене. Затым удзельнікі садзяцца на стулы, адзін насупраць другога, падкурчыўшы пад сябе ногі, і сціснутымі ў кулакі рукамі б'юць імі, нібы малаткамі.

*(Чурко Ю. М. Белорусский хореографический фольклор. С. 180—181.)*

## *Кузьма-Дзям'ян*

*(паданне)*

Кузьма-Дзям'ян былі калісь кавалі. І была змяя калісь. Дак яна ўбірала людзей. І дабіраецца да іх ужо, знацца.

— Што, брат, іздзелаем мы зялезную саху.

Здзелалі яны цяперака саху і кажуць змяі:

— Пралізнеш трое от этых дзвярэй, дык мы табе сядаем на язык, ты нас і з'ясі.

Цяперака яна раз лізнула, другі лізнула і трэці — і пралізала трое дзвярэй. Яны тагды — цапель! Ды за язык яе кляшчамі. Да адзін гвоздзе па галаве, а другі запрагае ў саху. Як запраглі яе, дак аралі яны на ёй лес, аралі яны луг, аралі яны поле, аралі ўсё і не давалі піць, пакуль прыараліся к Няпру, яна як вырыла роў, як стала піць, — апраглася. А яны тагды і прыстанавіліся.

*(Романов Е.Р. Белорусский сборник, вып. 4. Витебск, 1891. С. 17. Запісана ў Гомельскім павеце Магілёўскай губерні.)*

## *БЯЗНОГІ БАГАТЫР*

*(чарадзейная казка)*

У неякім царстве, неякім гасударстве жыў-быў каваль ды каваліха. Спарадзіла каваліха, на яе ліха, гожага хлапчука, ды бязногага. Расце хлапчук не на радасць, а на гора. Ведама, калека зроду — якая радасць бацькам. Гадуецца ён як пакідзішча. Управіцца каваліха каля печы дый бяжыць у поле ці ў агарод, а хлапчук валяецца па зямлі ды смокча скарынку або жуе параную картоплю. Кінула яго раз каваліха на дзядзінцы, дык ледзь яго свінні не з'елі. Не шкадуе каваліха, на яе ліха, свайго дзіцяці.

— Бо, — кажа, — якая з яго карысць? Калека не памога, а толькі абуза. Хоць бы яго Бог са свету прыбраў.

А тут ён насуперак расце ды таўсцее. Вырас ужо хлапчук нелапы, але не ходзіць, ды толькі поўзае. Карміць яго кармі, а карысці з яго ніякае няма. Яшчэ горш яго пачала праклінаць матка ды наракаць на Бога, што даў ён сына не на ўцеху, як людзям, а на бяду. Слухаў, слухаў каваль праклёны дурное бабы, але нічога не можа парадзіць. Шкода яму хлопца, але ад бабы жыцця няма. Нарэшце не вытрымаў ён, запрог кабылку, пасадзіў на воз сына дый павёз яго ў лес. Завёз ён далёка ад вёскі дый хацеў там пакінуць сына на страту, але ўбачыў у лесе маленькую хатку. Улез ён у хатку, аж там нікога няма. Зірнуў ён туды-сюды — у хатцы ўсё ёсць, а гаспадыні няма. Унёс ён сына ў хатку ды там і пакінуў, а сам сеў на воз ды па кабылцы, ды па кабылцы! Патарахцеў ён хутчэй, не аглядаючыся, каб ніхто не дагнаў. Сядзіць хлапчук адзін ды разглядае, што там ёсць. Толькі вось прыходзіць якісь старэнькі дзядок і просіцца напіцца.

— Рад бы я даць табе напіцца, — кажа хлапчук, — ды не магу хадзіць.

— Прашкі, — кажа дзядок, — зачарпні ды перш пакаштуй сам, ці добрая вада.

А хлапчуку даўно піць хацелася, хлебануў ён дый выдундзіў амаль поўны корчык. Як выпіў, дык адразу пачуў у сабе такую сілу, што, здаецца, усю зямлю перавярнуў бы, каб толькі было ў што ўперціся нагамі. Напіўся дзядок дый кажа:

— Пі больш, бо табе трэба вялікая сіла, — і знік, быццам яго і не было.

Падзівіўся хлапчук, думаў, што гэта яму прыснілася, але бачыць, што ў яго здаровыя ногі, што ён так ідзе, што пад сабой і зямлі не чуе. Напіўся ён яшчэ тае вады, дык і чуецца, што яму няма раўні на ўсім свеце. Хацеў ён яшчэ больш наліць вады, ды як узяўся за збан, дык і разгнёў яго, а вада вылілася. Схапіў ён вядро дый пабег да крыніцы. Шукаў ён яе, шукаў —

няма, быццам у зямлю правалілася. Варочаецца ён да хаткі, аж і тая прапала. Ён туды, ён сюды, дык так запутаўся ў глушчэчы, што не ведае, куды ісці. Пастаяў ён трохі дый пайшоў проста. Ідзе ён, а спераду пападзецца тоўстая хвоя або дуб, як печ. Як схопіць ён адною рукою дрэва, дык тое і хрусне, бы саломіна. Ідзе ён ды варочае дзераўлякі, быццам там віхор праляцеў. А ён ломіць лес, каб зрабіць метку ды ў другі раз туды не прыйсці. Доўга ён так ішоў, пакуль выйшаў на дарогу. А там паабапал дарогі ляжалі вялізазныя камяні. Пачаў ён перакідаць тое каменне на дарогу, бы картоплю. Толькі вось едуць багатыры. Пад'ехалі яны дый спыніліся, бо нельга ехаць далей, каменне замінае.

— Здароў, дзяцюк, — кажуць багатыры, — што ты робіш?

— Гуляю сабе, — кажа той хлапчук.

Багатыры злезлі з коней ды хацелі апрастаць дарогу; узяліся яны за адзін камень, але не могуць яго і крануць. Падышоў тут хлапец дый згроб тое каменне ў роў.

— Паедзем з намі, — кажуць багатыры.

— Як жа я паеду, калі ў мяне няма каня, — адказвае хлапец.

— Выбірай сабе каня з нашых.

Пайшоў хлопец выбіраць сабе каня, але толькі паложыць каню на спіну руку, дык той і падзе на пярэднія калені. Перабраў ён так усіх коней, а сабе не выбраў ніводнага. Пайшоў ён з багатырамі, тыя на конях, а ён пешкі. Толькі вось бачыць ён, што каля дарогі мужык скародзіць поле. Кабылка ў яго худая, маленькая, але жылістая. От пачаў ён таргаваць тую кабылку, але мужык не хоча яе аддаваць ні за якія грошы.

— Навошта мне грошы, — кажа ён, — яшчэ хто заб'е, а без канякі як я ўпраўлюся з гаспадаркаю. Без канякі і чалавек не чалавек.

— Памяняй сваю кабылку на каня, — кажуць багатыры, — бяры сабе на выбар, якога хочаш.

— Хто мяняе, у таго хамут гуляе, — кажа мужык.

Насілу багатыры ўламалі мужыка ды за пару самых лепшых коней выменялі хлопцу тую кабылку. Сеў ён на тую кабылку, і паехалі яны далей. Толькі вось пад'ехалі яны к той вёсцы, дзе жыў бацька хлопца, дый сталі каля кузні каваць коней. Не пазнаў каваль сына — так ён змяніўся — ды падкаваў і яго кабылку. І просіць кавальчук, каб бацька выкаваў яму булаву. Сабраў каваль усё жалеза дый выкаваў такую булаву, што ўтрох насілу яе варочаюць. Узяў кавальчук тую булаву, пакруціў яе адною рукою ды як шыбануў угору, дык яна невядома дзе і дзелася. Стаяць багатыры ды дзівяцца. Але вось па немалым часе гудзе тая булава, бы гром грыміць, ляціць уніз. Падставіў кавальчук калена. Ударылася булава аб калена ды толькі скрывілася. Прыбавіў каваль яшчэ з пуд жалеза дый выкаваў мацнейшую булаву. Падзякаваў кавальчук, узяў тую булаву і паехаў з багатырамі ў свет. Прыехалі яны к аднаму цару і наняліся на службу. Па немалым часе аб'явіўся там вельмі дужы змей і пачаў прылятаць ды цягаць к сабе людзей. Багата пахватаў ён людзей ды паеў іх. Нарэшце захацелася яму царскага мяса, вось і схапіў ён царэўну і запёр к сабе ў лёху, але не есць, а трымае на закуску. Аб'явіў цар па ўсім царстве, што дасць таму паўцарства і аддасць замуж царэўну, хто яе выбавіць ад змея, а змея заб'е. Многа парывалася сільных багатыроў біцца з тым змеем, але ўсе яны загубілі свае костачкі. Нарэшце вызваліся і тыя багатыры, што прыехалі з кавальчуком.

— Паедзем з намі, — кажуць яны кавальчуку. — Ты яшчэ малады, пара і табе шукаць славы. Паедзем, то мы цябе навучым, як біцца.

Згадзіўся кавальчук, і паехалі яны разам. Едуць яны ды едуць і пад'язджаюць, аж растанцы на дарозе, і стаіць слуп, а на ім штось напісана. Быў з іх адзін пісьменны, і пачаў ён чытаць. І прачытаў ён, што, хто паедзе направа, той дабудзе сабе славу, хто налева, знойдзе багацце, а хто проста, таго спаткае смерць. І пачалі тут багатыры выбіраць, куды хто ахвочы ехаць. Выбралі яны ўсе дарогу направа і паехалі шукаць славы; толькі адзін кавальчук кажа, што ад смерці не адперці, дык лепш ехаць проста. Як ні адгаворвалі багатыры, а кавальчук упёрся ды такі адзін паехаў проста. Праехаў ён трохі на тую самую хатку, куды яго завёз бацька бязногага. Прывязаў ён кабылку дый улез у хатку. Зірнуў ён у кут, аж там у запечку сядзіць вельмі старэнькая баба.

— Здарова была, бабка!

— Дзякуй табе, дзецючок. Куды Бог нясе? — пытае яна.

— Паеду, бабка, проста.

— Не едзь, дзетка, бо загінеш. Там змей з'есць.

— Не, бабка, паеду, хоць загіну.

— Шкада мне цябе, дзетка. Ты быў у маёй хатцы, дык ты мне быццам родны ўнук. Дык от жа слухай мяне. Што ты ні сустрэнеш на дарозе, дык не забівай, то яно табе ў дарозе ды ў бядзе паслужыць.

Падзякаваў хлопец бабе і паехаў далей. Толькі ён ад'ехаў ад хаткі, аж выскачыў заяц. Хацеў ён кінуць у яго булавою, але той кажа:

— Не бі мяне, я табе ў бядзе паслужу.

Паехаў ён далей, а заяц бяжыць за ім назіркам. Толькі вось выскачыў воўк. Ён за булаву, а воўк кажа:

— Не бі мяне, буду табе патрэбен у бядзе.

Апусціў ён булаву дый паехаў далей. Бяжыць воўк назіркам. Вось пад'ехаў ён к каменнай гары. Няма як ехаць далей. Злез ён з кабылкі, пусціў яе на пашу, а сам пайшоў шукаць дарогу. Тым часам змей вылез з лёху жыраваць ды якраз трапіў туды, дзе была кабылка. Бачыць воўк, што змей з'есць кабылку, ён як напалохаў яе, дык яна і пусцілася наўцёкі з усіх ног ды тым часам і ўцякла ад змея. Пажыраваў змей дый вярнуўся к сабе ў лёху. Вось прыбег к хлопцу заяц дый паказаў яму тую шчыліну, дзе змей зачыніў царэўну. Пагрукаў хлопец булавою ў каменную сцяну, там і паказалася царэўна дый кажа:

— Уцякай, бо змей з'есць.

А тут хлопец размахнуўся ды як трэсне булавою аб сцяну, дык яе і высадзіў. Кінулася яму царэўна на шыю ды давай прасіць, каб давёз яе к матцы ды к бацьку. Тым часам змей высунуў галаву праз шчыліну і хацеў з'есці таго хлопца. Тут хлопец схапіў булаву ды як рэзне па галаве змея, дык з яе і мазгі пацяклі. Адрэзаў ён у змея язык дый палажыў яго сабе ў кайстру. Тым часам змей высунуў другую галаву. Хлопец і тую размажджэрыў ды вырваў язык. Такім парадкам расквасіў ён змею ўсе дванаццаць галоў. Рада царэўна, што такі знайшоўся багатыр і забіў ліхога змея. Спадабаўся ёй той хлопец, і абяцала яна, што пойдзе за яго замуж, як ён завязе яе к бацьку ды к матцы. А што гэта праўда, дык яна разарвала хустачку дый дала хлопцу адну палавіну. Палажыў хлопец хустачку за пазуху і лёг спаць, бо вельмі стаміўся, пакуль забіў змея. Спіць хлопец багатырскім сном і не чуе, што бяда блізка. Тым часам тыя багатыры

пад'ехалі туды, убачылі царэўну дый пачалі яе пытаць, як тое ўсё было. Расказала яна ўсё, як было, і кажа, што пойдзе замуж за таго хлопца. Пазайздросцілі яны хлопцу, падбеглі к яму соннаму дый забілі яго. Потым пачалі яны спрачацца, каму павінна дастацца царэўна. Доўга спрачаліся яны, нарэшце, пачалі біцца, пакуль пазабівалі адзін другога. Застаўся толькі адзін самы дужы ды спрытны. Ён прымусіў царэўну, каб яна сказала бацьку ды матцы, што гэты багатыр забіў змея і выбавіў яе з няволі. Няма чаго ёй рабіць, трэба згаджацца, бо яе каханага хлопца няма ў жывых. Вось той багатыр пасадзіў царэўну на свайго каня дый павёз яе к цару. Тым часам заяц пабег да крыніцы, набраў там жывое вады ў рот, прынёс дый пырснуў хлопцу ў вочы. Ажыў той дый прахапіўся. Зірнуў ён, аж царэўны ўжо няма. Дагадаўся ён, што тут было ліха, ды ледзь не заплакаў ад жалю. Хацеў ён хутчэй бегчы к цару ды расказаць там усю праўду, дык, вядома, пешкі далёка не забяжыш хутка. Тым часам воўк пабег па лесе дый трапіў яго кабылку. Напужаў ён яе і прыгнаў туды. Сеў гэты хлопец на кабылку і паехаў хутчэй к таму цару. Прыязджае ён туды, аж там ужо ўсе рыхтуюцца к вяселлю. Пайшоў ён к цару і расказаў яму ўсю праўду. Не мае цар веры дый пытае ў дачкі. Але, вядома, тая кажа толькі тое, што ёй вялеў казаць той багатыр. Цар загадаў за паклёп павесіць таго хлопца. Тут толькі пачалі яго пытаць, хто ён такі.

— Я, — кажа, — бязногі багатыр, а больш я вам нічога не скажу.

Вось ужо вядуць таго бязногага багатыра вешаць. А тым часам царэўна пайшла ў сад гуляць. Ідзе хлопец дый бачыць, што каля плоту туляецца заяц. Ён выняў з-за пазухі тую хустачку і кінуў зайцу. Схапіў заяц хустачку і прымчаў к царэўне. Тая ледзь не абамлела.

— Чаго ты? — пытае цар.

Тут яна кінулася цару-бацьку ў ногі, расказала ўсю праўду і пачала прасіць, каб не вешалі таго хлопца, каторы збавіў яе ад змея. Цар загадаў не вешаць таго хлопца, а прывесці яго ў палац. Прыйшоў ён са сваёю кайстраю дый стаіць. Пачаў тут цар пытаць яго, як тое было. Расказаў ён усё, як было. А той багатыр кажа, што гэта няпраўда. Тады бязногі багатыр выцягнуў з кайстры змеевы языкі дый пытае:

— А гэта што?

Сумеўся той багатыр, а царэўна паказала бацьку абедзве палавінкі хустачкі. Тады ўсе паверылі. Таго ліхога багатыра павесілі, а бязногі багатыр жаніўся з царэўнаю дый завалодаў палавінаю царства. Справілі гучнае вяселле.

Я там быў і мёд піў, па барадзе цякло, а ў рот не папала.

*(Сержпутоўскі А. К. Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926. С. 47—52.)*

# *МІХАЙЛАЎ ДЗЕНЬ*

**21/8 лістапада — Міхайлаў дзень —
апошняе свята гаспадарчага года**

Восеньскія звычаі і абрады выглядалі больш сціпла, і іх менш у параўнанні з іншымі порамі года. Тлумачылася гэта тым, што заканчваліся палявыя работы. Для беларуса наступала кароткая перадышка, час падумаць пра сямейныя справы: ажаніць сына, выдаць замуж дачку, прывеціць старых маці і бацьку. Менавіта таму ў канцы лістапада ў народным календары адзначаны дзень наведвання ўнукамі сваіх дзядуль і бабуль. Дзеці заўсёды ішлі з падарункамі да іх, а вярталіся з гасцінцамі, прысмакамі. Так неназойліва выхоўвалася бацькамі павага дзяцей да дзядуль і бабуль.



## *Бабка казкі пляце чараўніцаю*

*(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў)*

**Дзяўчынка.** Дзядулі, бабулі—
Нам родныя людзі,—
Хай добра вам будзе,
Хай весела будзе!



**Хлопчык**. Хай будуць дарэчы
У гасцёўні сустрэчы.

**Дзяўчынка.** Пачнём?
**Хлопчык.** Калі ласка!

*(В. Жуковіч)*

**Настаўнік.** У беларускага народа ёсць цудоўны звычай, які занесены і ў беларускі народны каляндар. Гэта дні, калі ўнукі абавязкова павінны былі наведваць сваіх дзядуль і бабуль. Вось мы і рашылі падтрымаць традыцыю. Мы сюды запрасілі бабуль і дзядуль, бо нашы дзеткі вельмі ж хацелі, каб усе ўбачылі вас, нашы дарагія!

**Дзяўчынка** *(абдымаючы сваю бабулю).*
Прытуліцца да галавы
Сівенькай галавой,
А вочы — васільковыя,
Нібыта ў маладой.

**Хлопчык** *(дакрануўшыся да пляча бабулі).*
Спявае песні родныя,
Вядзе ў чароўны свет,
Дзе радасцю нязводнаю
Працоўны люд жыве.

**Дзяўчынка.** Вясёлая, лагодная,
Руплівая яна,
І без яе ніводнага
Я не ўяўляю дня!

*(М. Пазнякоў)*

Некалькі дзяцей выконваюць песню.

**Дзяўчынка.** Я люблю бабулю!
Летам прыязджаю,
На двары і ў хаце
Ёй дапамагаю.

Мыю я падлогу,
Кветкі паліваю
І ў гародзе з градак
Зелле вырываю.

*(Л. Рудзько)*

Дзеці выконваюць беларускі народны танец «Бульба».

**Хлопчык.** У бабулі маёй
Рукі лоўкія,
У бабулі маёй
Песні доўгія.

Разматае клубок
З новай казкаю,
Прыйдзе хітры каток,
Трэцца з ласкаю.

**Дзяўчынка**. Хоча лапкі пагрэць,
Завуркоча ён,
Ні гуляць, ні дурэць
Нам не хочацца.

Вось і дзень праляцеў,
І не спіцца нам.
Бабка казкі пляце
Чараўніцаю.

*(В. Вярба)*

Дзяўчынкі ў касцюмах кветак выконваюць «Вальс кветак».

Праводзіцца конкурс **«Хто хутчэй бабулі дапаможа»:**

*1. Прадзець нітку ў іголку і завязаць на канцы ніткі вузельчык.*

*2. Прынесці як мага хутчэй вядзерца вады і не разліць.*

*3. Сабраць яблыкі ў кошык з завязанымі вачамі.*

*4. Разблытаць бабуліны клубочкі, што коцік пераблытаў.*

**Настаўнік.** Да гэтага дня дзеці нашы вельмі старанна рыхтаваліся. Яны вам самі зрабілі падарункі.

(Дзеці ўручаюць сваім бабулям і дзядулям самаробкі-падарункі.)

**Хлопчык**. Бабуля шмат пажыла — мудрасць нажыла.

**Дзяўчынка.** Паслухаеш мудрасць бабулі — сам мудрым станеш.

**Настаўнік.** Вось якія цудоўныя прыказкі склаў пра бабуль народ. А ці заўсёды, мае дзеткі, вы слухаецеся сваіх бабуль? Ці дапамагаеце ім?

**Хлопчык.** Бабка кажа, што калісьці
І яна была малою
І не ўмела гэтаксама
Адзявацца раніцою.

**Дзяўчынка.** І касу ёй запляталі,
І вадзілі ў школу рана,
І кручкі пісала ў сшытку
Па лінеечках старанна.

**Хлопчык.** Ой, як смешна! Наша бабка,
Што і чуе вельмі слаба,
І глядзіць праз акуляры,
І бурчыць без перастанку—
У кароценькай сукеначцы
Бяжыць у школу зранку!..

**Дзяўчынка**. Ой ты, мілая бабуся,
Не крыўдуй, што я смяюся!

*(Н. Гілевіч)*

## *Маёй бабулі*

*(сцэнарый для дзіцячага садка)*

**Выхавальнік.** Добры дзень, нашы шаноўныя дзядулі і бабулі, добры дзень, дзеткі! Сёння ў нас з вамі вельмі важны дзень — дзень нашых дзядуль і бабуль.

**Дзяўчынка.** Бабкі лепшае няма,
Як мая, у цэлым свеце.
Не крычыць яна дарма,
Ласкаю прывеціць.

**Хлопчык**. Звяжа цёплыя пальчаткі
Мне пад Новы год,
А калі спячэ аладкі—
Скачуць самі ў рот!
А мая бабуля казкі
Любіць баяць-гаварыць,
Цэлы вечар будзеш слухаць,
Сон не здолее змарыць.
Безліч казак бабка знае,
Іх заўжды ахотна бае.

**Разам.** І таму шануюць дзеці
Сваіх бабак нездарма,
Бо для іх нікога ў свеце
Ласкавейшага няма.

*(А. Дзеружынскі)*

**Дзяўчынка.** Бабка ўнука калыхала,
Ціха песеньку спявала:

**Бабка** *(спявае).*
Спі, унучак, люлі-люлі,
Сон крылом цябе атуліць,
Павядзе з сабою ў гай—
Колькі хочаш там гуляй!
Там ты, унучак, падрасцеш,
А пакуль бабулю ўцеш!
*(робіць выгляд, што засынае)*

**Дзяўчынка.** Бабка пела, пела, пела,
Дый заснула, дзе сядзела.
Тут унук падняўся ўраз
І на песню склаў адказ:

**Унук спявае.** Спі, бабуля, люлі-люлі,
Сон крылом цябе атуліць,
Павядзе з сабою ў гай—
Колькі хочаш там гуляй!
Там ты, бабка, падрасцеш,
А пакуль — унука ўцеш!
Спі, бабуля, дазваляю,
Я ж пайду і пагуляю!

*(В. Стаянава)*

**Дзяўчынка.** Давайце пагуляем у народную гульню «Селезня вадзіць».

Сярод удзельнікаў гульні выбіраецца селезень (хлопчык ці дзяўчынка). Астатнія становяцца вакол селезня, утвараюць круг, ідуць карагодам і гавораць ці спяваюць:

Селязенька касаты,
Маладзец кудраваты,
Пакажы, селязенька,
Як старыя бабкі ходзяць.

«Селязенька» скача пад музыку, а дзеці паўтараюць яго рухі. Затым дзеці просяць паказаць, як старыя дзядочкі ходзяць. Трэці раз просяць паказаць, як дзеці скачуць.

**Хлопчык** *(спявае прыпеўкі).*

Мне бабуля ўсё, што мае,—
Не скупая — аддае.
Так і быць, паабяцаю
Сёння слухацца яе!

**Хлопчык**.

Нітку ў вушка працягнуць
Бабка просіць Лерку.
— А за гэта ты дасі
Смачную цукерку?

**Дзяўчынка.**

Дзед нясе прадукты з крамы,
Побач я бягу таксама.
Дзед цюльпаны палівае,
Пра цюльпаны я спяваю.

**Хлопчык.**

Рабілі мы ўсё з дзедам самі—
Памагаем добра маме.
Кажа мне чамусь матуля,
Што нічога не раблю я.

*Інсцэніроўка смяшынак.*

Унук просіць:
— Бабуля, хадзем на рэчку!
— Няма настрою.
— Тады хадзем у магазін і купім настрой.

* * *

Дзед кажа ўнуку:
— Вось ударыць мароз, пойдзем катацца на каньках.
— Я тады не пайду!
— Чаму?
— Каб мароз не ўдарыў!

Дзеці выконваюць народны танец «Весялуха».

**Хлопчык.**

У бабулі кніг нямала,
Ёсць і казак тоўсты том.
Я прашу, каб пачытала
Мне хоць крыху перад сном:
Пра бяссмертнага Кашчэя,
Пра сланоў і пра буслоў,
Бо я сам яшчэ не ўмею
Разабраць у кнізе слоў.

А калі я навучуся
І змагу пісьменным стаць,—
Я табе, мая бабуся,
Буду цэлы дзень чытаць!

*(П. Прыходзька)*

**Выхавальнік.** Але гэта будзе не так хутка. А вось падарункі-самаробкі мы нашым дзядулям і бабулям зрабілі.

*(Уручаюцца падарункі)*

А яшчэ нашы дзеткі для вас падрыхтавалі інсцэніроўку казкі «Рэпка». Паглядзіце, калі ласка.

*(Інсцэніроўка казкі)*

**Дзяўчынка.** Дзякуй вам, бабулі, што прыйшлі да нас. Зычым вам здароўя і шануем вас!

## *ІВАН МІЛАСЦІВЫ*

**25/12 лістапада — Іван Міласцівы**

Беларускі народ заўсёды вылучаўся добразычлівасцю, гасціннасцю, сардэчнасцю, міласэрнасцю. Гэтая нацыянальная рыса народа знайшла адлюстраванне ў народным календары, які складаўся стагоддзямі: 25 лістапада ў ім адзначаны як дзень Івана Міласцівага. На Палессі ў гэты дзень былі ўсе адзін да аднаго ўважлівыя, добрыя, ветлівыя, сардэчныя і нельга было ні ў якім разе каго-небудзь пакрыўдзіць.

Для дзяцей школьнага ўзросту Іван Міласцівы — гэта не толькі дзень ветлівых паводзін з дамашнімі, а хутчэй магчымасць праявіць міласэрнасць да тых, хто мае ў гэтым вялікую патрэбу.

Таму з дзецьмі напярэдадні праводзіцца гутарка аб нацыянальных асаблівасцях беларусаў, аб адлюстраванні жыцця ў народным календары. Абавязкова трэба адзначыць, што ў календары ёсць некалькі дзён, калі селянін павінен быў праяўляць асаблівую міласэрнасць, міласцівасць: на Вялікдзень, на Івана Міласцівага, Дзяды, на Каляды. Узнікненне звычаю хаджэння валачобнікаў, напрыклад, сяляне тлумачаць патрэбай дзяліцца з беднатою, жабракамі велікоднай ежай, каб і бядняк меў што паесці ў час Вялікадня. У кожнай хаце ветліва сустракалі падарожніка, жабрака, абавязкова кармілі. Вось і на Івана Міласцівага так неабходна сагрэць сваім сэрцам чыёсьці гора!

Прапануем дзецям правесці рэйды «Дапамажы мне, дружа!». У гэты дзень няблага арганізаваць дапамогу дзецям-інвалідам: канцэрт, батлейку, салодкі стол і інш.; падрыхтаваць самаробкі-падарункі дзецям, што знаходзяцца ў бальніцы. Адным словам, хай кожнае дзіця адчуе цеплыню ў душы, зрабіўшы добрую справу.

## *Падарожжа ў краіну ветлівасці*

*(сцэнарый ранішніка для дзіцячага садка)*

**Выхавальніца.** Добры дзень, дзеці!

**Юрка.** Прывітанне, сябры! Каб вы толькі ведалі, адкуль я зусім нядаўна вярнуўся! Ніколі не здагадаецеся! З краіны ветлівасці! Так! Так!

**Выхавальніца.** А як ты туды трапіў?

**Юрка** *(збянтэжана).* Ды я... Адным словам...

**Дзяўчынка.** Адным словам, здарылася гэта так: Юрка быў вялікі лянотнік. Мабыць, самы вялікі ў свеце. Бо ён ленаваўся нават у садок хадзіць. Аднойчы тата прывёз бабулю. Назаўтра прачнуўся хлопчык, а мама з татам ужо на працу пайшлі. Ён паваляўся-паваляўся трошачкі ў ложку, бачыць, а ніхто яго і не думае прасіць уставаць. Падняўся сам. А бабуля тут як тут:

— Прачнуўся, вось і добра. Зараз будзем снедаць. Толькі спачатку засцялі свой ложак.

— А я не ўмею, — прабурчаў хлопчык.

— Ну, нічога, давай тады паснедаем. Я кашу зварыла.

— Я не хачу есці! — прабурчаў Юрка.

— То мо табе бульбы падсмажыць? — спытала бабуля.

— І бульбы не хачу!

— А чаго ж ты хочаш?

— Цукерку!

— Цукеркі ў мяне няма, — сказала бабуля.

— Тады я не буду есці! — павярнуўся і пабег на вуліцу.

А на вуліцы якраз падняўся вецер. Падхапіў ён Юрку, узняў над вёскай і панёс. Хлопчык быў маленькі і лёгенькі, як пушынка. Нёс яго вецер, нёс і апусціў на лясную палянку. Сядзіць Юрка на палянцы і ад страху ні крычаць, ні плакаць не можа. А ў кустах нешта як затрашчыць! А на дрэве нехта як закрычыць! Заплакаў Юрка. Але раптам пачуў вясёлы смех. Падняў вочы, бачыць, а там зайчаняткі. І яны заўважылі Юрку, падышлі і глядзяць.

— Чаго прыйшлі?

— Добры дзень, хлопчык! — адказалі зайчаняткі. — Чаго ты плачаш?

**Юрка.** Сорамна мне, па праўдзе сказаць, стала, што я з імі не павітаўся, дый і страшна аднаму ў лесе, — вось я і папытаўся:

— А што вы тут робіце, зайчаняткі?

— Гуляем.

— А дзе вы раней былі?

— Загаралі каля градкі!

— А пасля куды прапалі?

— Мылі міскі, мылі лыжкі,

Акуратна склалі кніжкі.

— А што потым выраблялі?

— Мылі лапкі і гулялі.

А як жа ты трапіў у нашу краіну?

— Якую краіну?

— Краіну ветлівасці!

**Выхавальніца.** Дзеткі, а вы здагадаліся, чаму вецер занёс Юрку ў краіну ветлівасці? Што зрабіў Юрка няправільна? (Быў няветлівы з бабуляй, не заслаў свой ложак, не хацеў нічога есці і інш.)

**Юрка.** А як трэба сябе паводзіць у такой сітуацыі? Што я не так зрабіў? Падумаеш! Прачнуўся, паваляўся ў ложку, есці не захацеў, і ўсё!

(Дзеці папраўляюць Юрку: называюць правілы паводзін, якія трэба выконваць.)

**Выхавальнік.** А якія ветлівыя словы вы ведаеце?

*(Дзеці называюць ветлівыя словы.)*

**Дзяўчынка.** «Калі ласка», «дзякуй», «добры дзень»—
Ветлівыя словы чую ад людзей.
Я таксама буду імі даражыць:
З ветлівымі словамі лёгка жыць.

**Выхавальніца.** Малайчына! Вы ўсе, мабыць, ведаеце, што не толькі ветлівыя словы трэба ведаць ветліваму чалавеку. Ён павінен таксама быць добрым, уважлівым, слухацца бацькоў, дапамагаць ім у працы па дому.

**Юрка.** Вось і мне ў краіне ветлівасці загадалі загадкі: сказалі, што хочуць праверыць, ці дапамагаю я дома маме. Цікава, ці правільна я адказваў? Слухайце!

**Хлопчык.** Запытаю ў сыночка,
Альбо ў дачушкі,
У якога бугарочка
Аж чатыры вушкі?

**Юрка.** Я сказаў, што гэта цукерка! Праўда ж?

(Дзеці папраўляюць Юрку, бо ён адказаў няправільна. Чатыры вушкі ў падушкі.)

**Дзяўчынка.** У дзвюх матак
Па пяць хлапчанятак,
На кожнага адно імя.

(Дзеці ізноў адгадваюць: гэта пальцы — і называюць «імя» кожнага пальчыка.)

**Хлопчык.** Я аднавухая старуха.
Бо прыгаю па палатну
І нітку доўгую з-за вуха,
Як павуцінне, я пляту.

*(Іголка)*

**Юрка.** Дык вось чаму з мяне смяяліся зайчаняткі, калі я адгадваў гэтыя загадкі!

**Выхавальніца.** А вось мае дзеткі ўсе дапамагаюць маме. Малайцы! Якія ж яшчэ выпрабаванні ты прайшоў у краіне ветлівасці?

**Юрка.** Зайчаняткі гулялі са мной у гульню «Ветліва — няветліва». Давайце, зайчаняткі, мы паспрабуем пагуляць зараз!

**Адзін з зайчаняткаў.** Гэта гульня праводзіцца ў нашай краіне ветлівасці як экзамен.
Калі мы будзем гаварыць пра выпадак няветлівы, вы

пляскаеце ў далоні адзін раз, калі ж пра ветлівы, пляскаеце два разы. Хто першы будзе правільна пляскаць у далоні, той самы ветлівы.

**Зайчаняткі** *(па чарзе)*. Павітацца ўранку з мамай і татам?
— Не заправіць свой ложак?
— Падзякаваць за сняданак?
— Узяць білет у трамваі?
— Не ўступіць месца старэйшаму?
— Сказаць «добры дзень» таварышам і выхавальніцы ў садку?

**Юрка.** Вось малайцы! А мне сказалі, што я павінен наведаць урок ветлівасці ў гэтай дзіўнай краіне. Так! Так! Там ёсць школа ветлівасці. І калі я атрымаю добрую ці выдатную адзнаку на ўроку, то змагу вярнуцца. Ну, і стараўся ж я!

«Урок» праводзяць зайчаняткі па чарзе.

— Хто з іх ветлівы, акуратны, выхаваны?

Не пайду гуляць я сёння —
Мама хворая мая.
Ёй ніхто на белым свеце
Не паможа так, як я.
Клапачуся я, і мама кажа:
— Стала мне лягчэй!
Ад тваёй увагі шчырай
Я папраўлюся хутчэй.
Кожны дзень у час абеду
Наша Насця-непаседа
Круць налева,
Круць направа.
На спаднічку льецца кава.

*(Дзяўчынкі, якія чытаюць гэтыя вершы, павінны быць апрануты адпаведна: адна чысценькая, акуратная, а другая — неахайная, спаднічка заліта кавай і інш.)*

— Як называюць чалавека, пра якога Вольга Іпатава напісала гэтыя вершы?

Як ён завецца,
Гэты хлапчук?
Не хоча памыць ён
Ні шыі, ні рук.

*(мурзаты, неахайны)*

Сяброў ён не мае,
Кніжкі ірве.
А што не па ім—
Як бычок, зараве.

*(недружалюбны, плакса)*

Цукеркі і цацкі
Сабе ён грабе,
Нікога не любіць,
А толькі сябе.

*(скнара, сквапны, прагны)*

Затупае ножкай,
Вырвецца з рук.
Ці ведаеш, як той
Завецца хлапчук?

*(непаслухмяны, упарты)*

**Выхавальніца.** Каб вы толькі, дзеткі, ведалі, як наш Юрасік стараўся на гэтых уроках. Праўда, прыйшлося яму крыху і пачырванець, калі ў вершыках пазнаваў сам сябе. Многа цікавага даведаўся Юрка ў краіне ветлівасці.

**Юрка.** Я цяпер добра ведаю, як трэба сябе паводзіць. Заўсёды буду выконваць правілы паводзін ветлівых людзей!

**Зайчаняткі.** Таму, калі скончыліся ўрокі, настаўнік нашай школы ветлівасці дазволіў Юрасіку вярнуцца дадому. А заадно і нас адправіў з Юрасікам да вас, каб паглядзелі, ці няма сярод вас няветлівых дзетак.

*(Юрка і зайчаняткі развітваюцца з дзеткамі, выхавальніцай і выходзяць.)*

**Выхавальніца.** Вось такая гісторыя атрымалася з нашым Юрасікам-лянотнікам. Але хачу вам сказаць па сакрэту, што ён цяпер ніколі не забывае павітацца ранкам з дамашнімі, падзякаваць бабулі за сняданак, усміхнуцца маме, дапамагчы тату. А вы?

## Выкарыстаная літаратура


Акты, издаваемые виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. XXII. Вильня, 1895.

Беларусазнаўства: зборнікі 1—4 / *Лозка А. Ю.* і інш. Мн., 1992—1994.

Беларускія народныя казкі. 2-ое выд. дап. / Скл. *Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў.* Мн., 1986.

Восеньскія і талочныя песні / Скл. *А .С. Ліс.* Мн., 1981.

*Грынкевіч А.* Беларускі дзіцячы спеўнік. Вільня, 1925.

Дзіцячы фальклор / Скл. *Г. А. Барташэвіч.* Мн., 1972.

Загадкі / Скл. *М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі.* Мн., 1972.

*Лакотка А. І., Барыс С. В.* Сцежкамі дзядоў. Мн., 1986.

*Лозка А. Ю.* Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.

Людзей слухай, а свой розум май / Апрац. *А. Якімовіча.* Мн., 1988.

Народны тэатр / Скл. *М. А. Каладзінскі.* Мн., 1983.

Нашим дошколятам / Сост. *Л. В. Кузьмичева.* Мн., 1977.

Песні народных свят і абрадаў / Укл. *Н. С. Гілевіч.* Мн., 1974.

Прыказкі і прымаўкі, кн. I / Скл. *М. Я. Грынблат.* Мн., 1976.

*Романов Е. Р.* Белорусский сборник, вып. 4. Витебск, 1891.

*Сахута Я. М.* Беларускае народнае мастацкае кавальства. Мн., 1990.

*Сержпутоўскі А. К.* Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926.

Статут Вялікага княства Літоўскага. 1588. Мн., 1989.

Чарадзейныя казкі, ч. II / Скл. *К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч.* Мн., 1978.

*Чурко Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор. Мн., 1990.

*Шырма Р.* Беларускія народныя песні. Мн., 1959.

Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

*Якімовіч Ю. А.* Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII—XIX стст. Мн., 1978.

# ЗМЕСТ


Да зачаткаў беларускай народнай педагогікі. *Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

ВОСЕНЬСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР. *Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ, СЦЭНАРЫІ І ДАДАТКОВЫ МАТЭРЫЯЛ . . . . . 14

**Дзень Сямёна** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

«Свяці, наша свяціла!» *(сцэнарый для вучняў пачатковай школы)* . . . . . . . . . . . . . . 16

Дадатковы матэрыял. *Рэгіна Гамзовіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

Цуды. Дадатковы матэрыял. *Алесь Цітавец* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23

**Багач** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25

«На нашай ніўцы сёння дажынкі» *(сцэнарый для старэйшай групы дзіцячага садка). Святлана Лукашэвіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

«Прыйшоў Багач...» *(сцэнарый свята для вучняў пачатковых класаў). Клаўдзія Капцэвіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

**Дзяды — Дзень памінання памерлых** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

«Святыя дзяды, завём вас...» *Паліна Маляціна, Ала Маслава* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

Усе Святыя. *Клаўдзія Капцэвіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38

Памінальная вечарына ў форме сучаснай трызны *(сцэнарый для вучняў старэйшых класаў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39

Дадатковы матэрыял. *Антаніна Хатэнка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55

**Свята млынароў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58

«Круціцеся, жорны...» *(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў). Клаўдзія Капцэвіч, Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60

Дадатковы матэрыял. *Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61

**Свята кавалёў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

Па рабоце майстра знаць *(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў). Клаўдзія Капцэвіч, Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80

Дадатковы матэрыял. *Алесь Лозка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

**Міхайлаў дзень** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97

Бабка казкі пляце чараўніцаю *(сцэнарый для вучняў пачатковых класаў)* . . . . . . . . . . . 97

Маёй бабулі *(сцэнарый для дзіцячага садка). Клаўдзія Капцэвіч* . . . . . . . . . . . . . . 100

**Іван Міласцівы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104

Падарожжа ў краіну ветлівасці *(сцэнарый ранішніка для дзіцячага садка) Клаўдзія Капцэвіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105

Выкарыстаная літаратура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

**Восеньскія святы:** Дапам. для настаўнікаў і выхаваль-
В 76 нікаў / Уклад. А. Ю. Лозка; Маст. А. У. Рудая. — Мн.: Беларусь, 1995.—110 с.: іл.
ISBN 985-01-0103-2.

Дапаможнік уводзіць у навучальны і выхаваўчы працэс зачаткі беларускай народнай педагогікі. Тут змешчаны метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі, іншыя матэрыялы для вывучэння і правядзення восеньскіх святаў і прысвяткаў беларускага народнага календара.

Адрасуецца работнікам дашкольных, школьных і пазашкольных дзіцячых устаноў.

**В** $\frac{\textbf{3940200000 — 028}}{\textbf{М 301 (03) —95}}$ **18 — 94** **ББК 63.5я7**

Вучэбнае выданне

**ВОСЕНЬСКІЯ СВЯТЫ**

**Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў**

Укладальнік **Лозка** Алесь Юр'евіч

Рэдактар *Т. І. Улевіч*
Мастак *А. У. Рудая*
Мастацкі рэдактар *А. А. Жданоўская*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютэрная вёрстка *С. Л. Печанёвай*
Карэктары *Г. К. Піскунова, Л. Р. Кузьміна*
Аператары *І. Л. Жукоўская, Т. А. Касцяневіч*

Выданне падрыхтавана да друку на камп'ютэрнай сістэме выдавецтва «Беларусь»

Падп. да друку з арыгінала-макета 22.09.95. Фармат 60х90 1/16. Папера афс. № 1. Гарнітура «Таймс». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 7,0. Ум. фарб.-адб. 25,5. Ул.-выд. арк. 8,8. Тыраж 5000 экз. Зак. 641.

Ордэна Дружбы народаў выдавецтва «Беларусь» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 2. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.

